**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ**
**Кафедра гісторыі Беларусі новага і навейшага часу**

НАГДАЛЯН
Андрэй Мікалаевіч

# ДЗЕЙНАСЦЬ УСТАНОЎ ЗЕМСКАГА САМАКІРАВАННЯ МІНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў 1903-1914 ГГ.

Дыпломная работа

Навуковы кіраўнік:
доктар гістарычных навук,
прафесар А.Г. Каханоўскі

Дапушчана да абароны

«___» ____________ 2017 г.

Загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу

доктар гістарычных навук, прафесар А.Г. Каханоўскі

Мінск, 2017

# ЗМЕСТ

**Рэферат** ........ 3

**Реферат** ........ 4

**Abstract** ........ 5

**Уводзіны** ........ 6

**Глава 1. Гістарыяграфія, крыніцы і метады даследавання** ........ 9
1.1. Гістарыяграфія ........ 9
1.2. Крыніцы ........ 12
1.3. Метадалогія і метады даследавання ........ 14

**Глава 2. Перадумовы рэалізацыі земскай рэформы** ........ 16
2.1. Абмеркаванне пытання аб заходнім земстве ў 1861-1903 гг. ........ 16
2.2. Увядзенне выбарных земскіх устаноў у беларускіх губернях ........ 21

**Глава 3. Дзейнасць Упраўлення па справах земскай гаспадаркі ў 1903-1911 гг.** ........ 27
3.1. Нявыбарнае земства як мясцовы прадстаўнічы орган ........ 27
3.2. Асноўныя мерапрыемствы ў сацыяльна-культурнай і гаспадарчай сферах ........ 33

**Глава 4. Функцыянаванне выбарных земскіх органаў у 1911-1914 гг.** ........ 41
4.1. Механізм дзеяння, сацыяльны і нацыянальны склад ........ 41
4.2. Гаспадарчая дзейнасць земстваў ........ 43
4.3. Адукацыйныя мерапрыемствы ўстаноў ........ 51
4.4. Асноўныя аспекты дзейнасці ў сферы аховы здароўя ........ 57

**Заключэнне** ........ 63

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры** ........ 67

**Спіс апублікаваных навуковых работ** ........ 76

# РЭФЕРАТ

## Нагдаляна Андрэя Мікалаевіча

**Тэма:** Дзейнасць установ земскага самакіравання Мінскай губерні ў 1903-1914 гг.

**Ключавыя словы:** упраўленні па справах земскай гаспадаркі; выбарныя земствы; земскія галосныя; Мінская губерня; земская рэформа ў Беларусі.

**Актуальнасць** даследавання вынікае з наяўнасці ў Рэспубліцы Беларусь дыскусіі па пытанні аб удасканальванні сістэмы органаў мясцовага самакіравання і больш актыўным удзеле насельніцтва ў працэсе прыняцця рашэнняў на рэгіянальным узроўні. Адначасова ўсё яшчэ актуальная праблема выбару паміж далейшай унутранай цэнтралізацыяй ці дэцэнтралізацыяй і месца ў гэтым мясцовай улады. Зыходзячы з ролі земскіх установ, што яны адыгралі ў развіцці беларускіх зямель, вырашэнне дадзеных пытанняў павінна будавацца на гістарычным вопыце і традыцыях.

**Мэта дыпломнай работы:** раскрыць дзейнасць установ земскага самакіравання на тэрыторыі Мінскай губерні ў 1903-1914 гг. **Аб'ект даследавання:** дзейнасць органаў мясцовага кіравання і самакіравання павятовага і губернскага ўзроўняў на тэрыторыі Беларусі ў 1903-1914 гг. **Прадмет даследавання:** сацыяльна-эканамічная і культурная дзейнасць земскіх установ Мінскай губерні, іх узаемадзеянне з цэнтральнымі і мясцовымі органамі ўлады, грамадскімі арганізацыямі і мясцовым насельніцтвам. **Метадалагічную аснову** работы склалі прынцыпы гістарызма, аб'ектыўнасці, сістэмнасці і каштоўнасці.

**Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону.** Земская рэформа на тэрыторыі Беларусі рэалізавана паэтапна, пачынаючы ў 1903 г. і заканчваючы ў 1911 г. Пры гэтым па сваёй прыродзе ўпраўленні па справах земскай гаспадаркі з'яўляліся сапраўднымі мясцовымі прадстаўнічымі органамі. Нацыянальны прынцып фарміравання выбарных земстваў узора 1911 г. не стаў перашкодай для іх эфектыўнай дзейнасці. Функцыянаванне земскіх установ Мінскай губерні ў 1903-1914 гг. стала важнай прыступкай у развіцці інстытутаў мясцовай улады на беларускіх землях і адыграла адметную ролю ў сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці рэгіёна.

**Структура і аб'ём дыпломнай работы.** Даследаванне ўключае ў сябе ўводзіны, чатыры главы, заключэнне, спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры і спіс апублікаваных навуковых работ. Агульны аб'ём работы складае 76 старонак: з іх рэферат на беларускай, рускай і англійскай мовах – 3, спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры – 9 (134 найменні), спіс апублікаваных навуковых работ – 1 (3 найменні).

# РЕФЕРАТ
## Нагдаляна Андрея Николаевича

**Тема:** Деятельность учреждений земского самоуправления Минской губернии в 1903-1914 гг.

**Ключевые слова:** управления по делам земского хозяйства; выборные земства; земские гласные; Минская губерния; земская реформа в Беларуси.

**Актуальность** исследования следует из наличия в Республике Беларусь дискуссии по вопросу о совершенствовании системы органов местного самоуправления и более активном участии населения в процессе принятия решений на региональном уровне. Одновременно все еще актуальна проблема выбора между дальнейшей внутренней централизацией или децентрализацией и места в этом местной власти. Исходя из роли земских учреждений, что они сыграли в развитии белорусских земель, решение данных вопросов должно строиться на историческом опыте и традициях.

**Цель дипломной работы:** раскрыть деятельность учреждений земского самоуправления на территории Минской губернии в 1903-1914 гг. **Объект исследования:** деятельность органов местного управления и самоуправления уездного и губернского уровней на территории Беларуси в 1903-1914 гг. **Предмет исследования:** социально-экономическая и культурная деятельность земских учреждений Минской губернии, их взаимодействие с центральными и местными органами власти, общественными организациями и местным населением. **Методологическую основу** работы составили принципы историзма, объективности, системности и ценности.

**Основные положения, выносимые на защиту.** Земская реформа на территории Беларуси реализована поэтапно, начиная в 1903 году и заканчивая в 1911 г. При этом по своей природе управлении по делам земского хозяйства являлись настоящими местными представительными органами. Национальный принцип формирования выборных земств образца 1911 г. не стал препятствием для их эффективной деятельности. Функционирование земских учреждений Минской губернии в 1903-1914 гг. стало важным этапом в развитии институтов местной власти на белорусских землях и сыграла заметную роль в социально-экономическом и культурном развитии региона.

**Структура и объем дипломной работы.** Исследование включает в себя введение, четыре главы, заключение, список использованных источников и литературы и список опубликованных научных работ. Общий объем работы составляет 76 страниц: из них реферат на белорусском, русском и английском языках – 3, список использованных источников и литературы – 9 (134 наименования), список опубликованных научных работ – 1 (3 наименования).

# ABSTRACT
## of Andrei Nahdalian

**Theme:** Activities of the institutions of zemstvo self-government of the Minsk province in 1903-1914.

**Keywords:** local economy management institutions; elective zemstvos; zemstvo vowels; Minsk province; zemstvo reform in Belarus.

**Actuality** of the research follows from the presence in the Republic of Belarus discussion on the issue of improving the system of local governments and more active participation of the population in the decision-making process at the regional level. At the same time the problem of choice between further domestic centralization or decentralization and this places local authorities. Based on the role of zemstvo institutions that they played in the development of the Belarusian lands, these issues should be based on historical experience and traditions.

**The purpose of the thesis:** to reveal the activity of the institutions of zemstvo self-government in the territory of the Minsk province in 1903-1914. **Object of the research:** the activities of local authorities and self-government, county and provincial levels on the territory of Belarus in 1903-1914. **The subject of the research:** socio-economic and cultural activities of zemstvo institutions of Minsk province, their interaction with central and local authorities, public organizations and local people. **The methodological basis** of the work was the principles of historicism, objectivity, system and value.

**The main provisions for the thesis defense.** Zemstvo reform on the territory of Belarus was implemented in stages, beginning in 1903 and ending in 1911. The local economy management institutions were real local representative bodies. The national principle of the formation of elective zemstvos of the model of 1911 did not become an obstacle to their effective activity. Functioning zemstvo institutions of the Minsk province in 1903-1914 was an important stage in the development of local government institutions on the Belarusian lands and played a significant role in the socio-economic and cultural development of the region.

**The structure and size of the thesis.** The research consists of the introduction, four chapters, conclusion, list of a bibliography and list of published scientific works. Total size of the thesis – 76 pages. From them: an abstract in Belarusian, Russian and English - 3, the list of a bibliography – 9 (134 points), the list of published scientific works – 1 (3 points).

# УВОДЗІНЫ

Земская рэформа была праведзена ўрадавымі коламі Расійскай імперыі ў 1864 г. Адной з асаблівасцей рэформы выступіла тое, што яна не распаўсюджвалася на заходнія губерні краіны, у тым ліку і беларускія. У другой палове XIX – пачатку XX ст. беларускія землі ўяўлялі сабой адметны ў сваім развіцці рэгіён з наяўнасцю пэўных этнічна-рэлігійных асаблівасцей, менавіта якія і адыгралі вызначальную ролю ў пазбаўленні іх органаў мясцовага прадстаўніцтва на працягу амаль сарака гадоў. Стварэнне нявыбарных упраўленняў па справах земскай гаспадаркі ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях у 1903 г., а затым і рэарганізацыя іх у выбарныя земствы ў 1911 г., сталі вынікам пошуку спрыяльных шляхоў для эфектыўнага дзеяння на тэрыторыі Беларусі мясцовых органаў улады і самакіравання, своеасаблівым эксперыментам з боку ўрада. Зыходзячы з гэтага, неабходна паказаць, ці сапраўды здавальняючай формай мясцовага самакіравання былі земскія ўстановы дадзеных тыпаў і наколькі выніковай была іх дзейнасць на прыкладзе Мінскай губерні.

*Актуальнасць* даследавання ў рамках дыпломнай работы вынікае з паступовага разгортвання дыскусіі ў сучаснай Рэспубліцы Беларусь аб неабходнасці рэфармавання асобных сфер грамадскага жыцця. Адно з заўважных месцаў у гэтым працэсе займае пытанне аб удасканальванні існуючай сістэмы органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Пры гэтым па меры паскарэння тэмпаў фарміравання грамадзянскай супольнасці ў краіне, узрастае патрэба ў больш актыўным удзеле насельніцтва ў працэсе прыняцця рашэнняў, асабліва на рэгіянальным узроўні, а таксама паўстае пытанне аб эфектыўным суаднясенні выбарнасці і прызначэння пры выбудоўванні ўладнай вертыкалі. Адначасова ў краінах постсавецкай прасторы ўсё яшчэ актуальная праблема выбару паміж далейшай унутранай цэнтралізацыяй ці дэцэнтралізацыяй і належнай ролі ў гэтым мясцовага самакіравання. Зыходзячы з той важнай ролі земскіх устаноў, што яны адыгралі ў развіцці беларускіх зямель, вырашэнне акрэсленых пытанняў павінна будавацца на гістарычным вопыце і традыцыях.

Ступень распрацаванасці дадзенай тэмы ў гістарычнай навуцы знаходзіцца на невысокім узроўні. З аднаго боку, некаторыя аспекты рэалізацыі земскай рэформы на тэрыторыі Беларусі былі дэталёва разгледжаны айчыннымі вучонымі ў апошнія гады, аднак з іншага – дзейнасць земскіх органаў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях на працягу 1903-1918 гг. дагэтуль так і не стала прадметам паўнацэннага гістарычнага даследавання. Пры гэтым сапраўдны прабел беларускай гісторыі складае функцыянаванне ўпраўленняў

па справах земскай гаспадаркі, існаванне якіх у гістарыяграфіі часта наогул ігнаруецца.

*Аб'ект* даследавання – дзейнасць органаў мясцовага кіравання і самакіравання павятовага і губернскага ўзроўняў на тэрыторыі Беларусі ў 1903-1914 гг.

*Прадмет* вывучэння – сацыяльна-эканамічная і культурная дзейнасць земскіх устаноў Мінскай губерні, іх узаемадзеянне з цэнтральнымі і мясцовымі органамі ўлады, грамадскімі арганізацыямі і мясцовым насельніцтвам.

*Мэта*, якая была пастаўлена для правядзення дадзенага даследавання, наступная:

– раскрыць дзейнасць устаноў земскага самакіравання на тэрыторыі Мінскай губерні ў 1903-1914 гг.

Для дасягнення акрэсленай мэты ў працэсе напісання дыпломнай работы неабходна вырашыць наступныя *задачы*:

– прасачыць працэс абмеркавання пытання аб увядзенні земскіх устаноў у беларускіх губернях у 1860-х – 1900-х гг.

– вывучыць асноўныя аспекты функцыянавання Упраўлення па справах земскай гаспадаркі Мінскай губерні ў 1903-1911 гг.

– паказаць ролю выбарных земскіх органаў у сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці губерні ў 1911-1914 гг.

Храналагічныя рамкі даследавання бяруць свой пачатак ад фактычнага ўвядзення земскіх ўстаноў у Мінскай губерні ў адпаведнасці з Палажэннем ад 2 сакавіка 1903 г. і заканчваюцца ўступленнем Расійскай імперыі ў Першую сусветную вайну 1 жніўня 1914 г., калі земствам прыйшлося сутыкнуцца з кардынальна новымі ўмовамі свайго функцыянавання. Геаграфічна даследаванне, праведзенае ў рамках работы, ахоплівае тэрыторыю Мінскай губерні ў яе межах на пачатак ХХ ст.

Дыпломная работа складаецца з уводзінаў, чатырох глаў, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і літаратуры і спіса апублікаваных навуковых работ. Уводзіны раскрываюць абгрунтаванне і навуковую актуальнасць тэмы, ступень яе распрацаванасці, утрымліваюць у сабе аб'ект і прадмет даследавання, мэту і задачы работы, а таксама яе храналагічныя і геаграфічныя рамкі. Першая глава ўключае гістарыяграфію разглядаемага пытання, стан крыніцавай базы тэмы і ступень яе распрацаванасці, а таксама метадалогію і метады даследавання. У другой главе падаюцца асаблівасці абмеркавання пытання аб увядзенні земскага самакіравання на тэрыторыі Беларусі ў 1860-х – 1900-х гг. Трэцяя глава прысвечана раскрыццю асноўных аспектаў дзейнасці ў межах губерні Упраўлення па справах земскай гаспадаркі ў 1903-1911 гг., яго механізма дзеяння і функцый. У чацвёртай главе разглядаюцца асаблівасці правядзення выбарнымі земствамі Мінскай губерні ў 1911-1914 гг.

мерапрыемстваў па падтрымцы мясцовай гаспадаркі, а таксама іх дзеянні ў сферах аховы здароўя і адукацыі. Заключэнне падводзіць вынікі праведзенага ў рамках работы даследавання, фарміруе канчатковыя вывады па разгледжанай тэме. Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры аформлены ў адпаведнасці з алфавітным прынцыпам (134 найменні). У спісе апублікаваных навуковых работ прыводзіцца пералік публікацый студэнта, зробленых па тэме дыпломнага даследавання (3 найменні). Агульны аб’ём дыпломнай работы – 76 старонак.

# ГЛАВА 1
# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ, КРЫНІЦЫ І МЕТАДЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

## 1.1 Гістарыяграфія

У перыяд існавання Расійскай імперыі і ў далейшыя часы ўваходжання нашай краіны ў СССР, ажно да хрушчоўскай адлігі, тэма абмеркавання пытання аб увядзенні беларускага земства і яго функцыянавання ў навуковым асяроддзі не ўздымалася. Праблема рэалізацыі земскай рэформы і дзейнасці ўстаноў земскага самакіравання на тэрыторыі Беларусі знайшла сваё адлюстраванне ў работах шэрагу айчынных і замежных даследчыкаў пачынаючы толькі з 60-х гг. XX ст.

Адкрыў праблему земства для беларускай гістарычнай навукі В.П. Слабажанін – першы вучоны, які сур’ёзна заняўся вывучэннем гісторыі земскага самакіравання на Беларусі. Яго артыкул «Да гісторыі ўвядзення земства ў Беларусі (1864–1911 гг.)» [110] стаў важным крокам наперад, хоць і абсалютна не адлюстраваў дзейнасці органаў. У гэтай рабоце закранаецца выключна праблема абмеркавання пытання аб увядзенні самакіравання на беларускіх землях, а таксама функцыянальныя асаблівасці заходняга земства.

Новы этап у даследаванні разглядаемага пытання наступіў у 1990-я – 2000-я гг. На базе кандыдацкай дысертацыі выйшла манаграфія В.П. Слабажаніна «Земское самоуправление в Беларуси (1905–1917 гг.)» [111]. Дадзеная работа з’яўляецца першым і адзіным на дадзены момант фундаментальным даследаваннем па гісторыі дзейнасці земскіх устаноў на беларускіх землях. Тут вучоны спыняецца на сацыякультурным аспекце дзейнасці земстваў узора 1911 г., у тым ліку і кроках у сферы народнай асветы і аховы здароўя. Разам з тым у кнізе прыводзіцца багаты статыстычны матэрыял па выніках земскіх мерапрыемстваў, а таксама зроблена спроба параўнаць іх эфектыўнасць у межах трох беларускіх губерняў (Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай). Тым не менш, мэты сканцэнтравацца на дзейнасці упраўленняў па справах земскай гаспадаркі тут В.П. Слабажанін не ставіў.

Наступная праца, часткова звязаная з заходнеземскай тэмай, выдадзена пад аўтарствам М.М. Забаўскага, вядомага даследчыка палітычнага руху і культурнага развіцця Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. У сваёй кнізе «Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906-1917 гг.)» [21] ён прысвяціў адзін з падраздзелаў праблеме мясцовага кіравання ў заходніх губернях. Аднак вучоны, зыходзячы з тэматыкі даследавання, імкнуўся паказаць менавіта абмеркаванне будучага закона аб заходнім земстве ў Дзяржаўнай думе, астатнія ж моманты ён закрануў альбо ўскосна, альбо не закрануў увогуле.

Даследаванне асветніцкай дзейнасці выбарнага земства звязана, перш за ўсё, з іменем вучонай С.В. Снапкоўскай, вядучай спецыялісткі па гісторыі беларускай адукацыі і педагагічнай думкі. У працах аўтара [114; 115], на аснове увядзення ў абарот архіўных матэрыялаў, праводзіцца аналіз адкрыцця і фінансавання земскімі ўстановамі пачатковых школ у паветах Мінскай і Магілёўскай губерняў. Асабліва падкрэсліваецца той факт, што менавіта земствы сталі ініцыятарамі пастаноўкі пытання аб увядзенні ўсеагульнай пачатковай адукацыі, актыўна прыступіўшы да яе рэалізацыі.

У той жа час важнае месца займаюць даследаванні па культурна-асветніцкай дзейнасці земства гісторыка В.Я. Навагродскага [58; 59; 99; 100]. У сваіх працах аўтар паказаў ролю выбарных земскіх устаноў не толькі ў развіцці пачатковай адукацыі, але і ў прафесійнай падрыхтоўцы настаўніцкіх кадраў і пазашкольнай адукацыі насельніцтва. Пры гэтым даследчык таксама закранае пытанне ролі земскага друку ў народнай асвеце.

Значны прагрэс у вывучэнні праблематыкі земскіх устаноў узора 1903 і 1911 гг. назіраецца ў апошнія гады. Сучасны беларускі гісторык С.А. Талмачова у шэрагу сваіх артыкулаў, прысвечаным распаўсюджанню земскай рэформы на заходнія губерні [118–121], зрабіла ўдалую спробу апісання механізма дзеяння як нявыбарных, так і выбарных земстваў, а таксама асаблівасцей выбарчага працэсу ў павятовыя і губернскія земскія галосныя. Першай грунтоўнай работай па праблеме функцыянавання ў Беларусі ўпраўленняў па справе земскай гаспадаркай з’яўляецца артыкул А.А. Падарожняй «Стварэнне органаў кіравання мясцовай земскай гаспадаркай у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях на падставе Палажэння 1903 г.» [106]. Тут найбольш поўна паказаны функцыі, паўнамоцтвы і асаблівасці фарміравання дадзеных мадыфікаваных земскіх устаноў.

Асаблівае месца займаюць даследаванні Т.Л. Шаламіцкай па станаўленні земскага друку на беларускіх землях, вынікам якіх стала абарона ў 2016 г. кандыдацкай дысертацыі па гэтай тэматыцы [122–124]. У шэрагу артыкулаў даследчыца надзяляе ўвагу пытанням палітычнай камунікацыі на старонках перыядычных земскіх выданняў, у тым ліку і «Весніка Мінскага губернскага земства», а таксама паказвае іх ролю ў рэалізацыі асветніцкіх мерапрыемстваў земскіх органаў.

Перыяд 2014-2016 гг. адзначаецца актыўным апублікаваннем вынікаў працы па земскай праблематыцы віцебскай даследчыцы Н.С. Маторавай. У шэрагу яе артыкулаў [25–30] закрануты не толькі механізм дзеяння ўпраўленняў па справах земскай гаспадаркі, але і ўпершыню ў беларускай гістарыяграфіі паказаны рэальныя вынікі іх васьмігадовай дзейнасці. У прыватнасці, Н.С. Маторава сканцэнтравалася на ролі дадзеных устаноў у развіцці сістэмы аховы здароўя беларускіх губерняў, рэалізацыі планаў

усеагульнага пачатковага навучання, а таксама прааналізавала ініцыяваныя імі праекты адкрыцця вышэйшых навучальных установ і паказала асаблівасці ўзаемадзеяння з мясцовымі дабрачыннымі арганізацыямі.

Высокую ацэнку таксама можна даць даведнікам, падрыхтаваным і выдадзеным Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі, якія прысвечаны гісторыі дзяржаўных, рэлігійных і грамадскіх установ Віцебскай [6], Мінскай [24] і Магілёўскай [23] губерняў часоў уваходжання беларускіх зямель у Расійскую імперыю. У гэтых выданнях пададзена кароткая характарыстыка асноўных функцый распарадчых і выканаўчых органаў нявыбарных і выбарных земстваў, заснаваная на заканадаўчых крыніцах таго часу.

Сярод замежных аўтараў першым праблематыку земскіх установ на тэрыторыі Беларусі ўзняў А.Я. Аўрэх, вядомы савецкі расійскі спецыяліст у галіне палітычнай гісторыі Расіі дарэвалюцыйнага перыяду. Яго праца «Вопрос о западном земстве и банкротство Столыпина» [1], якая была апублікавана ў 1961 г., утрымлівае ў сабе спробу апісаць працэс абмеркавання шляхоў распаўсюджвання земскай рэформы на беларускія землі, але ўпор робіцца ў першую чаргу на стварэнне і разгляд у Дзяржаўнай думе і Дзяржаўным савеце праекта аб заходнім земстве, які затым быў зацверджаны ў якасці закона ад 14 сакавіка 1911 г. Аўтар не ставіў перад сабой мэты паказаць працэсы другой паловы XIX ст. Разам з тым у артыкуле маюцца недакладнасці па некаторых пытаннях. Праз пяць гадоў была выдадзена манаграфія Аўрэха «Царизм и третьеиюньская система» [3], дзе адзін з падраздзелаў быў прысвечаны праблеме заходняга земства. Тым не менш, тут мы не бачым грунтоўнага аналіза падзей, а толькі пералічэнне асноўных палажэнняў. У 1991 г. выдадзена кніга А.Я. Аўрэха «П.А.Столыпин и судьбы реформ в России» [2], у якой найбольш грунтоўна былі апісаны падзеі 1908-1911 гг., аднак папярэдняму этапу абмеркавання ніякай увагі не нададзена.

Наступнае даследаванне аб земствах на тэрыторыі Беларусі звязана з іменем савецкай вучонай-юрыста В.В. Сарокінай і яе артыкулам «Политика русского самодержавия в отношении западных земств» [116]. Засяродзіўшы сваю ўвагу на працэсе рэалізацыі земскай рэформы ў заходніх губернях (асабліва на падзеі 1860-х – 1890-х гг.), у гэтай рабоце аўтар прывяла некаторыя звесткі ў тым ліку і аб дзейнасці дадзеных установ. Пры гэтым даследчыца паспрабавала вылучыць прычыны адмаўлення расійскага ўрада ад увядзення на захадзе імперыі земскіх установ, правёўшы аналіз нацыянальнага складу землеўладальнікаў беларускіх і ўкраінскіх губерняў.

На сучасным этапе спроба характарыстыкі земскіх установ на тэрыторыі Беларусі была з боку расійскага гісторыка М.Д. Далбілава ў кнізе «Западные окраины Российской империи» [16]. Што датычыцца дадзенай работы, то тут найбольш удала для свайго часу паказаны працэс абмеркавання разнастайных

варыянтаў земскай рэформы для Заходняга краю і апісана сутнасць большасці існуючых тады праектаў.

Не пакінулі без увагі гэтую праблему і сучасныя польскія даследчыкі. У прыватнасці, П. Дамброўскі ў сваім артыкуле, прысвечаным ролі пытання аб пашырэнні земскага самакіравання ў праграме Нацыянал-дэмакратычнай партыі Польшчы на землях былога ВКЛ [126]. Яшчэ адзін польскі гісторык Д. Тарасюк у сваёй манаграфіі «Między nadzieją a niepokojem. Działalność społeczno-kulturalna i polityczna Polaków na wschodniej Białorusi w latach 1905–1918» [134] таксама закрануў у адным з раздзелаў пытанне земскай рэформы ў заходніх губернях. Тым не менш, як у першай, так і другой працы падаюцца зусім нязначныя звесткі, якія апісваюць выключна падзеі пачатку XX ст.

Такім чынам, стан гістарыяграфіі па разглядаемым пытанні знаходзіцца на дастаткова нізкім узроўні. Паўнацэнных фундаментальных навуковых даследаванняў, прысвечаных усебаковаму разгляду рэалізацыі земскай рэформы і дзейнасці органаў земскага самакіравання ў беларускіх губернях на дадзеным этапе не праведзена. Зыходзячы з гэтага, сучасных вучоных чакае велізарная карпатлівая праца па вывучэнні праблемы функцыянавання земстваў на тэрыторыі Беларусі.

## 1.2 Крыніцы

Крыніцавая база, выкарыстаная падчас напісання дыпломнай работы, уключае ў сябе: 1) заканадаўчыя акты; 2) матэрыялы перыядычнага друку; 3) статыстычныя матэрыялы; 4) справаводчую дакументацыю; 5) эпісталярныя крыніцы і 6) мемуарную літаратуру.

З ліку апублікаваных крыніц, у першую чаргу, трэба вылучыць справаздачнасць земскіх устаноў Мінскай губерні. Да іх адносяцца «Зборнікі пастаноў губернскага камітэта па справах земскай гаспадаркі» [108–109], «Журналы пасяджэнняў губернскіх земскіх сходаў» [17–19], «Даклады» [13; 14] і «Справаздачы губернскай земскай управы» [103–105], «Каштарысы расходаў і даходаў губернскіх земскіх павіннасцей» [112; 113], якія былі выдадзены ў Мінску ў 1904-1915 гг. Дадзеныя крыніцы ўтрымліваюць у сабе асноўныя рашэнні земскіх устаноў, даклады губернскіх управ, меркаванні спецыяльных камісій па пэўных праблемах, якія дазваляюць сфарміраваць агульную карціну па дзейнасці земстваў у адпаведны перыяд, зрабіць вывады аб яе мэтазгоднасці і эфектыўнасці.

Для выяўлення таго, як ацэньвалася дзейнасць земскіх органаў і мэтазгоднасць іх увядзення прадстаўнікамі ўрадавых колаў быў выкарыстаны зборнік прамоў П.А. Сталыпіна [117]. Акрамя таго, многія патрэбныя звесткі і пастановы земскіх устаноў узора 1903 і 1911 гг. знаходзяцца ў трэцім томе

зборніка дакументаў «Документы и материалы по истории Белоруссии» [15], якія паказваюць наколькі выніковай была іх работа ў межах трох беларускіх губерняў.

Шэраг заканадаўчых матэрыялаў, неабходных для правядзення дадзенага даследавання, утрымліваюць у сабе розныя часткі выданняў «Полное собрание законов Российской империи» і «Свод законов Российской империи», а менавіта земскія Палажэнні 1890 [9], 1903 [10] і 1911 гг. [102]. На іх аснове можна вызначыць дакладны механізм дзеяння земскіх устаноў, іх асноўныя функцыі, склад і падраздзяленні.

Сярод мемуарных крыніц неабходна вылучыць успаміны Э.А. Вайніловіча [8], грамадскага і палітычнага дзеяча таго часу, які працяглы час прымаў удзел у рабоце земскіх устаноў у якасці павятовага і губернскага галоснага. Дадзеная крыніца ўтрымлівае звесткі аб успрыманні новаўтвораных устаноў сярод мясцовага дваранства, а таксама асаблівасці супрацоўніцтва асоб каталіцкага і праваслаўнага веравызнання ў межах аднаго органа. Адначасова вялікае значэнне маюць мемуары мінскага губернатара В.А. Друцкога-Сакалінскага [31], які даваў самую высокую ацэнку земствам заходніх губерняў, вылучаючы іх адметнасць на фоне устаноў самакіравання іншых рэгіёнаў. Біяграфічныя звесткі дзеячаў, якія непасрэдны былі звязаны з вырашэннем земскага пытання і прапаноўвалі свае праекты заходняга земства ў канцы XIX – пачатку XX ст., добра пададзены ва ўспамінах сучасніка тых падзей В.І. Гурко, які занатаваў іх у працы «Черты и силуэты прошлого» [12].

З неапублікаваных крыніц па разглядаемай тэматыцы найбольш інфарматыўнымі з’яўляюцца справы фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі [35–57]. Сюды ўваходзяць журналы гадавых і звычайных пасяджэнняў губернскіх земскіх сходаў, даклады і справаздачы губернскіх і павятовых упраў і ведамасці земскіх каштарысаў, якія ўтрымліваюць у сабе дадзеныя па асноўных мерапрыемствах, праведзеных у жыццё ўстановамі, а таксама паказваюць праблемы, з якімі прыходзілася сутыкацца ў працэсе іх рэалізацыі. Разам з тым трэба адзначыць, як карысныя крыніцы, даклады членаў рэвізійных камісій, у адпаведнасці з якімі прасочваюцца ацэнкі вынікаў дзейнасці ўпраўленняў па справах земскай гаспадаркі і выбарных земстваў з боку ўладаў. У сваю чаргу, лісты да губернатараў, міністраў унутраных спраў ад мясцовых чыноўнікаў і пастановы аб зацвярджэнні спісаў земскіх галосных і членаў упраў паведамляюць аб асаблівасцях увядзення земстваў на беларускіх землях, раскрываюць праблему сацыяльнага і этнічна-рэлігійнага складу службовых асоб і галосных устаноў.

Тым не менш, трэба адзначыць, што многія інфарматыўныя крыніцы былі страчаны падчас Вялікай Айчыннай вайны і аднавіць некаторыя звесткі па

дзейнасці земстваў не прадстаўляецца магчымым. Перш за ўсё, гэта датычыцца матэрыялаў па Віцебскай і Магілёўскай губернях.

Нельга недаацэньваць таксама звесткі, атрыманыя з матэрыялаў перыядычнага друку пачатку XX ст. Напрыклад, беларускамоўная газета «Наша ніва» [60–98] і польскамоўная «Kurier Litewski» [127–133], што выдаваліся ў той час у Вільні, з'яўляюцца важнай крыніцай прыкладаў з дзейнасці земскіх устаноў. Аднак найбольш каштоўныя дадзеныя на старонках газет датычацца менавіта адлюстравання таго бачання вынікаў працы земстваў, якое панавала тады ў народных масах. Болей таго, зыходзячы ў першую чаргу менавіта з інфармацыі перыёдыкі становіцца магчымым паказаць не толькі станоўчыя моманты з дзейнасці, але і прыклады няўдалых крокаў земскіх органаў, аб якіх магло не быць згадак на старонках афіцыйных дакументаў. Асобным чынам патрэбна вылучыць таксама ўласна земскі друк. «Веснік Мінскага губернскага земства» [5], які пачаў выходзіць у 1914 г., асвятляў усе асноўныя аспекты земскіх мерапрыемстваў у губерні.

Такім чынам, з усяго вышэй сказанага вынікае, што крыніцавая забяспечанасць разглядаемай тэмы знаходзіцца на высокім узроўні. Шырокі масіў апублікаваных і, у першую чаргу, неапублікаваных крыніц дазваляе больш глыбока і грунтоўна даследаваць дадзеную праблему сучасным вучоным-гісторыкам і сфарміраваць паўнацэнную карціну дзейнасці ўстаноў земскага самакіравання на беларускіх землях.

## 1.3 Метадалогія і метады даследавання

У аснову правядзення даследавання аўтарам пакладзены прынцыпы гістарызма, аб'ектыўнасці, сістэмнасці і каштоўнасці. Прынцып гістарызма ў рабоце абгрунтоўвае неабходнасць вывучэння земскага самакіравання ў яго развіцці, з улікам передумоў і абставін правядзення земскай рэформы ў Беларусі. Прынцып аб'ектыўнасці праяўляецца ў безумоўнай арыентацыі на дакладныя гістарычныя факты і дазваляе разглядзець дзейнасць земскіх устаноў з розных падыходаў, улічваючы ўсе перавагі і недахопы папярэднікаў. Прынцып сістэмнасці прыводзіць да ўспрымання земства не толькі ў якасці часткі губернскага і павятовага дзяржаўнага апарата са сваім наборам узаемазвязаных падраздзяленняў, але і неадрыўнай складаючай агульнарасійскай сістэмы мясцовай улады. Прынцып каштоўнасці ў дадзеным даследаванні дазваляе ўсвядоміць практычную значнасць абранай тэмы ва ўмовах, калі сучаснае беларускае грамадства не праяўляе дастатковай актыўнасці ў вырашэнні агульназначных задач на рэгіянальным узроўні.

Метадычную базу напісання дыпломнай работы агульнанавуковыя (індуктыўны, дэдуктыўны, аналіз і сінтэз) і спецыяльна-гістарычныя метады

даследавання (гісторыка-генетычны, гісторыка-кампаратыўны і гісторыка-тыпалагічны). Гісторыка-генетычны метад быў выкарыстаны пры адлюстраванні эвалюцыі земскіх установаў Мінскай губерні, паступовага пашырэння іх функцый і змянення прынцыпаў фарміравання іх падраздзяленняў. З дапамогай гісторыка-кампаратыўнага метаду ўдалося параўнаць упраўленні па справах земскай гаспадаркі і выбарныя земскія органы Мінскай губерні як паміж сабой, так і з падобнымі ўстановамі цэнтральных губерняў Расійскай імперыі. Гісторыка-тыпалагічны метад дазволіў закрануць пытанне аб магчымасці аднясення нявыбарных і выбарных земстваў па тыпалогіі да такіх сучасных паняццяў як «мясцовае кіраванне» і «мясцовае самакіраванне».

# ГЛАВА 2
# ПЕРАДУМОВЫ РЭАЛІЗАЦЫІ ЗЕМСКАЙ РЭФОРМЫ

## 2.1 Абмеркаванне пытання аб заходнім земстве ў 1861-1903 гг.

Прашэнні аб неабходнасці стварэння на беларускіх і польскіх тэрыторыях устаноў мясцовага самакіравання з боку мясцовага дваранства мелі месца яшчэ ў 1861-1862 гг. Так, польскія дваране ў Варшаве 28 лютага 1861 г. выказалі сваё жаданне аб увядзенні легальных органаў, праз якія народ мог бы непасрэдна звяртацца к трону і паведамляць аб сваіх жаданнях і патрэбах. Акрамя таго, ў заяве адзначалася, што «сярод усіх еўрапейскіх народаў толькі польскі пазбаўлены гэтага права». Падобнае прашэнне 29 лістапада 1862 г. пададзена і з боку мінскіх дваран, якія хадайнічалі аб стварэнні на іх радзіме ўстаноў, «адпаведных духу польскага народа» [7, с. 64-65].

Першапачаткова планавалася распаўсюдзіць рэформу на ўсе губерні і вобласці расійскай дзяржавы і нейкіх довадаў супраць дадзенай акалічнасці не выказвалася. Гэта прасочваецца і ў міністэрскай тлумачальнай запісцы П.А. Валуева да апошняй рэдакцыі праекта тэксту земскага Палажэння. Згодна з ёй земскае самакіраванне планавалася ўвесці ў 44 губернях, якія кіраваліся па агульнаму палажэнню, і з ліку тых, якія кіраваліся па асобым палажэнні, у Бесарабскай вобласці. Там жа робіцца выснова, што і ўсе астатнія часткі краіны таксама павінны быць прыцягнуты да адпаведных пераўтварэнняў, але з тымі зменамі, якіх будуць патрабаваць асаблівыя ўмовы дадзеных мясцовасцей.

Тым не менш, па прычыне неспакойнага становішча ў заходніх землях ўлады не рызыкнулі пайсці на такі крок. У прыватнасці, Дзяржаўны савет прынцыпова не прыняў папярэднія заўвагі міністра ўнутраных спраў і не даў дазволу на ўвядзенне земстваў у дзевяці заходніх губернях. Тлумачылася прынясце такога рашэння іх асаблівым палітычным становішчам, а менавіта тым, што губерні непасрэдна прымыкаюць да Польшчы і часткова ахоплены паўстаннем 1863-1864 гг. [125, с. 15-16].

Цяпер думкі аб недапушчэнні тэрытарыяльнага пашырэння рэформы прытрымліваліся як лібералы, у прыватнасці, ваенны міністр Д.А. Мілюцін, які з'яўляўся перакананым прыхільнікам земства, так і кансерватары: напрыклад, П.А. Валуеў, пад кіраўніцтвам якога распрацоўвалася земская рэформа [110, с. 75]. Што ж датычыцца поглядаў на разглядаемае пытанне расійскага імператара Аляксандра ІІ, то ў жніўні 1863 г., у размове з Д.А. Мілюціным, ён заявіў, што не супраць прадстаўнічага кіравання, але толькі «не можа даць яго палякам, якія ўвесь час бунтуюць» [7, с. 69]. Усё гэта сведчыць аб тым, што вышэйшыя эшалоны ўлады таго часу, за невялікім выключэннем, былі катэгарычна супраць распаўсюджвання земскай рэформы на ненадзейныя ў іх разуменні губерні, у тым ліку і беларускія.

У той жа час можна з упэўненасцю сказаць, што ўрад не хацеў надоўга адкладваць дадзеную справу. Гэта бачна ўжо зыходзячы з Імяннога ўказа імператара Урадаўнічаму Сенату ад 1 студзеня 1864 г., дзе сказана, што ўлады імкнуцца прыцягнуць да ўдзелу ў мясцовым самакіраванні насельніцтва ўсіх губерняў і паветаў краіны ўжо ў бліжэйшы час [107]. У дадатак аб гэтым сведчыць Найвысока зацверджанае меркаванне Дзяржаўнага савета таго ж дня, дзе пазначаліся неабходныя змяненні і выпраўленні ў земскім палажэнні. У адпаведнасці з імі, міністру ўнутраных спраў давалася даручэнне аб стварэнні праекта палажэння аб увядзенні земстваў у заходніх і некаторых іншых губернях і прадстаўленне яго Дзяржсавету [101].

Законы ад 1 студзеня 1864 г. ніхто ў будучыні не адмяняў, але рэалізаваны гэтыя памкненні так і не былі. Тым не менш, праекты аб распаўсюджванні Палажэння на заходнія губерні, якія меліся ў Міністэрстве ўнутраных спраў, перыядычна станавіліся прадметам абмеркавання ў кіруючых колах. Яшчэ ў 1860-я гг. былі запрошаны меркаванні па гэтых праектах генерал-губернатараў паўночна-заходніх і паўднёва-заходніх губерняў, якія выказаліся катэгарычна супраць увядзення земстваў у заходніх губернях. Прычынай гэтаму чыноўнікі назвалі палітычную нядобранадзейнасць мясцовага пануючага саслоўя – дваранства, асноўную масу якога складалі памешчыкі каталіцкага веравызнання [116, с. 65].

Трэба адзначыць, што з канца 1860-х гг. у кіруючых колах краіны значна ўзмацнілася нядобразычлівае стаўленне да земства ў цэлым. Істотную ролю ў гэтым адыгрывала і тое, што размова ішла пра ўвядзенне Палажэння 1864 г. ва ўскраінных губернях з іншародным элементам, што было не прымальным для ўладаў. Адлюстроўваючы погляды таго часу, вядомы расійскі вучоны і публіцыст прафесар А.Д. Градоўскі пісаў з гэтай нагоды ў 1868 г.: «Калі мясцовыя арганізмы павінны задавальняць патрабаванні дзяржаўнага адзінства, то яшчэ ў большай ступені яны павінны быць здабыткам нацыянальнага адзінства. У мясцовасцях, якія не ўяўляюць такога адзінства, самакіраванне не здольнае даць здавальняючых вынікаў. Наглядным прыкладам могуць служыць заходнія ўскраіны нашай дзяржавы. Увядзенне ў гэтых мясцовасцях сапраўднага самакіравання дало б легальнае жыццё не толькі зродным нам грамадскім элементам, але і варожым для нас пачаткам. Дбанне ўрада ў такіх мясцовасцях натуральна павінна быць накіравана на падтрымку рускіх пачаткаў, а не на развіццё земскага самакіравання» [4, с. 33-34].

Безумоўна, на працягу наступных дзесяцігоддзяў урад неаднаразова вяртаўся да пытання аб самакіраванні ў заходніх губернях і ўсялякі раз ён прызнаваў іх недаспелымі для такой рэформы, так як знаходзіў, што праваслаўнае землеўладанне, якое інтэнсіўна насаджвалася з 1865 г., яшчэ

недастаткова там моцнае, а, значыць, колькасць землеўладальнікаў гэтага веравызнання недастаткова вялікая [111, с. 33-34].

Нарэшце, далейшыя змены былі вызначаны патрабаваннямі агульнага развіцця краю, які ўсё больш меў патрэбу ва ўдасканаленні сістэмы мясцовага кіравання. Адсутнасць земскіх устаноў у заходніх губернях тармазіла развіццё эканомікі, сацыяльных адносін і культуры. Кіраванне чыноўнікаў справамі мясцовай гаспадаркі суправаджалася бюракратычнымі скажэннямі, нерацыянальным выдаткаваннем грашовых сродкаў, карупцыяй. Эканамічнае развіццё Расійскай імперыі прымушала ўлады аднавіць працэс пашырэння земскага самакіравання, нягледзячы на адмоўныя адносіны бюракратыі да земскіх устаноў [110, с. 75].

Па гэтай прычыне ў другой палове 90-х г.г. XIX ст. па ініцыятыве Дзяржаўнага савета пытанне аб земстве ў заходніх губернях было вылучана ў якасці першачарговага. 22 красавіка 1896 г. Дзяржаўны савет усклаў на міністра ўнутраных спраў абавязак на працягу трох гадоў распрацаваць і ўнесці на яго разгляд меркаванні аб пераўтварэнні ўстаноў, што кіравалі ў няземскіх губернях земскай гаспадаркай [116, с. 67]. Разам з тым у 1897 г. гродзенскі губернатар Д.Н. Бацюшкоў у сваёй Усепадданейшай справаздачы за папярэдні год хадайнічаў аб неабходнасці ўвядзення земстваў ў беларускіх губернях. Аднак Імператар Мікалай II у сваёй Найвышэйшай рэзалюцыі на гэтую справаздачу пастанавіў: «Па-мойму, увядзенне земскіх устаноў у заходніх губернях нясвоечасовае» [7, с. 182]. Адсюль вынікае, што меркаванне вышэйшых колаў краіны па пытанні аб заходнім земстве і дагэтуль было неадназначным. З аднаго боку, выступалі мясцовыя кіраўнікі, якія цудоўна разумелі неабходнасць у самакіраванні, так як непасрэдна былі знаёмыя з беларускімі губернямі і іх патрэбамі, а з іншага – цэнтральныя ўлады, якія баяліся непрадказальных наступстваў такога радыкальнага, па іх меркаванні, кроку.

Далейшыя дзеянні звязаны з іменем тагачаснага міністра ўнутраных спраў І.Л. Гарамыкіна. У 1898 г. у рамках выканання ранейшага даручэння, ён прадставіў свой праект Дзяржаўнаму савету. І.Л. Гарамыкін прапаноўваў стварыць земскія ўстановы ў дзевяці заходніх губернях, а таксама ў губернях усходніх – Астраханскай, Арэнбургскай і Стаўрапольскай [12, с. 81]. Тут прадугледжвалася захаваць асноўны земскі прынцып – выбарны пачатак, хаця і са значнымі адхіленнямі ад тыпу, прынятага для іншых земскіх губерняў: адсутнічалі павятовыя земскія сходы і ўправы прызначаліся ўрадам. Аднак праекты былі адхілены, галоўным чынам, па патрабаванні міністра фінансаў С.Ю. Вітэ, які напісаў з гэтай нагоды сваю знакамітую запіску аб самадзяржаўі і земстве. Міністр палічыў неабходным адмовіцца ад гэтай ідэі «з меркаванняў вышэйшай дзяржаўнай палітыкі». У прыватнасці, Вітэ сцвярджаў, што «нават

пры такой своеасаблівай арганізацыі мясцовага самакіравання, якая праектуецца Міністэрствам унутраных спраў для заходніх губерняў, наўрад ці атрымаецца адхіліць «польскі элемент» ад удзелу ў земскіх сходах, і па-гэтаму ёсць падстава асцерагацца, што сходы гэтыя пераўтворацца ў нешта падобнае на мясцовыя соймы ці хаця б соймікі, у якіх будзе разгарацца племянная варожасць» [7, с. 180-181].

У гэты час ва ўрадавых колах стаяла пытанне не пра распаўсюджванне земскіх установ на новыя тэрыторыі, а пра максімальную бюракратызацыю земства ўвогуле і поўным падпарадкаванні яго адміністрацыі. Аднак, нягледзячы на дадзеныя абставіны, далейшае развіццё краіны патрабавала ўпарадкавання сістэмы мясцовага кіравання ва ўскраінных губернях [116, с. 68].

Далейшым крокам на шляху да заходняга земства была дзейнасць новага міністра ўнутраных спраў Д.С. Сіпягіна. Пачалося ўсё з таго, што пры разглядзе каштарысаў і раскладак на чарговае трохгоддзе (1899-1901 гг.) Дзяржаўны савет зноў звярнуў увагу на неабходнасць хутчэйшага пераўтварэння земска-гаспадарчых органаў у няземскіх губернях і 31 мая 1899 г. даручыў міністру ўнутраных спраў (тады яшчэ Гарамыкіну) гэтым заняцца. Перарвалася справа тым, што ён быў адпраўлены ў адстаўку восенню 1899 г. Замяніў Гарамыкіна на пасадзе Д.С. Сіпягін, які адразу ж пасля свайго прызначэння ў 1900 г. адазваў назад з Дзяржаўнага савета праект заходняга і ўсходняга земства свайго папярэдніка, і сумесна з Міністэрствам фінансаў узяўся за распрацоўку новага [12, с. 87].

У выніку іх працы ў 1901 г. з’явіўся Праект земскага самакіравання ў еўрапейскіх губернях Расіі, у якіх не ўведзена ў дзейнасць Палажэнне аб губернскіх і павятовых земскіх установах ад 12 чэрвеня 1890 г. [9]. Прадназначаўся ён для трынаццаці губерняў: Архангельскай, Астраханскай, Віленскай, Віцебскай, Валынскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Ковенской, Мінскай, Магілёўскай, Арэнбургскай, Падольскай і Стаўрапольскай. Царскі ўрад палічыў праект у асноўным прымальным і яму быў дадзены ход. З мэтай паскарэння зацвярджэння праекта, узамен звычайнай рассылкі на заключэнне ведамствам, ён быў абмеркаваны ў красавіку-маі 1901 г. на асобай нарадзе пры міністэрстве ўнутраных спраў і затым, без усялякіх змяненняў па асноўных пытаннях, вынесены на разгляд Дзяржаўнага савета [116, с. 68].

Паралельна ініцыятыва аб увядзенні земскіх установ у беларускіх губернях зыходзіла ад мясцовых дзеячаў. Стварэнне ўрадам 21 студзеня 1902 г. Асобай нарады аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці выклікала паўсюдны грамадскі рэзананс, які не абмінуў і беларускія землі. Праводзіліся мясцовыя нарады, якія адказвалі на пытанні праграмы, распрацаванай урадам, выказвалі свае думкі і меркаванні па многіх праблемах, выносілі прапановы. Напрыклад, прадстаўнікамі Магілёўскага губернскага камітэта сцвярджалася:

«Змяненне існуючага парадку загадваннем земскай гаспадаркай прызнаецца настолькі неабходнай, што, на думку камітэта, усе мерапрыемствы ... могуць быць прыведзены ў жыццё толькі пры ўмове ўвядзення ў Магілёўскай губерні земскай рэформы». Болей таго, Полацкі камітэт Віцебскай губерні і Чавускі павятовы камітэт Магілёўскай губерні прызналі неабходнасць правядзення земскай рэформы ў поўным аб’ёме і стварэння «ўсесаслоўнай земскай адзінкі», меншай за павет. Камітэты Мінскай губерні бачылі ў земстве «арганізацыю мясцовых грамадскіх сіл» і таксама выказаліся за земскую рэформу [121, с. 20].

У той жа час большая частка палажэнняў праекта Сіпягіна перайшла ў закон, зацверджаны 2 красавіка 1903 г. пад назвай «Палажэнне аб кіраванні земскай гаспадаркай у губернях Віленскай, Віцебскай, Валынскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Ковенскай, Мінскай, Магілёўскай і Падольскай» [10]. Дадзены закон істотна адрозніваўся ад першапачатковага праекта. Ужо з самой назвы вынікае, што сфера яго дзеяння значна вужэйшая ў параўнанні з першапачатковымі планамі. Палажэнне прадназначалася толькі для дзевяці заходніх губерняў, у той час як праект датычыўся трынаццаці. Галоўнай асаблівасцю новаўтвораных устаноў – упраўленняў па справах земскай гаспадаркі, стала адсутнасць выбарнасці: галосныя прызначаліся органамі ўлады. Пры гэтым, аднак, новыя ўстановы засяродзілі ў сабе тое ж кола абавязкаў, што і выбарныя земствы іншых губерняў.

У выніку, разглядаемы закон быў уведзены ў дзеянне ў 1903 г. у трох беларускіх губернях – Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай, а затым на працягу 1904 г. у трох украінскіх – Кіеўскай, Валынскай і Падольскай. Пытанне аб увядзенні яго ў губернях Гродзенскай, Ковенскай і Віленскай засталося нявырашаным. У двух апошніх яшчэ слабым было «рускае» землеўладанне. У Гродзенскай губерні яно складала большы працэнт, але паколькі ўсе тры губерні падпарадкоўваліся аднаму генерал-губернатарству, было вырашана не ствараць новыя ўстановы ні ў адной з іх. Тут у якасці органаў мясцовага кіравання па-ранейшаму заставаліся распарадчыя камітэты, прыказы грамадскага дагляду і часткова паліцэйскія ведамствы, якія захаваліся яшчэ з другой паловы XVIII ст. [116, с. 68-69].

Такім чынам, асноўнай перашкодай, якая стаяла ў дадзены адрэзак часу на шляху ўвядзення земстваў у заходніх губернях, была асцярога расійскага ўрада даваць тутэйшаму насельніцтву мясцовае самакіраванне з пэўнымі паўнамоцтвамі, так як гаворка ішла пра іншародныя землі, ахопленыя ў свой час паўстаннямі 1830-1831 гг. і 1863-1864 гг. Разам з тым паступова стаў відавочным правал палітыкі паўсюднага насаджвання праваслаўнага землеўладання на беларускіх землях, у выніку чаго працэнт памешчыкаў-каталікоў быў значна большы, што забяспечыла б апошнім поўную перавагу ў выпадку ўвядзення земскіх устаноў. Пры гэтым немалаважным фактарам стала

нядобразычлівае стаўленне кіруючых колаў да земства ў цэлым, якое бярэ свой пачатак як з'ява яшчэ з 60-х гг. XIX ст. Стаяла пытанне пра максімальную бюракратызацыю ўстаноў і поўнае падпарадкаванне іх адміністрацыі, ва ўмовах чаго тэрытарыяльнае пашырэнне земскай рэформы рабілася немагчымым.

## 2.2. Увядзенне выбарных земскіх устаноў у беларускіх губернях

Пачатак XX ст. характарызаваўся ўсеагульнай актывізацыяй грамадска-палітычнага жыцця ў Расійскай імперыі, якое не абмінула і земскі рух. Так, 6-9 лістапада 1904 г. у Пецярбургу быў праведзены Усеагульны земскі з'езд. Галоўныя пастанаўленні з'езда выліліся ў адзінаццаць пунктаў рэзалюцыі, у якіх крытыкаваўся бюракратычны лад краіны, які замінае працы органаў мясцовага кіравання, выказвалася патрэба ў наданні большай самастойнасці земствам, ліквідацыі саслоўнага прынцыпу ў фарміраванні земскіх сходаў і г.д. Найбольш важным для няземскіх губерняў было замацаванне ў рэзалюцыі з'езда пункта аб тым, што мясцовае самакіраванне павінна быць распаўсюджана на ўсе часткі дзяржавы [4, с. 597-601].

Пад уплывам гэтага, 12 снежня 1904 г. выйшаў указ імператара «Аб прадвызначэннях да ўдасканалення дзяржаўнага парадку». Мікалай II адзначыў патрэбу ў пераўтварэннях у розных галінах грамадскага жыцця. У пункце 2 гаварылася аб неабходнасці даць земскім і гарадскім установам магчыма шырокі ўдзел і самастойнасць у адпаведнасці з заканадаўствам і заклікаць да ўдзелу ў гэтых установах прадстаўнікоў усяго мясцовага насельніцтва. Для рэалізацыі гэтых палажэнняў адзначалася і пажаданасць стварэння дробнай земскай адзінкі.

У адпаведнасці з указам ад 12 снежня пачалася распрацоўка праектаў рэформ. Рэвалюцыйныя падзеі студзеня 1905 г. значна паскорылі гэты працэс. Прэм'ер-міністр С.Ю. Вітэ быў згодны ісці на кампраміс з грамадскімі дзеячамі. Новы старшыня Савета міністраў П.А. Сталыпін лічыў дапушчальным у пэўнай ступені пашырэнне кампетэнцыі земскіх устаноў, а таксама распаўсюджванне мясцовага самакіравання на заходнія губерні, удасканаленне земскай сістэмы. 18 лютага 1905 г. быў абвешчаны царскі рэскрыпт на імя міністра ўнутраных спраў А.Г. Булыгіна аб усталяванні Асобай нарады для распрацоўкі праекта дзяржаўных пераўтварэнняў. У гэтым рэчышчы пры Віленскім генерал-губернатары была створана камісія па пытанні аб увядзенні земскіх устаноў у Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай губернях.

27 верасня 1905 г. адбылося першае яе пасяджэнне. Камісія кіравалася распрацаванай Міністэрствам унутраных спраў праграмай. Самымі галоўнымі былі першыя два пытанні: «Ці пажадана ўвядзенне ў губернях Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай земскіх устаноў па палажэнні 17 сакавіка 1903 г., ці …

пажадана распаўсюджванне на гэтыя губерні Палажэння ад 12 чэрвеня 1890 г.? Якія змены, у адпаведнасці з асаблівасцямі Паўночна-Заходняга краю, пажадана ўнесці ў дзеючае земскае палажэнне ў выпадку распаўсюджання яго на губерні названага краю?».

Члены камісіі адзначылі, што спроба стварэння ўпраўленняў па справах земскай гаспадаркі ў 1903 г. была няўдалай і не адпавядала самой ідэі самакіравання, а губерні краю знаходзіліся пад шчыльным наглядам адміністрацыі, не знаёмай з мясцовымі асаблівасцямі. Дакладчыкі выступалі за земствы, заснаваныя на прынцыпе саслоўнага раўнапраўя, з шырокай самастойнасцю – за земствы, якія б карысталіся выканаўчай уладай і з дробнай земскай усесаслоўнай адзінкай. Адзначалася, што ні Палажэнне 1864 г., ні 1890 г., ні тым больш 1903 г. не адпавядалі тагачасным умовам развіцця губерняў. Пры гэтым гаварылася аб неабходнасці ўлічваць асаблівасці Паўночна-Заходняга краю, сярод якіх былі «племянная і веравызнавальная разнароднасць насельніцтва, існаванне некалькіх моў, розніца ў звычаях і культуры нараўне з індывідуальным сялянскім землеўладаннем».

Камісія ў выніку прыйшла да высновы аб немагчымасці ўвядзення ў губернях Віленскай, Ковенскай і Гродзенскай земскага Палажэння 1903 г., прызнала непажаданым і ўвядзенне Палажэння 1890 г. без змяненняў, палічыла неабходным больш хуткае ўвядзенне ў названых губернях земскіх устаноў у адпаведнасці з «мясцовымі асаблівасцямі краю». Такім чынам, прапановы камісіі аб земскай рэформе ў заходніх губернях істотна адрозніваліся ад Палажэння 1890 г., на падставе якога дзейнічалі земствы ва ўнутраных губернях.

Увогуле, камісія стаяла на пазіцыях абароны гаспадарчых інтарэсаў усяго насельніцтва, якое пражывала на тэрыторыі Заходняга краю, незалежна ад саслоўя і веравызнання. На пасяджэннях абмяркоўвалася і ўсталяванне памераў маёмаснага цэнзу для выбараў у земства і межы паўнамоцтваў земстваў у гаспадарча-эканамічным уладкаванні школьнай, медыцынскай, ветэрынарнай, харчовай спраў, магчымасць прадстаўлення ў земстве яўрэяў і хрысціянскіх святароў і г.д. Аднак меркаванні, якія выказвалі члены камісіі, не адпавядалі ўрадавым уяўленням аб земстве. Акрамя таго, такі апазіцыйны настрой дваранства заходніх губерняў яшчэ раз пераканаў уладу ў адтэрміноўцы правядзення земскай рэформы ў краі [121, с. 21-22].

У такіх умовах, далейшая ініцыятыва пачала зыходзіць з боку ўладаў. У 1906 г. ва ўрадавых колах узнікла ідэя ўвесці выбарнае земства ў беларускіх і украінскіх губернях на падставе 87-га артыкула Асноўных дзяржаўных законаў. Быў распрацаваны новы законапраект, але рэалізацыя яго так і не здзейснілася [1, с. 65].

Пасля заканчэння рэвалюцыі 1905-1907 гг., калі земства адышло ад ліберальных традыцый, расслаілася на кансерватыўна-манархічнае і ліберальна-дэмакратычнае крыло, і з апоры ўрадавай апазіцыі пераўтварыўся ў апору кансерватараў, пасля гэтай метамарфозы земстваў узнікла рэальная магчымасць аднавіць працэс распаўсюджвання земскіх устаноў на перыферыйныя раёны імперыі. Аднак і пасля змены палітычнай арыентацыі земстваў пытанне аб павелічэнні жыццёвай прасторы самакіравання заставалася праблематычным.

Сур'ёзнай перашкодай для вырашэння гэтага пытання была канцэнтрацыя буйнога землеўладання ў руках памешчыкаў-каталікоў. Праваслаўныя ж памешчыкі на беларускіх землях складалі нязначны працэнт і большая частка іх не вяла самастойнай гаспадаркі, альбо здаючы свае землі ў арэнду, альбо спекулюючы імі, у сувязі з чым С.Ю. Вітэ называў такіх памешчыкаў «землеўладальнікамі-гастралёрамі» [111, с. 34-35].

Так ці інакш, у гэты час адным з галоўных сродкаў барацьбы з рэвалюцыйным рухам урад выбраў наступ на «іншародцаў» і «іншаверцаў», у заходніх губернях – на палякаў, каталікоў і яўрэяў. За падобную палітыку выступалі чарнасоценныя з'езды памешчыкаў, правая прэса, якія патрабавалі ўзмацнення барацьбы з «сепаратызмам» у Заходнім краі. Яны выстаўлялі ідэю аб стварэнні ў заходніх губернях земстваў, якія выбіраліся б «нацыянальнымі» курыямі, пры ўмове забеспячэння перавагі «рускай» курыі [22, с. 114-115]. Так, 2 мая 1908 г. Дзяржаўная дума прыняла сумесную формулу акцябрыстаў і ўмерана-правых, якая прапаноўвала ўраду падумаць аб увядзенні земства ў дзевяці заходніх губернях. Затым 12 чэрвеня таго ж года была ўнесена амаль аналагічная формула фінансавай камісіі. Гэтыя пажаданні ішлі насуперак планам ўрада, які не збіраўся ў бліжэйшыя гады ўводзіць земства ў Заходнім краі [1, с. 65]. Такім чынам, у паслярэвалюцыйны перыяд мы назіраем выступленне за больш шырокае распаўсюджванне земскай рэформы з боку найбольш радыкальных правых палітычных сіл, а не выключна ад мясцовых прадстаўнікоў, як гэта было раней.

Як ужо адзначалася вышэй, у саміх урадавых колах у той час яшчэ не было дакладнага плану па тэрытарыяльнаму пашырэнню земстваў. Адзначым, што ў маі 1909 г. тагачасны старшыня Савета міністраў П.А. Сталыпін нават выказаўся, што вызначыць хаця б прыкладны тэрмін увядзення заходняга земства не з'яўляецца магчымым [111, с. 34-35].

Адначасова ў красавіку 1909 г. група правых членаў Дзяржаўнага савета ў колькасці 33 чалавек унесла заканадаўчае меркаванне аб змяненні выбарчага закона па выбарах у Дзяржсавет ад дзевяці заходніх губерняў. Справа ў тым, што ў няземскіх губернях выбары членаў гэтага органа, па аднаму ад кожнай губерні, ажыццяўляліся губернскім з'ездам землеўладальнікаў, якія валодалі

неабходным зямельным цэнзам. Паколькі гэты цэнз быў дастаткова высокім, а буйное землеўладанне ў дзевяці губернях, як вядома, было засяроджана ў руках зямельных магнатаў каталіцкага веравызнання, усе дзевяць членаў Дзяржаўнага савета абіраліся з іх шэрагаў [1, с. 65-66].

Спосабам вырашэння дадзенага пытання з’яўлялася ўвядзенне земства ў Заходнім краі, бо ў такім выпадку члены Дзяржаўнага савета павінны былі выбірацца не на з’ездах землеўладальнікаў, дзе польскія памешчыкі мелі абсалютную большасць, а ад земскіх сходаў. Менавіта такі парадак абрання ў Дзяржсавет быў устаноўлены для земскіх губерняў Расійскай імперыі. Да «законапраекта 33-х» неадкладна далучыўся старшыня Савета міністраў П.А. Сталыпін. Ён заявіў, што ўрад бярэ на сябе ўнясенне законапраекта аб пашырэнні існуючага земскага Палажэння на дзевяць заходніх губерняў, з некаторымі зmяненнямі ў спосабах выбару галосных, у адпаведнасці з мясцовымі ўмовамі [110, с. 77-78].

Такім чынам, у 1909 г. урад зноў прыступіў да распрацоўкі праекта заходняга земства, як атрымаў назву «Аб выкарыстанні Палажэння аб земскіх установах ад 12 чэрвеня 1890 г. да губерняў Віцебскай, Валынскай, Кіеўскай, Мінскай, Магілёўскай, Падольскай». Затым у Савеце па справах мясцовай гаспадаркі Міністэрства ўнутраных спраў была створана нарада для абмеркавання праекта закона, пасяджэнні якой праходзілі 6-14 кастрычніка 1909 г. На агульным пасяджэнні П.А. Сталыпін падкрэсліваў: «Земскія ўстановы – установы не палітычныя, а гаспадарчыя; правільнасць і паспяховасць іх дзеянняў абумоўлена ўдзелам у іх усіх элементаў насельніцтва, зацікаўленых у правільным эканамічным жыцці краю… Гаспадарчыя інтарэсы больш глыбока пранікаюць у народ, чым нават палітычныя…». Складанасць праблемы, на думку міністэрства, заключалася ў небяспецы «прадастаўлення вольнага спаборніцтва народнасці рускай і народнасцей іншых, дзе першая пераважае па колькасці, а іншыя эканамічна». П.А. Сталыпін прасіў членаў Савета ўнесці ў праект «мінімальныя патрабаванні» для забеспячэння перавагі рускай улады [121, с. 22].

У выніку, быў распрацаваны новы законапраект аб заходнім земстве. Першая яго асаблівасць – ён не ўводзіў земствы ў трох паўночна-заходніх губернях – Віленскай, Ковенскай  і Гродзенскай. Прычынай таму было тое, што ў першых двух губернях «рускае» землеўладанне пры праверцы аказалася настолькі слабым, што ніякія хітрыкі ў законе не змаглі б забяспечыць яму дамінуючую ролю. У Гродзенскай губерні дадзенай мэты дасягнуць можна было, але гэтым прыйшлося  ахвяраваць з-за таго, што яна належала да таго ж генерал-губернатарства, што і Віленская і Ковенская губерні. Мець жа ў адной адміністрацыйнай адзінцы па-рознаму ўладкаваныя ў адносінах мясцовай гаспадаркі губерні лічылася нязручным. На астатнія шэсць заходніх губерняў

Палажэнне 12 чэрвеня 1890 г., адпаведна законапраекту, распаўсюджвалася са змяненнямі і дапаўненнямі [1, с. 69].

Ужо ў маі 1910 г. законапраект быў прадстаўлены на разгляд Дзяржаўнай думы. Думская камісія па мясцовым самакіраванні прыняла шэраг паправак, якія роўным лікам нічога не змянялі па сутнасці законапраекта, але тым не менш выклікалі шумныя пратэсты крайніх правых як у камісіі, так і пры пленарным абмеркаванні. У выніку законапраект быў прыняты 29 мая 1910 г. большасцю галасоў. Аднак, нягледзячы на хуткія тэмпы, тэрмін увядзення земства ў заходніх губернях у законапраекце прыйшлося перанесці на год: Дзяржаўны савет ужо не паспяваў прыняць яго да 1 ліпеня, то бок да тэрміну выбараў у Дзяржаўны савет [2, с. 162, 167-168].

Так ці інакш, законапраект паступіў у Дзяржаўны савет, у якім старшыня Савета міністраў не чакаў сур'ёзнага працідзеяння. Адбылося, аднак, нечаканае. Большасць Дзяржаўнага савета, баючыся, што земства ў заходніх губернях апынецца не памешчыцкім, а «мужыцкім», выступіла з рэзкай крытыкай урадавага законапраекта. П.А. Сталыпін спадзяваўся пазбегнуць правалу сваёй палітыкі, абапіраючыся не на ўсю сялянскую масу – патрыярхальнае сялянства, – а на «моцнага мужыка» ў вёсцы, у земстве ў прыватнасці. Такая палітыка не выклікала аптымізму ў большасці Дзяржаўнага савета, бо ў асобе заможнага селяніна яны бачылі канкурэнта памешчыка, замах на дваранскую манаполію ў земстве. «Сёння ставяцца на карту кансерватыўныя манархічныя асновы земства – праўда, у шасці губернях, але не трэба быць прарокам, каб прадказаць, што ў гэту гульню будзе ўцягнута ўсё расійскае земства…», – заявіў лідар правых у Дзяржаўным савеце В.Ф. Трэпаў. Не бачачы рэальнай магчымасці абаперціся на буйных зямельных уласнікаў з ліку асоб праваслаўнага веравызнання ў заходніх губернях, не верачы ў лаяльнасць сялянства наогул, большасць у Дзяржаўным савеце адхіліла законапраект урада [110, с. 78].

П.А. Сталыпін, пагражаючы адстаўкай імператару Мікалаю II, дабіўся роспуска Дзяржаўнага савета і Дзяржаўнай думы на тры дні і правёў законапраект аб заходнім земстве ў надзвычайным парадку, у адпаведнасці з артыкулам 87 Асноўных законаў. Ужыванне старшынёй Савета міністраў надзвычайнага парадку прыняцця закона аб заходнім земстве вызвала востры ўнутрыпалітычны крызіс: старшыня Дзяржаўнай думы А.І. Гучкоў падаў у адстаўку ў знак пратэсту супраць незаконных дзеянняў урада. Абедзве заканадаўчыя палаты ў першы ж дзень аднаўлення сваёй працы пасля трохдзённага перапынку (12-15 сакавіка 1911 г.) падалі запыт ураду па прычыне парушэння Асноўных законаў і, нягледзячы на тлумачэнні П.А. Сталыпіна, большасцю галасоў прызналі гэтыя тлумачэнні нездавальняючымі [111, с. 37-38]. Разам з тым 14 сакавіка 1911 г. быў прыняты ўказ аб

распаўсюджванні дзеяння Палажэння аб земскіх установах на Віцебскую, Валынскую, Кіеўскую, Мінскую, Магілёўскую і Падольскую губерні [102]. Заходнія беларускія землі на дадзеным этапе так і засталіся на старой сістэме кіравання.

Такім чынам, паўнацэнная рэалізацыя земскай рэформы ў трох беларускіх губернях стала магчымай дзякуючы ўсеагульнай актывізацыі грамадска-палітычнага жыцця ў Расійскай імперыі на працягу першага дзесяцігоддзя XX ст. З аднаго боку, назіраўся яшчэ больш актыўны рух за заходняе земства сярод найбольш прагрэсіўных мясцовых прадстаўнікоў, ды і сярод буйных земскіх дзеячаў па краіне ў цэлым. Болей таго, цяпер на ўвядзенні земстваў у заходніх губернях настойвалі найбольш радыкальныя правыя сілы краіны. Яны зыходзілі з мэтаў барацьбы з рэвалюцыйным рухам і наступу на іншародныя элементы на беларускіх і ўкраінскіх землях. Менавіта манархісты вылучылі ідэю аб падзеле выбаршчыкаў земскіх галосных на нацыянальныя курыі. У той жа час асаблівыя задачы ставіў і буйнейшы палітычны дзеяч таго часу П.А. Сталыпін, які хацеў увесці земствы ў заходніх губернях у рамках рэалізацыі сваёй аграрнай рэформы. Дзякуючы высілкам менавіта тагачаснага старшыні Савета міністраў і быў прыняты ў рэшце рэшт закон ад 14 сакавіка 1911 г., які коштам свайго ўласнага аўтарытэта палітыку ўсё ж такі ўдалося зацвердзіць.

# ГЛАВА 3
# ДЗЕЙНАСЦЬ УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ ЗЕМСКАЙ ГАСПАДАРКІ Ў 1903-1911 ГГ.

## 3.1 Нявыбарнае земства як мясцовы прадстаўнічы орган

Першыя спробы ацэнкі дзейнасці ўпраўленняў у трох беларускіх губернях рабіліся яшчэ ў час іх функцыянавання ў рамках перыядычных выданняў. Пры гэтым большасць існуючых ацэнак устаноў носяць негатыўны характар, агулам адзначаецца іх нізкая эфектыўнасць і непрэстыжнасць. Падобныя меркаванні нават выліліся ў своеасаблівыя назвы разглядаемага нявыбарнага земства ў перыёдыцы і літаратуры, такія як «маргарынавае» [1, с. 65], «спрошчанае» [69, с. 444], «чыноўніцкае» [65, с. 6], «куртатае» [72, с. 262], «часовае» [109, с. 5], «паў-земства» [129, s. 2], «сухотнае» і «нібы-земства» [132, s. 1].

Першым з даследчыкаў, хто ахарактарызаваў земскія ўстановы, створаныя па Палажэнні 2 красавіка 1903 г., стаў савецкі гісторык А.Я. Аўрэх: «Гэты інстытут аказаўся настолькі нездавальняючым, што нават у бюракратычных колах атрымаў назву «маргарынавага земства» [1, с. 65]. Ніякай спасылкі, аднак, на такую катэгарычную выснову аўтар у сваім артыкуле не прывёў. Падхапілі і развілі гэтае меркаванне і наступныя пакаленні вучоных. Так, В.В. Сарокіна ў сваім артыкуле, прысвечаным пытанню аб заходнім земстве [116, с. 67], а таксама аўтар фундаментальнай манаграфіі па гісторыі земскага самакіравання на Беларусі В.П. Слабажанін [111, с. 32], у адным рэчышчы адзначылі, што ўпраўленні былі «сапраўднай карыкатурай» на земскія ўстановы іншых губерняў Расійскай імперыі. Падобная характарыстыка даецца і ў даследаваннях такіх польскіх даследчыкаў, як П. Дамброўскі [126, с. 117] і Д. Тарасюк [134, с. 166].

Аднак найбольш прыкметнымі і важнымі з’яўляюцца ацэнкі дзейнасці ўстаноў з боку сучаснікаў. Так, П.А. Сталыпін у сваёй прамове перад Дзяржаўным саветам ад 1 лютага 1911 г. заяўляў, што закон ад 2 красавіка 1903 г. стаў вялікім крокам наперад, у параўнанні з папярэднімі губернскімі распарадчымі камітэтамі. У той жа час старшыня ўрада, падкрэсліваючы адсутнасць выбарнасці ў іх, заключыў: «Цяжка даказваць, што асобы, якія прызначаны для таго, каб адстойваць мясцовыя інтарэсы, будуць рабіць гэта лепш, чым асобы, упаўнаважаныя на гэта мясцовым насельніцтвам». У якасці яшчэ аднаго значнага мінуса ён адзначыў зацвярджэнне велізарнай колькасці каштарысаў, а таксама адсутнасць павятовых земскіх каштарысаў. Вынікам жа гэтага нібыта служыла тое, што павятовыя земскія сходы зацікаўлены толькі ў адным: як можна больш атрымаць асігнаванняў на свой павет, а значыць зрасходаваць як мага больш земскіх грошай [117, с. 326]. Тым не менш, цяжка

сказаць, ці да канца шчырым быў у сваіх словах Сталыпін, так як непасрэднай мэтай гэтай прамовы было ўздзеянне на членаў Дзяржаўнага савета, каб падштурхнуць іх да прыняцця станоўчага рашэння па зацвярджэнні новага земскага закона для заходніх губерняў.

Негатыўна вынікі дзейнасці дадзеных земскіх устаноў адзначылі ў 1905 г. на пасяджэннях камісіі пры віленскім генерал-губернатары, якая займалася пытаннямі магчымага ўвядзення земстваў у Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях. Напрыклад, удзельнік пасяджэння граф Г.І. Дорэр тады назваў упраўленні па справах земскай гаспадаркі «тыповым узорам бюракратычнай установы, зборам чыноўнікаў, апранутых у адзенне земцаў» [119, с. 21].

Вядомы грамадскі дзеяч Э.А. Вайніловіч у сваіх успамінах таксама надаваў увагу нявыбарным земскім установам, так як сам прымаў удзел у рабоце мінскага губернскага і слуцкага павятовага камітэтаў у 1903-1905 гг. Ён адзначаў, што нельга назваць гэты паступовы пераход да выбарнага земства дарэмным, так як дазвол на ўдзел насельніцтва ў эканамічным і культурным жыцці краю стаў пазітыўнай з’явай. Разам з тым Вайніловіч раскрытыкаваў празмерную растрату земскага капіталу, якая ў выніку «не значна адбілася на дабрабыце краю». Самі ж упраўленні ён назваў «земска-бюракратычнымі ўстановамі» [8, с. 115-116].

Вялікая колькасць ацэнак у свой час дадзена карэспандэнтамі газеты «Наша ніва». Напрыклад, закранацася пытанне аб земскіх падатках і недасканаласці падатковай сістэмы ў цэлым. У 1907 г. на старонках газеты адзначалася, што па прычыне адсутнасці ў беларускіх губернях выбарных земстваў сяляне плацяць у два разы больш зямельных падаткаў, а прызначаныя ў земства чыноўнікі былі зусім не знаёмыя з зямельнымі справамі краю. Звярталася ўвага таксама на мінусы падводнай павіннасці, якая ўскладвалася выключна на сялян і мяшчан, у той час як ў земскіх губернях за гэта плацілі ў тым ліку і дваране [60, с. 2]. Падвяргалася крытыцы і сістэма аховы здароўя, а менавіта валасная фельчарская сістэма ў Мінскай губерні [68, с. 404]. Паралельна адзначалася адсутнасць падтрымкі ўласна беларускай культуры з боку ўстаноў, так як ва Украіне ў гэты час земствы падтрымлівалі ўкраінскую нацыянальную справу, друкуючы газеты і кнігі на ўкраінскай мове [78, с. 274]. Тым не менш, даваліся часам цалкам станоўчыя характарыстыкі: «Маладыя можа не будуць ужо такія цёмныя і забітыя, бо як ўвялі ў Мінскай губерні земства, хоць і чыноўніцкае, але ўсё ж такі земства дае грошы на школы; скрозь збудаваны вялікія дамы для школ, – так што ўсе дзеці вучацца» [65, с. 6].

Такім чынам, галоўным аргументам негатыўных ацэнак з’яўляецца меркаванне аб непаўнацэннасці ўстаноў, якая заключалася ва ўрэзаных

паўнамоцтвах, забюракратызаванасці працэсу іх дзейнасці і адсутнасці выбарных галосных. Аднак існуе неабходнасць удакладніць, наколькі прыведзеныя вышэй меркаванні з’яўляюцца справядлівымі.

У першую чаргу, патрэбна спыніцца на паўнамоцтвах упраўленняў. У іх агульную кампетэнцыю ўваходзіла: 1) кіраванне мясцовымі земскімі грашовымі і натуральнымі павіннасцямі; 2) кіраванне капіталамі і іншымі даверанымі ім маёмасцямі; 3) ліквідацыя недахопу харчовых сродкаў і аказанне дапамогі маючаму патрэбу ў прадуктах харчавання насельніцтву; 4) утрыманне ў спраўнасці дарог, дарожных збудаванняў і берагавых палос; уладкаванне і ўтрыманне прыстаней па-за гарадскімі пасяленнямі, а таксама паляпшэнне мясцовых шляхоў зносін; 5) утрыманне і ўладкаванне земскай пошты, а таксама, у выпадку патрэбы, удзел у расходах па ўсталяванню перасылкі паштовай карэспандэнцыі па-за паштовымі трактамі і садзейнічанне развіццю тэлеграфных і тэлефонных зносін; 6) кіраванне ўзаемным губернскім страхаваннем маёмасці; 7) уладкаванне і ўтрыманне ўрачэбнай часці ў паветах; апека аб паляпшэнні ў паветах санітарных умоў і аб прадухіленні і папярэджанні эпідэмічных захворванняў; кіраванне лячэбнымі, дабрачыннымі і іншымі падобнымі ўстановамі, што ўтрымліваюцца за кошт земскіх збораў; апека аб даглядзе бедных, невылечна хворых і вар’ятаў, а таксама сіратлівых і знявечаных; 8) уладкаванне і ўтрыманне ветэрынарнай часці ў паветах; кіраванне мерамі па прадухіленні і спыненні заразных і павальных хвароб у мясцовай жывёлы, а таксама абясшкоджванню сырых жывёльных прадуктаў пры іх апрацоўцы; 9) справы па папярэджанню і тушэнню пажараў і апека аб лепшым уладкаванні паселішчаў; 10) апека аб развіцці пачатковай і прафесійнай народнай адукацыі і ўдзел ў кіраванні вучэбнымі ўстановамі, што ўтрымліваюцца за кошт земскіх збораў, а менавіта: пачатковымі школамі ведамства міністэрства народнай асветы, царкоўна-прыхадскімі вучылішчамі, школамі граматы і прафесійнымі вучылішчамі; 11) дапамога мясцовай сельскай гаспадарцы, гандлю і прамысловасці; клопат аб ахове палёў, лугоў і лясоў ад псавання і вынішчэння шкоднымі насякомымі і жывёламі, а таксама барацьба з драпежнымі жывёламі; 12) задавальненне ўскладзеных ва ўстаноўленым парадку на земскія зборы патрэб воінскага і грамадзянскага кіравання [10, с. 338-339].

Дадзены артыкул Палажэння 1903 г. практычна цалкам паўтараў тэкст артыкула 2 Палажэння аб губернскіх і павятовых земскіх установах 1890 г., якое дзейнічала ў цэнтральных губернях Расіі, але з невялікай розніцай. У Палажэнні 1890 г. не ўдакладнялася, якія менавіта навучальныя ўстановы маглі атрымліваць матэрыяльную дапамогу ад земстваў. Адпаведны пункт меў больш агульную фармуліроўку: «апеку аб развіцці сродкаў народнай адукацыі і ўстаноўлены законам удзел у кіраванні школамі і іншымі навучальнымі

ўстановамі, што ўтрымліваюцца за кошт земства» [29, с. 57]. Такім чынам, з’яўляецца відавочным, што паўнамоцтвы ўпраўленняў па справах земскай гаспадаркі цалкам тыя ж, што і ў земстваў цэнтральных губерняў Расійскай імперыі ў той час.

Спыняючыся на структуры нявыбарных земстваў, патрэбна адзначыць, што дадзеныя ўстановы, як і іншыя земствы, уключалі ў сябе два ўзроўні: распарадчы і выканаўчы. Першы быў прадстаўлены губернскімі і павятовымі камітэтамі па справах земскай гаспадаркі, якія выконвалі свае функцыі ў адпаведных адміністрацыйных адзінках. Што датычыцца складу губернскага камітэта, то сюды ўваходзілі: 1) губернатар (старшыня камітэта); 2) губернскі маршалак дваранства; 3) віцэ-губернатар; 4) старшыня казённай палаты; 5) кіраўнік упраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцей; 6) прадстаўнік удзельнага ведамства; 7) павятовыя прадвадзіцелі дваранства; 8) член губернскай па гарадскіх справам прысутнасці; 9) члены губернскай прысутнасці (альбо губернскай па сялянскіх справах прысутнасці); 10) старшыні і члены губернскай управы па справах земскага кіравання; 11) гарадскі глава губернскага горада; 12) па два земскіх галосных ад кожнага павета (у выпадку патрэбы, іх колькасць можна было павялічыць да пяці). У дадатак, у якасці галосных з правам дарадчага голас маглі ўваходзіць увогуле ўсе асобы, удзел якіх быў патрэбным.

Склад распарадчых органаў на ўзроўні паветаў – павятовых камітэтаў, быў наступны: 1) павятовы маршалак дваранства (старшыня); 2) усе земскія начальнікі і падатныя інспектары павета; 3) павятовы спраўнік; 4) мясцовы прадстаўнік ведамства дзяржаўных маёмасцей; 5) прадстаўнік удзельнага ведамства (у месцах, дзе меліся ўдзельныя землі); 6) інжынер па дарожнай частцы; 7) гарадскі глава губернскага ці павятовага горада (альбо стараста павятовага горада); 8) земскія галосныя ад павета; 9) члены павятовай управы па справах земскай гаспадаркі; 10) валасныя старшыні ад павета (ад двух да пяці, па прызначэнні губернатара). Галоснымі з правам дарадчага голасу маглі быць любыя асобы, запрашэнне якіх палічыць патрэбным старшыня павятовага камітэта.

У сваю чаргу, выканаўчымі органамі ўпраўленняў сталі губернскія і павятовыя ўправы па справах земскай гаспадаркі. Губернская ўправа складалася са старшыні і трох членаў, аднак колькасць апошніх магла быць павялічана да пяці пры адпаведным хадайніцтве ўправы. Старшыня і члены ўправы прызначаліся міністрам унутраных спраў з ліку асоб, што знаходзіліся на дзяржаўнай службе ў межах губерні і былі блізка знаёмыя з мясцовымі ўмовамі па сваёй папярэдняй службовай дзейнасці ў губерні. Пры губернскай управе стваралася канцылярыя, што складалася з неабходнай для яе функцыянавання колькасці пісараў і рахункаводаў пад кіраўніцтвам сакратара.

Кандыдатура апошняга зацвярджалася губернатарам па прапанове ўправы, а служачыя прызначаліся і звальняліся старшынёй.

Ніжэйшы ўзровень выканаўчай улады ўпраўленняў – павятовыя ўправы, фарміраваліся з: 1) павятовага прадвадзіцеля дваранства; 2) павятовага спраўніка; 3) аднаго з падатных інспектараў павета; 4) двух земскіх галосных ад павета, якія прызначаліся губернскім камітэтам і ў яго ўваходзілі; 5) нязменных членаў управы, якія прызначаліся губернатарам па рэкамендацыі губернскай управы.

Рашэнні ў губернскім камітэце прымаліся простай большасцю галасоў, а пры іх роўнасці пераважным лічыўся голас старшыні камітэта. У выпадку, калі губернатар прынцыпова не пагаджаўся з меркаваннем большасці, то ў яго была магчымасць прыпыніць дзеянне дадзенага распараджэння і накіраваць яго на канчатковае вырашэнне міністру ўнутраных спраў. Акрамя таго, губернскі камітэт мог абіраць са свайго складу асобыя камісіі для папярэдняга разгляду спраў. Прынятыя ў выніку пасяджэнняў рашэнні камітэта накіроўваліся на зацвярджэнне міністру ўнутраных спраў [10, с. 339-342]. Як бачна, сістэма прыняцця рашэнняў ва ўпраўленнях была дастаткова складанай, а самі ўстановы знаходзіліся пад пільным наглядам дзяржаўных органаў. Аднак неабходна ўлічваць, што тое ж назіралася і ў земскіх установах цэнтральных расійскіх губерняў, што функцыянавалі па выніках змяненняў 1890 г. у земскім палажэнні. У адпаведнасці з ім губернатар таксама мог не зацвярджаць рашэнні земстваў, калі палічыць гэта патрэбным [9, с. 506].

Свае адметнасці меў і склад галосных новаўтвораных устаноў. З увядзеннем нявыбарных земстваў у беларускіх губернях натуральна паўстала пытанне аб прызначэнні туды мясцовых прадстаўнікоў для далейшай работы. Кандыдаты на пасады галосных ад кожнага павета прадстаўляліся павятовым прадвадзіцелем дваранства губернатару, а той, у сваю чаргу, перадаваў спісы на зацвярджэнне міністру ўнутраных спраў. Справа вылілася ў тое, што ў ходзе гэтага працэсу адміністрацыя сутыкнулася з шэрагам праблем. Як ужо адзначалася вышэй, адной з асноўных мэтаў стварэння ў заходніх губерняў земства менавіта ў такім выглядзе было недапушчэнне асоб польскага паходжання і каталіцкага веравызнання да іх дзейнасці. Аднак галоўная праблема заключалася ў тым, што на тэрыторыі Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў часта было складана знайсці кандыдатуры, якія б адпавядалі падобным крытэрыям урадавых колаў, паколькі кандыдатаў у земскія галосныя ў 1903 г. вырашана было прызначаць з ліку буйных землеўладальнікаў-дваран, а сярод апошніх большасць у многіх паветах складалі менавіта землеўладальнікі-каталікі.

На прыкладзе Мінскай губерні бачна, што абсалютная большасць кандыдатаў у земскія галосныя на першае трохгоддзе (1903-1905 гг.) была

каталіцкага веравызнання. У некаторых паветах іншых кандыдатаў, акрамя дваран-каталікоў, наўпрост не маглі вылучыць. Напрыклад, Ігуменскі павятовы прадвадзіцель дваранства ў лісце да губернатара вымушаны быў канстатаваць, што «асоб рускага паходжання, якія б маглі стаць земскімі галоснымі і пражывалі пастаянна ў сваіх маёнтках, у ліку землеўласнікаў Ігуменскага павета не маецца».

У выніку галоснымі на 1903-1905 гг. у губернскі камітэт былі прызначаны 18 чалавек, 10 з якіх належалі да каталіцкага веравызнання, 7 да праваслаўнага, а 1 да евангелісцка-лютэранскага. Падобная сітуацыя склалася і з галоснымі на 1906-1908 гг., колькасць якіх ад кожнага павета была павышана з двух да пяці. Па Мінскай губерні (без уліку даных па Навагрудскаму павету) былі прызначаны 20 каталікоў, 16 праваслаўных, 3 лютэраніна і 1 старавер. Трэба адзначыць, што праваслаўныя галосныя амаль заўсёды саступалі па статусу і колькасці зямельных уладанняў сваім каталіцкім канкурэнтам. Тым не менш, адміністрацыя старалася для работы ва ўстановах прызначыць як мага больш галосных менавіта з іх ліку [46; 47, арк. 19 адв.–235].

Падобныя праблемы для мясцовай адміністрацыі ўзніклі і ў Віцебскай губерні. У 1906-1908 гг. у Віцебскім губернскім камітэце па справах земскай гаспадаркі з 55 галосных ад кожнага павета 29 чалавек былі каталіцкага веравызнання [133, с. 3]. Усё гэта дазваляе зрабіць выснову, што галоўная мэта стварэння устаноў менавіта ў такім мадыфікаваным выглядзе, у адпаведнасці з якой расійскі ўрад імкнуўся не дапусціць да ўдзелу ў мясцовым самакіраванні іншародных элементаў, на беларускіх землях не была дасягнута. Нельга недаацэньваць ролю «польскай» фракцыі ў далейшым функцыянаванні нявыбарнага земства. Вядомы грамадскі і палітычны дзеяч Э.А. Вайніловіч, які быў земскім галосным ад Слуцкага павета ў 1903-1905 гг., у сваіх успамінах канстатаваў: «Нягледзячы на тое, што большасць арыентавалася на меркаванне губернатара, сілай аргументацыі і імкненнем да мэты, дзеля дабрабыту грамадства, мы заслужылі сабе аўтарытэт і ў асноўным свае ідэі рэалізавалі» [8, с. 116].

Спецыфічныя асаблівасці можна назіраць таксама ў сацыяльным складзе земскіх галосных. Калі на 1903-1905 гг. было прынята рашэнне прызначаць у іх склад выключна дваран, то ў 1906 г. тут адбыліся значныя змяненні. Цяпер галоснымі маглі стаць прадстаўнікі іншых саслоўяў. Такім чынам, сацыяльны склад земскіх галосных Мінскай губерні на 1906-1908 гг. быў наступны: дваран – 19, сялян – 10, ганаровых грамадзян – 3, чыноўнікаў – 2, мяшчан – 1 [47, арк. 19 адв.–235]. Такім чынам, паступова ўпраўленні па справах земскай гаспадаркі пераўтварыліся ў сапраўдны мясцовы прадстаўнічы орган, дзе знайшлося месца для абароны інтарэсаў розных сацыяльных груп, у тым ліку і сялян.

Для паўнацэннага разумення сутнасці земскіх устаноў 1903 г. неабходна адказаць на пытанне, ці можна іх лічыць органамі мясцовага самакіравання. Як ужо адзначалася вышэй, даследчыкі схільныя адназначна адносіць упраўленні па сваёй прыродзе да звычайных дзяржаўных устаноў і адмяжоўваюць іх ад земстваў. Адна з прычын гэтага – празмерны адміністрацыйны кантроль зверху, але тое ж было характэрна і для іншых земскіх устаноў. З іншага боку, па факце мы бачым сапраўдныя прадстаўнічыя органы, у якія прызначаліся прадстаўнікі розных саслоўяў, што стала пражывалі на адпаведнай тэрыторыі. Адсюль вынікае, што толькі адсутнасць выбарнасці галосных можна лічыць адназначным аргументам супраць.

Тым не менш, напрыклад, у адпаведнасці з так званай дзяржаўнай тэорыяй мясцовага самакіравання, галоўным атрыбутам адрознення ад цэнтральнага дзяржаўнага кіравання з’яўляецца тое, што мясцовае самакіраванне здзяйсняецца не ўрадавымі чыноўнікамі, а жыхарамі, зацікаўленымі ў выніках мясцовага кіравання. Пры гэтым неабходнай умовай самакіравання з’яўляецца эканамічная незалежнасць ад урада, якая дазваляе самастойна дзейнічаць пры вырашэнні пытанняў мясцовага значэння [11, с. 23-24]. У выпадку з упраўленнямі бачна, што ў самім земскім Палажэнні 1903 г. замацаваны пункт аб прызначэнні галоснымі ў камітэты па справах земскай гаспадаркі і членамі ва ўправы выключна людзей, добра знаёмых з мясцовымі патрэбамі. Такім чынам, пытанне аб сутнасці ўстаноў застаецца дыскусійным. Пераносячы паняцці сучаснасці на мінулае, даследчыкі непазбежна сутыкаюцца з праблемай суаднясення тэрмінаў «мясцовае кіраванне» і «мясцовае самакіраванне», цалкам размежаваць якія ў дачыненні да рэалій той гістарычнай эпохі не прадстаўляецца магчымым.

## 3.2 Асноўныя мерапрыемствы ў сацыяльна-культурнай і гаспадарчай сферах

Адным з галоўных напрамкаў дзейнасці Упраўлення па справах земскай гаспадаркі Мінскай губерні была сфера аховы здароўя. У якасці першаснай сваёй задачы на пачатковым і наступным этапах галосныя вызначылі пашырэнне сеткі лячэбных устаноў, а таксама рамонт і абсталяванне ўжо існуючых. Зыходзячы з гэтага, асноўныя рашэнні 1903 г. вылiліся ў выдаткаванне грошай на пабудову бальніцы ў Астрашыцкім гарадку, якая стала пятай у межах Мінскага павета, Слуцку, Баранавічах Навагрудскага павета, а таксама лячэбніцы ў Азарычах Рэчыцкага павета. Унесла ўпраўленне свой уклад і ў пабудову Віленскай акружной лячэбніцы для псіхічнахворых, якая павінна была абслугоўваць усе пяць беларускіх губерняў. Наступным крокам таксама вылучаны сродкі на рамонт шэрагу бальніц: Лошніцкай і Мсціслаўскай

Барысаўскага павета, Ігуменскай і Бярэзінскай Ігуменскага павета, трох бальнічных установ Мінска.

Адначасова значна было пашырана фінансаванне на ўтрыманне бактэрыялагічных станцый для лячэння немаёмных, пакусаных шалёнымі жывёламі. Адгэтуль такія выдаткаванні замацаваліся. Акрамя таго, арганізацыя і забеспячэнне фінансамі губернскага з’езда ўрачоў у Мінску, правядзенне якога было вельмі прагрэсіўнай з’явай для свайго часу, таксама ляглі на плечы Упраўлення па справах земскай гаспадаркі [36, арк. 7–108].

Улічваючы дрэнную сітуацыю з лекамі на месцах, у 1904 г. галосныя мінскага губернскага камітэта вылучылі значныя сумы на пакупку медыкаментаў для кожнага павета. Разам з тым былі дадзены сродкі на пабудову бальніцы ў Баранавічах Навагрудскага павета і новага будынка для земскай бальніцы Пінска, а таксама на ўладкаванне бальніцы ў Лельчыцах Мазырскага павета. Пры гэтым упраўленнем куплены новыя будынкі для Уздзенскай бальніцы Ігуменскага павета і Рэчыцкай бальніцы. Неабходнай мерай ва ўпраўленні палічылі таксама перанос губернскай земскай бальніцы і ўладкаванне ў ёй псіхіятрычнага аддзялення і багадзельні [37, арк. 153 адв.–159 адв.].

Сярод мер па паляпшэнні земскай медыцыны ў 1906 г. можна адзначыць пабудову бальніцы ў Бацэвічах Бабруйскага павета і новага бальнічнага памяшкання ў Лельчыцах Мазырскага павета. У дадатак мінскім губернскім камітэтам вылучаны грошы на рамонт Бярэзінскай бальніцы Ігуменскага павета, канчатковае абсталяванне Лоеўскай земскай бальніцы Рэчыцкага павета, а таксама ўладкаванне хірургічнага аддзялення і паляпшэнне аперацыйнага пакою пры губернскай земскай бальніцы [108, с. 14–112].

У наступным 1907 г., працягваючы практыку папярэдніх гадоў, упраўленнем была адкрыта лячэбніца ў Філіповічах Слуцкага павета, выдаткаваны грошы на пабудову Бягомльскай лячэбніцы, прыстасаваны дадатковыя будынкі пад земскую бальніцу Рэчыцы, набыты будынкі і ўчастак зямлі былой Пушкінскай лячэбніцы для размяшчэння там невылечна хворых, а таксама нанятае дадатковае памяшканне для псіхіятрычнага аддзялення губернскай земскай бальніцы. Пры гэтым па каштарысе на 1908 г. вылучаны сродкі на рамонт Уздзенскай, Ігуменскай, Навагрудскай, Бярэзінскай, Мінскай губернскай бальніцы і на заканчэнне рамонту будынкаў Скрыгалаўскай і Тураўскай бальніц Мазырскага павета.

У гэты ж час у сваёй дзейнасці ўпраўленню прыйшлося сутыкнуцца з новай пагрозай для мясцовага насельніцтва – эпідэміямі. Мінскі губернскі камітэт своечасова адрэагаваў на ўспышку эпідэміі халеры ў рэгіёне, на барацьбу з якой былі кінуты велізарныя сілы і сродкі [109, с. 17–152].

Перыяд 1908–1910 гг. ў рабоце галосных адметны выдаткаваннем грошай на рамонт Віленскай акружной лячэбніцы для псіхічнахворых і будынкаў Целяханскай земскай бальніцы Пінскага павета, а таксама на абсталяванне дадатковых ложкаў ў Азарычскай земскай бальніцы Рэчыцкага павета [39, арк. 25 адв.; 40, арк. 8; 41, арк. 8 адв.–9 адв.]. Паралельна ўпраўленне ўключылася ў барацьбу з эпідэміямі сыпнога тыфу і скарлатыны, якія пачаліся ў некаторых паветах губерні з восені 1909 г. Тым не менш, на старонках газет сучаснікі негатыўна ацэньвалі яго дзейнасць у гэтым напрамку [72, с. 262, 265].

У 1911 г. губернскім камітэтам былі вылучаны сродкі на барацьбу з халерай, пабудову бальніцы ў Леніна Мазырскага павета, а таксама Віленскай акружной лячэбніцы псіхічнахворых і Віленскай Пастэраўскай станцыі за лячэнне жыхароў Мінскай губерні [43, арк. 4; 44, арк. 44 адв.; 45, арк. 49 адв.]. Акрамя таго, мінскі губернскі камітэт ў чарговы раз прафінансаваў арганізацыю з’езда ўрачоў губерні, на якім абмяркоўваліся актуальныя пытанні сферы аховы здароўя. Трэба заўважыць, што ў іншых беларускіх губернях такіх з’ездаў у гэты час не праводзілася [75, с. 58]. Значнай падзеяй было і тое, што ў гэтым жа годзе ў Мінску адкрылася ўласная земская Пастэраўская станцыя, якая займалася лячэннем пакусаных шалёнымі жывёламі. Такім чынам, неабходнасць звяртацца за падобнымі паслугамі ва ўстановы іншых губерняў адгэтуль адпала [76, с. 88].

Другім важным напрамкам дзейнасці ўпраўлення была народная асвета. Патрэбы яе на пачатковым этапе былі вызначаны як вельмі шырокія, таму галосныя вырашылі не спыняцца на нейкім дакладным плане па прычыне значнасці той сумы, што патрабавалася. Губернскі камітэт у 1903 г. абмежаваўся выдаткаваннем на паляпшэнне школьнай справы сумы ў 15 794 руб., а ў дадатак па 3 500 руб. на кожны павет. Тым не менш, было пастаноўлена пабудаваць у Ракаве Мінскага павета і Нягневічах Навагрудскага павета ніжэйшыя рамесніцкія школы. Што датычыцца царкоўна-прыхадскіх школ, то на іх утрыманне вылучылі суму ў памеры 78 300 руб. [36, арк. 67 адв.–78].

З нагоды нараджэння спадкаемцы прастола Аляксея Мікалаевіча ў 1904 г. губернскі камітэт пастанавіў адкрыць і ўзяць на ўтрыманне ніжэйшую рамесніцкую школу ў Ракаве Мінскага павета з прысваеннем ёй назвы «Школа Цэсарэвіча Аляксея». Акрамя таго, было вырашана адкрыць і даваць палову на ўтрыманне мужчынскай чатырохкласнай прагімназіі ў Ігумене, а таксама пабудаваць школы ў Баранавічах і Любані. Узяло на сябе ўпраўленне і расходы па арганізацыі ў губерні народных чытанняў па паляпшэнню вядзення сельскай гаспадаркі.

Асабліва востра стаяла пытанне аб царкоўна-прыхадской адукацыі, якое яскрава дэманстравала наяўнасць міжрэлігійных супярэчнасцей у рэгіёне. Па

прычыне недастатковай колькасці школ ў цэлым, мінскі губернскі камітэт у 1904 г. пайшоў на падпісанне пагаднення з царкоўна-прыхадскім упраўленнем. У адпаведнасці з ім на наступны год былі вылучаны сродкі для 7 двухкласных і 252 аднакласных царкоўна-прыхадскіх школ. Пры гэтым на ўтрыманне браліся выключна свецкія настаўнікі [37, арк. 1 адв.–179].

Ажыўленае абмеркаванне пытанне аб лёсе царкоўна-прыхадскіх школ выклікала на гадавым пасяджэнні губернскага камітэта 1905 г. У мемарандуме пінскага павятовага камітэта, прадстаўленым галосным А.А. Скірмунтам, заяўлялася, што гэтыя чыста рэлігійныя школы не павінны быць падтрыманы каталіцкім насельніцтвам і лепш выдаткаваць грошы на школы іншага тыпу. Галосны ад Слуцкага павета Э.А. Вайніловіч у падтрымку адзначаў, што земскія школы ў большай ступені запатрабаваныя сярод насельніцтва і ўтрыманне іх значна таннейшае. У выніку аргументы з боку галосных каталіцкага веравызнання былі пачуты: фінансаванне царкоўна-прыхадскіх школ было скарочана і склала 49 655 руб. Грашовая падтрымка ж свецкіх школ на наступны год вылілася ў вылучэнне па 10 000 руб. на кожны павет [130, s. 3].

У наступным 1906 г. губернскім камітэтам прынята рашэнне аб хадайніцтве перад Міністэрствам народнай асветы аб пераўтварэнні Мазырскай шасцікласнай прагімназіі ў васьмікласную гімназію, а таксама выдаткаваны сродкі на ўтрыманне вучылішча сляпых у Мінску. Паступова ўводзілася ў абарот практыка ўстанаўлення стыпендый для дзяцей з маламаёмных сямей, якія б пасля заканчэння навучання маглі працаваць на карысць губерні. Такія стыпендыі дадзены ўраджэнцам Крупейкаў Рэчыцкага павета, якія вучыліся ў Гомельскай земскай кошыкавай майстэрні, а таксама для бедных навучэнцаў Магілёўскай цэнтральнай фельчарскай школы родам з Мінскай губерні [108, с. 7–126].

Вырашэнню адукацыйных пытанняў павінны былі паспрыяць вучылішчныя саветы, якія створаны пры Упраўленні па справах земскай гаспадаркі Мінскай губерні ў 1907 г. Канкрэтныя дзеянні ў сферы народнай асветы вылiліся ў пакрыццё часткі расходаў па адкрыцці жаночай настаўніцкай семінарыі ў Навагрудку, грашовую дапамогу для Слуцкай жаночай гімназіі і Ігуменскай прагімназіі, а таксама стварэнне дзесяці стыпендый пры Мар’іна-Горскай ніжэйшай сельскагаспадарчай школе.

У гэты ж час прагучала ініцыятыва з боку Мінскай гарадской думы, якая хадайнічала ва ўпраўленне аб вылучэнні 500 000 руб. на ўладкаванне ў Мінску ўніверсітэта. Адкрыццё на беларускіх землях вышэйшай адукацыйнай установы актыўна падтрымалі многія галосныя, аднак большасць членаў губернскага камітэта ўсё ж такі прагаласавала супраць [108, с. 5, 31–104].

Дзейнасць Упраўлення па справах земскай гаспадаркі па пашырэнні народнай асветы набірала ўсё большыя абароты. Прыкладам можа служыць

тое, што ва ўсёй Мінскай губерні, па існуючых дадзеных, ў 1908 г. адкрылася 140 новых школ, у той час калі ў Віленскай, для параўнання, толькі 78 такіх школ [66, с. 3]. Зыходзячы з нарастаючай патрэбы ў настаўніцкіх кадрах, у гэты ж час дадзена субсідыя на адкрыццё ў Мінскай губерні педагагічных курсаў [39, арк. 31].

У 1909 г. былі вылучаны грошы на рамонт Бабруйскай школы садаводства і агароднiцтва. Затым, ва ўмовах росту патрэб сельскай гаспадаркі і перабудовы жыцця ў вёсцы ў цэлым, у 1910 г. губернскім камітэтам прынята рашэнне аб пераўтварэнні Бабруйскай школы садаводства ў сельскагаспадарчую з педагагічным аддзяленнем. Разам з тым была адкрыта сельскагаспадарчая школа ў Азарычах Бабруйскага павета, а таксама выдаткаваны сродкі на пабудову будынкаў для Веляцічскага і Охаўскага народных вучылішчаў у Пінскім павеце [41, арк. 8; 42, арк. 30 адв.–40 адв.]. Важнымі крокамі 1911 г. у галіне народнай асветы стала адкрыццё ў Баранавічах ніжэйшага сельскагаспадарчага вучылішча і выдача дапамогі бяднейшым навучэнцам Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі [44, арк. 50 адв.–51].

Адначасова з папярэднімі, сталым напрамкам дзейнасці ўпраўлення з’яўлялася сацыяльная дапамога насельніцтву. Напрыклад, пасля ўступлення Расійскай імперыі ў вайну з Японіяй у 1904 г. перад упраўленнем паўстала праблема зябеспячэння сямей ніжэйшых чыноў, прызваных у дзеючую армію. Усяго такіх сямей па губерні было ўзята на ўтрыманне 24 346, а памер грашовай дапамогі вызначаўся ў залежнасці ад узроўню іх даходаў.

Паступова пачынала практыкавацца арганізацыя грамадскіх работ. Так, па прычыне спынення выдачы банкамі крэдытаў і ў сілу неспрыяльных эканамічных умоў, у 1904 г. будаўнічыя работы ў Мінску скараціліся і каля 1 000 рамеснікаў засталіся без работы і сродкаў для існавання. Спробы адміністрацыі знайсці для іх занятак засталіся безвыніковымі. Упраўленне прыйшло ім на дапамогу, задзейнічаўшы беспрацоўных у пабудове арыштнага дома ў Мінску і ўладкаванні пад’язных да горада трактаў.

Звычайнай з’явай стала аказанне ўпраўленнем дапамогі пацярпелым ад стыхійных бедстваў вясковым жыхарам. Прыкладам можна лічыць задавальненне хадайніцтва аб выдачы грашовай дапамогі на пракорм жывёлы ў 1904 г. сялян з Бараўлян Барысаўскага павета, гаспадарчыя пабудовы якіх былі вынішчаны пажарам [37, арк. 1 адв.–65 адв.]. У 1906 г. значная дапамога аказана разнастайным дабрачынным установам і арганізацыям: Гомельскай Фёдара-Ірыненскай лячэбніцы, якая абслугоўвала Рэчыцкі павет, Мінскаму гарадскому прытулку, Праўленню таварыства «Міласэрнасць» і Савету апякунства над глуханямымі [108, с. 8–80].

Паступова сацыяльная дапамога насельніцтву набывала ўсё большы размах. Губернскім камітэтам у 1907 г. дадзены вялікія сродкі на падтрымку сялян Рэчыцкага і Ігуменскага паветаў, што пацярпелі ад затаплення сенакосаў, а таксама аказана грашовая дапамога жыхарам Стоўбцаў Мінскага павета, дзе пажар вынішчыў некалькі сотняў дамоў.

У той жа час упраўленню прыйшлося сутыкнуцца з наступствамі неўраджаю 1907 г., які выліўся ў сапраўдны голад. Губернскім камітэтам было ўзбуджана хадайніцтва ў Пецярбург аб вылучэнні харчовай пазыкі ў памеры 200 000 руб., на якія планавалася набыць 200-250 вагонаў жыта і прадаваць яго насельніцтву па нарыхтоўчых цэнах [109, с. 11–101]. Міністэрства ўнутраных спраў дазволіла зрабіць пазыку, але з умовай, што сялянам жыта будзе давацца не ў доўг, а за наяўныя грошы [61, с. 7]. Трэба прызнаць, што ў выніку дадзеная акалічнасць не спрыяла эфектыўнасці такой дапамогі.

Аказана грашовая падтрымка ўпраўленнем у гэты час і такім арганізацыям як Мінская абшчына сёстраў міласэрнасці Чырвонага крыжа, Таварыства ўзаемнай дапамогі настаўнікам і навучэнцам у народных вучылішчах Мінскай губерні, а таксама Праўленню таварыства «Міласэрнасць» на ўтрыманне прытулку падкідышаў [109, с. 19–151].

У наступным 1908 г. кампанія па дапамозе галадаючаму насельніцтву губерні працягнулася. Губернскім камітэтам было нават дазволена існуючай пры ўправе харчовай камісіі ў неабходных выпадках прадаваць жыта ніжэй за нарыхтоўчыя цэны [39, арк. 30 адв.]. Аднак голад у Мінскай губерні не адступіў, у многіх месцах нават завялася цынга, таму ўпраўленне было вымушана прасіць даслаць у губерню яшчэ 150 вагонаў жыта [64, с. 7].

На завяршальным этапе існавання ўпраўлення, на працягу 1908–1911 гг. аказвалася фінансавая дапамога Мінскаму радзільнаму прытулку, 2-му Дабрачыннаму таварыству, якое займалася ўтрыманнем бездаглядных дзяцей, а таксама Праўленню таварыства «Міласэрнасць» на ўтрыманне прытулку падкідышаў і наём для апошняга дадатковага памяшкання [39, арк. 27–29 адв.; 41, арк. 11; 45, арк. 65 адв.–66].

Адной з мер упраўлення па падтрымцы вядзення мясцовай гаспадаркі стала дапамога ў арганізацыі адпаведных выставак. Так, у 1904 і 1906 гг. вылучаны сродкі на арганізацыю ў Пінскім павеце выставак твораў дробнай сельскай гаспадаркі і саматужных промыслаў, а таксама выдачу ўзнагарод экспанентам [38, арк. 41 адв.–42 адв.; 108, с. 18]. Затым у 1907 г. прафінансавана адкрыццё падобных выставак у Лунінцы і Любешаве. За лепшыя сялянскія экспанаты тут прысуджаліся ўзнагароды з найменнем «Ад Мінскага ўпраўлення па справах земскай гаспадаркі» [109, с. 55].

У 1908 г. мінскім губернскім камітэтам былі выдаткаваны грошы на адкрыццё сельскагаспадарчых выставак у Слуцкім павеце і Століне Пінскага

павета, а таксама на выплаты ўсім іх удзельнікам. Па земскім каштарысе ў 1909 г. дадзены сродкі на ўладкаванне двухдзённага кірмашу ў Слуцку і традыцыйнай сельскагаспадарчай выстаўкі ў Пінску, зноў жа, з выдачай на гэтых мерапрыемствах узнагарод за лепшыя прадстаўленыя творы [39, арк. 41 адв.–42 адв.; 41, арк. 6 адв.–7].

Паралельна адбыўся шэраг арганізацыйных новаўвядзенняў. Пры губернскай і павятовых управах у 1910 г. створаны эканамічныя саветы, мэтай якіх стала далейшае паляпшэнне гаспадарчых умоў у межах губерні, а таксама ўведзены дзесяць пасад аграномаў: аднаго губернскага і дзевяці павятовых [8, арк. 29 адв.–30]. У 1911 г. упраўленнем было прынята рашэнне аб адкрыцці балотнай станцыі ў Мінску, якая ўключала ў сябе лабараторыю і батанічны кабінет. Разам з тым у гэты час зацверджана правядзенне сельскагаспадарчых выставак ў Капылі Слуцкага павета і Пінску, а таксама дадзены грошы на выплаты за лепшыя экспанаты [43, арк. 6; 44, арк. 49–49 адв.].

Паступова ў межах губерні стваралася сістэма пажарнай бяспекі. У 1906 г. дадзены сродкі ў распараджэнне губернскай управы на субсідаванне пажарных таварыстваў і дружын, забеспячэнне населеных пунктаў пажарнымі машынамі, а таксама на правядзенне ў жыццё іншых супрацьпажарных мерапрыемстваў: уладкаванне глінасаламяных дахаў, паляпшэнне сялянскіх печаў і г.д. Значна павялічыліся расходы на супрацьпажарныя мерапрыемствы ў 1907 г.: у распараджэнне губернскай управы паступіла 37 000 руб. На наступныя гады сума такіх выдаткаванняў замацавалася [108, с. 40; 109, с. 93].

Першапачаткова атрымаць пажарныя помпы і сродкі на наём пажарнай дружыны маглі толькі сялянскія таварыствы. Для гэтага з іх боку павінна была паступіць адпаведная просьба да земскага страхавога агента, які вырашаў дадзенае пытанне з павятовай управай. Аднак для павышэння эфектыўнасці сістэмы пажарнай бяспекі з 1910 г. пажарныя машыны пачалі выдаваць не толькі сялянскім таварыствам, але і памешчыкам [67, с. 7; 42, арк. 52].

У 1911 г. сума на супрацьпажарныя мерапрыемствы ў губерні Упраўленнем па справах земскай гаспадаркі пашырана да 44 000 руб. Болей таго, з мэтай матывацыі насельніцтва ў гэтым напрамку мінскім губернскім камітэтам было прынята рашэнне аб пачатку выдачы грашовых узнагарод за ўладкаванне глінасаламяных дахаў [44, арк. 70].

Удзельнічала ўпраўленне і ў распаўсюджанні дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу. Па ініцыятыве мясцовага павятовага камітэта ў 1909 г. былі вылучаны грошы на ўладкаванне тэлефоннай сеткі ў Рэчыцкім павеце. Пры гэтым планавалася стварыць шэсць тэлефонных станцый, а працягласць сеткі павінна была скласці 657 вёрст [41, арк. 49 адв.].

Працягнулася рэалізацыя паступовага ўладкавання тэлефонных ліній у губерні ў наступным 1910 г. У гэты час губернскі камітэт пастанавіў злучыць

тэлефоннай сувяззю Хоінскую воласць з павятовым цэнтрам Пінскам, па прычыне складаных тапаграфічных умоў мясцовасці і частай адсутнасці магчымасці мець прамыя зносіны [42, арк. 40 адв.].

У адпаведнасці з Палажэннем 14 сакавіка 1911 г. у трох беларускіх губернях уводзіліся выбарныя земствы, таму перад упраўленнем была пастаўлена задача аб арганізацыі перахода да новых устаноў, у тым ліку і правядзенне выбараў галосных [43, арк. 4]. У выніку з 1 кастрычніка 1911 г. у губерні пачало сваю дзейнасць выбарныя земскія ўстановы. Аднак можна канстатаваць, што так як сярод новых земскіх галосных амаль не мелася людзей з вопытам, то і пабудаваць эфектыўна работу першапачаткова стала праблемным [82, с. 523]. Па прычыне адсутнасці патрэбнай пераемнасці мясцовае кіраванне губерні вярнулася да такой жа сітуацыі, што была ў 1903 г., калі прызначаныя ва ўпраўленне галосныя часта проста губляліся ў земскіх справах. Каштоўны вопыт папярэдніх устаноў, набыты васьмігадовай працай, у многім быў не выкарыстаны.

Такім чынам, дзейнасць Упраўлення па справах земскай гаспадаркі ў межах Мінскай губерні мела цалкам станоўчыя вынікі. Галоснымі і ў цэлым ўсімі супрацоўнікамі ўпраўлення з 1903 па 1911 гг. была праведзена велізарная работа, якая адыграла адметную ролю ў паляпшэнні сацыяльна-эканамічнага і культурнага становішча рэгіёна. У той жа час у працэсе свайго функцыянавання ўпраўленню прыйшлося сутыкнуцца з шэрагам праблем, з-за якіх мноства ініцыятыў так і не атрымалася рэалізаваць. Асабліва адчуваліся недастатковая колькасць фінансавых сродкаў, а таксама празмерны кантроль і абмежаванні з боку вышэйстаячых органаў. Дадавалі складанасці і прынцыпова розныя падыходы галосных праваслаўнага і каталіцкага веравызнання да вырашэння тых ці іншых пытанняў. Тым не менш, існаванне земскіх устаноў такога тыпу стала важнай прыступкай для развіцця мясцовага самакіравання на беларускіх землях і паслужыла асновай для паўнацэннай рэалізацыі земскай рэформы ў Беларусі ў 1911 г.

# ГЛАВА 4
# ФУНКЦЫЯНАВАННЕ ВЫБАРНЫХ ЗЕМСКІХ ОРГАНАЎ У 1911-1914 ГГ.

## 4.1 Механізм дзеяння, сацыяльны і нацыянальны склад

Увядзенне выбарных земскіх органаў у трох беларускіх губернях, Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай, было зацверджана ўказам ад 14 сакавіка 1911 г. Згодна з ім на беларускія землі распаўсюджвалася «Палажэнне аб губернскіх і павятовых земскіх установах» 1890 г., якое дзейнічала ў цэнтральных расійскіх губернях. Аднак асаблівасцю ўказа была наяўнасць у шэрагу змяненняў і дапаўненняў.

Замест саслоўных курый (сялянскай і дваранскай) уводзіліся курыі нацыянальныя – «руская» і «польская». У «рускую» ўключалася праваслаўнае беларускае насельніцтва (па сутнасці, усе, акрамя палякаў і яўрэяў), а ў «польскую» – каталіцкае. Для забеспячэння перавагі ў земстве за рускімі памешчыкамі пры размеркаванні выбаршчыкаў бралася сярэдняе арыфметычнае колькасці «рускага» і «польскага» насельніцтва і кошт іх нерухомай маёмасці (у працэнтах). У Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губернях не толькі дваранства, але і сялянства былі пераважна каталікамі. Пры такой сістэме падліку ўсё роўна пераважала б «польская» курыя. З гэтай прычыны земствы ў названых губернях не ўводзіліся.

Закон аб заходнім земстве быў разлічаны на збліжэнне заможных беларускіх і ўкраінскіх сялян з рускімі памешчыкамі. Разам з тым урад не адмаўляўся і ад апоры на польскіх землеўладальнікаў і забяспечваў ім даволі высокае прадстаўніцтва ў земствах, а ў «польскай» курыі – поўную перавагу над сялянамі. На палову быў зменшаны выбарчы цэнз – з 15 тыс. да 7,5 тыс. руб. вартасці нерухомай маёмасці.

Для выбрання губернскіх земскіх галосных павятовы земскі сход падзяляўся на два аддзяленні – для асоб «рускага» і «польскага» паходжання. Павятовыя галосныя ў кожным павеце абіраліся на адным земскім выбарчым сходзе і двух земскіх выбарчых з’ездах (па маёмаснай прыкмеце). У кожным павеце яны падзяляліся яшчэ на два аддзелы ў залежнасці ад веравызнання.

Правам удзелу ў выбарчых з’ездах карысталіся мужчыны з 25-гадовага ўзросту, якія на працягу не менш аднаго года ў межах павета валодалі адпаведнай маёмасцю. Жанчыны ўдзельнічалі ў земскім выбарчым з’ездзе праз упаўнаважаных. Прадстаўніцтва ад сялян у павятовым земскім сходзе магло складаць не больш 1/3 часткі ўсіх галосных. У губернскае земства ад кожнага павета выбіраўся не менш, чым адзін прадстаўнік ад сялян. Так на 1911-1914 гг. у складзе Мінскага губернскага земскага сходу з 49 губернскіх галосных было 9

сялян, 1 святар і 39 дваран і служачых. Склад земскіх упраў выбіраўся такім чынам, каб большасць галасоў належала асобам праваслаўнага веравызнання.

У функцыянальных адносінах земскія ўстановы, створаныя ў заходніх губернях паводле ўказа ад 14 сакавіка 1911 г., не адрозніваліся ад земстваў цэнтральных губерняў Расіі. Тое ж датычыцца і структуры заходніх земстваў: распарадчымі органамі былі губернскія і павятовыя земскія сходы, а выканаўчымі – губернскія і павятовыя земскія ўправы. Акрамя таго, асобным пунктам Палажэння 1911 г. горад Мінск вылучаўся ў самастойную земскую адзінку. На яго гарадскія думу і ўправу ўскладаліся правы і абавязкі земскага сходу і ўправы адпаведна [121, с. 22-23; 52, арк. 52–53].

Асобна патрэбна спыніцца на праблеме нацыянальнага прынцыпу фарміравання земскіх органаў. У часы функцыянавання ў 1903-1911 гг. ўпраўленняў па справах земскай гаспадаркі, якія былі пазбаўлены выбарнасці, дваране-каталікі пераважалі сярод галосных у распарадчых органах. Выправіць гэты момант на аснове існуючага тады закона 1903 г. было немагчыма. У выніку ж выбараў 1911 г. з 49 губернскіх галосных 39 спавядалі праваслаўе, 9 – каталіцтва і 1 – лютэранства. Члены губернскай управы першага трохгоддзя дзеяння земства былі выключна праваслаўнымі [52, арк. 52–53].

Традыцыйна даследчыкі адзначаюць, што гэта паспрыяла неэфектыўнасці ў функцыянаванні ўстаноў на нашых землях. Тым не менш, зыходзячы з шэрагу крыніц, можна зрабіць выснову, што ўплыў дадзенага фактару на дзейнасць земстваў Мінскай губерні цяжка назваць адназначным. У сваіх успамінах гэта адзначаюць як прадстаўнікі правячых колаў, так і апазіцыйна настроеныя дваране-каталікі. Так, грамадскі дзеяч і земскі галосны Э.А. Вайніловіч у мемуарах падкрэсліваў, што існаванне так званай «польскай» курыі стала безумоўна карысным, так як ад урада ў 1911 г. чакалі пазбаўлення дваран каталіцкага веравызнання права ўдзелу ў самакіраванні наогул. У выніку па прычыне моцных пазіцый у губернскім земстве такіх выбітных асоб як Р.А. Скірмунт, князь Г.Э. Друцкі-Любецкі, самога Вайніловіча і інш., галосным-каталікам часта ўдавалася задаваць тон на пасяджэннях [8, с. 117–118].

У той жа час цяжка пагадзіцца з катэгарычнымі заявамі мінскага губернатара князя В.А. Друцкога-Сакалінскага, вопытнага знаўцы земскай справы. Чыноўнік адзначаў, што такі прынцып фарміравання заходніх земскіх устаноў ні колькі не перашкаджаў прадуктыўнасці іх дзейнасці. Пры гэтым нацыянальнае раз’яднанне галосных, нібыта, наадварот паслужыла «цэментам для дружнай дзелавой работы», спрыяла пошуку адзінства [13, с. 172–173]. Аднак відавочным было імкненне правячых колаў да абмежавання доступу да самакіравання каталікоў, колькасць якіх у земствах пры справядлівай сістэме выбараў была б значна большай. Тым не менш, патрэбна прызнаць, што наяўная канкурэнцыя паміж прадстаўнікамі двух супрацьлеглых лагераў

галосных спрыяла пошуку больш эфектыўных шляхоў для вырашэння мясцовых пытанняў і дазваляла пачуць шырокае кола меркаванняў і прапаноў.

Адметнай рысай новаўтвораных заходніх земстваў было і тое, што іх галосныя і служачыя ўспрымалі сябе выключна як мясцовы гаспадарча-эканамічны орган, прысвячаючы сваю дзейнасць толькі вырашэнню лакальных праблем. Іншыя ж расійскія земствы, якія ў большасці бачылі сябе грамадска-палітычнымі ўстановамі, значную колькасць часу на пасяджэннях праводзілі ў дыскусіях, ігнаруючы часам найбольш актуальныя праблемы. У той час, як звычайны расійскі памешчык грамадскімі справамі ў губерні мог цікавіцца мала, то любы мясцовы землеўладальнік, нават магнат кшталту Радзівілаў, ніколі не губляў сувязі са сваімі землямі і ахвотна займаўся вырашэннем мясцовых праблем, якія былі добра яму знаёмыя [13, с. 173–174].

## 4.2 Гаспадарчая дзейнасць земскіх органаў

На фоне рэалізацыі на тэрыторыі Беларусі Сталыпінскай аграрнай рэформы важным напрамкам дзейнасці земскіх органаў Мінскай губерні сталі агранамічныя мерапрыемствы. Як ужо адзначалася вышэй, актывізацыя пачалася яшчэ з 1910 г., часу існавання Упраўлення па справах земскай гаспадаркі. Менавіта тады пры губернскай і павятовых управах ствараліся так званыя эканамічныя саветы і былі ўведзены дзесяць пасад аграномаў. Аднак рэалізацыя апошняй пастановы ў поўнай меры расцягнулася на некалькі гадоў.

Дадзеную акалічнасць тлумачыў у сваёй вітальнай прамове да губернскага земскага схода ў 1911 г. мінскі губернатар Я.Я. Эрдэлі, кажучы аб тым, што толькі ў апошнія гады земскія губерні пачалі надаваць увагу пытанням сельскай гаспадаркі, пасля падвышэння падаткаў, да гэтага ж больш сродкаў вылучалася на школы, бальніцы і дарогі [17, с. 1]. Менавіта з выбарнага земства вядуць свой адлік актыўныя дзеянні. Да гэтага асігнаванні былі нязначнымі, ды і ўвогуле не ставіліся шырокія мэты, абмяжоўваліся субсідыямі на правядзенне сельска-гаспадарчых выставак і ўзнагароды найлепшым экспанентам. За гэта папярэднія ўстановы адразу ж падверглiся крытыцы з боку новага земства.

Пачынаючы з 1911 г. актыўна пайшла работа па садзейнічанні эканамічнаму дабрабыту насельніцтва. Ужо на першым чарговым пасяджэнні Мінскага губернскага земскага сходу былі акрэслены асноўныя дзеянні. Створаная агранамічная камісія на чале з Папа-Афанасопула цалкам раскрытыкавала дзеянні губернскага камітэта, іх мізэрныя асігнаванні, і паставіла задачу на актывізацыю дзейнасці.

Затым агранамічнай камісіяй узнята пытанне аб далейшай скіраванасці Мінскага земства ў вобласці агранамічных мерапрыемстваў – ці павінна

земская агранамічная арганізацыя ў губерні быць пераважна губернскай ці выключна павятовай, альбо насіць змешаны павятова-губернскі характар. На першым чарговым земскім сходзе на пытанне гэтае пэўнага адказу дадзена не было, таму на дадзеным этапе яго адклалі [5, с. 85–86].

Тут жа паступіла таксама прапанова ад мінскага губернатара Я.Я. Эрдэлі аб прыняцці ў вядзенне земства справы агранамічнай дапамогі пры землеўладкаванні. Просьба была прынята, аднак пастаноўлена давесці да ведама ўрада, што фінансаванне гэтай арганізацыі і далей неабходна рабіць цалкам за кошт казны, з ускладаннем на земства толькі распараджэння сродкамі, прадназначанымі на яе здзяйсненне.

Прымаючы да ўвагі велізарную важнасць выставачнай справы для паведамлення насельніцтву аб паляпшэнні жывёлагадоўлі і для заахвочвання гаспадарак, удасканальваючых гэтую галіну, пастанавілі вылучыць 1 000 руб. дапамогі ўправе для правядзення сельска-гаспадарчых выставак. У шэрагу запланаваных па земскім асігнаванні былі выстаўка жывёлагадоўлі Мінскага сельска-гаспадарчага таварыства і насенная выстаўка ў сакавіку 1912 г. У цэлым жа дзейнасць земства ў дадзеным напрамку ацэньвалася сучаснікамі па-living рознаму. З аднаго боку, адзначалася, што земства ажывіла жыццё сельскіх гаспадароў у губерні і ўдалае правядзенне падобных мерапрыемстваў з'яўляецца важным кампанентам гэтага, а з іншага ў якасці галоўнага мінуса называлася недатычнасць сялян да іх арганізацыі [86, с. 4; 93, с. 1].

У якасці меры па падрыхтоўцы патрэбных кадраў губернскім земствам прынята рашэнне вылучыць 2 000 руб. па хадайніцтву Пінскага павятовага земства на ўладкаванне пачатковай сельска-гаспадарчай школы ў павеце. Першапачаткова рэалізацыя дадзенага мерапрыемства меркавалася яшчэ па пастановах былога губернскага камітэта ад 12 кастрычніка 1910 г. і першага мінскага надзвычайнага губернскага земскага схода ад 20-23 жніўня 1911 г. [17, с. 84–85].

Улічваючы крайнюю важнасць гэтай галіны гаспадаркі, у каштарыс былі ўнесены сродкі на ўстанаўленне на кожны з дзевяці паветаў па пасадзе майстроў па кормаздабыванні. Разам з гэтым галосныя вырашылі стварыць пры губернскай управе сельска-гаспадарчую асведамленчую камісію ў складзе асоб, камандзіруемых павятовымі сельска-гаспадарчымі дарадчымі органамі з боку тых паветаў, дзе яны сфарміраваны, а таксама з боку іншых паветаў шляхам асобых выбараў галоснымі павятовых земскіх сходаў.

Адначасова прынята рашэнне аб узнаўленні пры губернскай управе пастаяннага дарадчага органа ў выглядзе губернскага сельска-гаспадарчага савета. У савет уваходзілі дзесяць прадстаўнікоў ад губернскага земскага схода, па аднаму ад кожнага павета і адзін ад горада Мінска. Пасяджэнні новаўтворанага органа прызначаліся старшынёй губернскай земскай управы.

Затым прынялі рашэнне аб скліканні агранамічнага персанала губерні на перыядычныя нарады. Колькасць скліканняў абмежавана двума ў год, а колькасць удзельнікаў дзевяццю.

Своеасаблівай адметнасцю земскай дзейнасці стала арганізацыя ў Мінску сельска-гападарчага музея, на фоне росту пазашкольнай сельска-гаспадарчай адукацыі ў Мінскай губерні ў папярэднія два гады. Падштурхнула да гэтага наяўнасць багатага вучэбнага інвентару былых курсаў па жывёлагадоўлі ў Ярэмічах і курсаў па кормаздабыванню, які выкарыстоўваўся толькі ў кароткі тэрмін вучэбных заняткаў, а астатні час года ляжаў без ужывання. Тут жа яго меркавалі згрупіраваць і зрабіць даступным для ўсіх жадаючых. У далейшым планавалася пашырэнне рамак музея і паступлення ў яго новых матэрыялаў.

Яшчэ адной праблемай стаў недахоп папулярнай сельска-гаспадарчай літаратуры ў чыста мясцовым асвятленні (у першую чаргу брашур і плакатаў). Для распрацоўкі такой літаратуры была створана спецыяльная камісія аграномаў губерні, а таксама асігнаваны 1 000 руб. на далейшае яе выданне і падтрымана хадайніцтва ў Дэпартамент земляробства з боку губернатара на асігнаванне 5 000 руб. на гэтыя ж мэты. Пастанавілі таксама стварыць камісію па выданню плакатаў, брашур і інш., з мэтай правядзення агранамічных ведаў у насельніцтва губерні.

У рамках мяркуемых мерапрыемстваў па ўдасканальванні жывёлагадоўлі галоснымі асігнаваны 1 000 руб. і дадзены загад управе падтрымаць хадайніцтва ўрадавага агранома аб адпушчэнні ўрадам дапамогі ў 1 000 руб. на арганізацыю абследавання літоўска-беларускай жывёлы ў губерні, прымаючы велізарнае эканамічнае значэнне ўстанаўлення прыкмет дадзенай пароды для патрэб запланаваных мерапрыемстваў [17, 86-97].

Наступным крокам пры губернскай управе арганізаваны асобы даведачны аддзел для выпіскі разнастайных сельска-гаспадарчых матэрыялаў, роўна як і па агранамічным пытанням увогуле, у мэтах далейшага аб’яднання павятовых земстваў. Разам з гэтым з астаткаў па расходнаму каштарысу створаны грашовы фонд па дапамозе павятовым земствам па сельска-гаспадарчай частцы ў найбольш цяжкіх выпадках.

Прынята таксама прапанова ад Тамбоўскай губернскай земскай управы аб удзеле Мінскага земства ў запланаваным аб’яднанні земстваў на глебе эканамічных мерапрыемстваў. Губернскі земскі сход пастанавіў камандзіраваць са свайго складу аднаго галоснага на дарадча-арганізацыйны з’езд у Тамбове ў тым выпадку, калі такі дазволяць улады.

Першым мерапрыемствам па арганізацыі правядзення пазашкольных сельска-гаспадарчых ведаў у насельніцтва стала вылучэнне сродкаў на цэнтральныя курсы для сялян па цэламу цыклу сельска-гаспадарчых прадметаў і на перасоўныя курсы па асобных галінах гаспадаркі. Прызнаўшы гэтыя крокі

пачынаннем агульнагубернскага значэння, таксама было ўзбуджана хадайніцтва да ўрада аб вылучэнні дадатковых сродкаў. Пры гэтым, калі прывесці статыстыку мінулых гадоў, то колькасць такіх курсаў яшчэ пры былым упраўленні па справах земскай гаспадаркі расло велізарнымі тэмпамі: у 1907 – 21, у 1908 – 59, у 1909 – 199.

Адначасова губернскім земскім сходам была створана спецыяльная камісія для вырашэння пытання аб адкрыцці другой казённай заводскай канюшні ў Мінску, якая б абслугоўвала і Мінскую, і Гродзенскую губерні. Тым не менш, пытанне на дадзеным этапе вырашана не было, таму кожны год земствам вылучалася грашовая субсідыя Віленскай Казённай канюшні.

У той жа час галосныя пастанавілі даць больш шырокую агалоску звесткам аб коле абавязкаў губернскага інструктара па садоўніцтву з тым, каб яго паслугамі маглі ў поўнай меры карыстацца павятовыя земствы. Затым галоснымі было ўзбуджана хадайніцтва перад Дэпартаментам земляробства аб прызначэнні ў губерню інструктара па пчалярству, а таксама чатырох урадавых агентаў па малочнай гаспадарцы: аднаго інструктара і трох майстроў. Пры гэтым асігнаваны грошы на іх поўнае забеспячэнне. У выніку на агранамічныя мерапрыемствы па каштарысе на 1912 г. асігнаваны 39 619 руб. [104, с. 104; 17, с. 93–97].

Другое чарговае пасяджэнне губернскага земскага схода, што адбывалася ў лютым 1913 г., вырашыла пытанне арганізацыі агранамічнай дапамогі насельніцтву ў губерні. Да сферы дзеяння губернскага земства былі аднесены арганізацыя і фінансаванне наступных мерапрыемстваў: 1) абследаванняў усялякага кшталту; 2) доследнай справы ў складзе: доследных станцый, раённых доследных палёў, а таксама калектыўных доследаў; 3) мерапрыемствы па паляпшэнні жывёлагадоўлі, што мелі губернскае значэнне; 3) сельска-гаспадарчай адукацыі і распаўсюджання сельска-гаспадарчых ведаў, маючых губернскае значэнне. Па астатніх мерапрыемствах прызналі неабходным толькі тэхнічнае аб’яднанне губернскага і павятовых земстваў. Такім чынам, губернскі земскі сход гэтай сваёй пастановай цвёрда размежаваў вобласці вядзення губернскай і павятовай земскай аграноміі.

Новым момантам у земскай дзейнасці стала дапамога з 1913 г. мясцовым земляробчым кааператывам. Адгэтуль пачалі ўносіць у каштарыс штогод сумы ў 2 000 руб. У першую чаргу грошы накіроўваліся на перыядычную арганізацыю імі сельска-гаспадарчых выставак [105, с. 104; 5, с. 86, 92].

Што датычылася доследнай справы, то акрамя ўтрымання Мінскай балотнай доследнай станцыі, пакуль губернскае земства абмежавалася выключна субсідаваннем вопытных пачынанняў пад кіраўніцтвам Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі. У прыватнасці, у гэты час былі вылучаны грошы на ўтрыманне Тугановічскага доследнага поля ў Навагрудскім павеце.

У наступныя гады губернскае земства працягнула практыку вылучэння сродкаў на пазашкольную асвету. Адгэтуль цэнтральныя сельска-гаспадарчыя курсы ў Мінску пачалі праводзіцца штогод, а ўдзел у іх за 1913-1914 гг. узялі больш за сотню сялян з розных мясцовасцей губерні і амаль з усіх яе паветаў. Земствам пастаўлена мэта з дапамогай гэтых курсаў паступова стварыць цэлы кадр свядомых сельскіх гаспадароў, якія вярнуўшыся ў свае вёскі, маглі быць вельмі карыснымі земскаму агранамічнаму персаналу пры правядзенні ім на месцах разнастайных пачынанняў.

Паступова абследаванне жывёлы таксама стала паўнацэнным напрамкам дзейнасці губернскага земства. Адразу ж пры губернскай управе было створана бюро абследавання гаспадарчага жыцця. У гэты ж час па пачынанні ўрадавага агранома А.В. Вельямінава пачалося правядзенне параённага жывёлагадоўчага абследавання Мінскай губерні, якое рэалізавана пры сумесным фінансаванні губернскага земства і Дэпартамента земляробства. Вынікам стала асігнаванне сродкаў на мерапрыемствы па паляпшэнні мінскай чырвонай жывёлы так званай літоўска-беларускай пароды, у тым ліку шляхам селекцыі. Падтрымцы гэтага віда адгэтуль нададзены статус агульнагубернскага значэння [5, с. 88-90; 105, с. 104; 91, с. 1–2].

На трэцім чарговым пасяджэнні мінскага губернскага земскага схода 20-28 студзеня 1914 г. па прычыне планамернай арганізацыі доследных устаноў (станцый, палёў і ўчасткаў), узнята пытанне аб неабходнасці папярэдняга натуральна-геаграфічнага абследавання Мінскай губерні, як глебава-геалагічнага, так і кліматычнага. Гэта даследаванне, як меркавалася, дало б магчымасць устанавіць у межах губерні натуральна-гістарычныя і сельска-гаспадарчыя раёны, а ужо потым, узгадніўшыся з гэтымі раёнамі, уладкоўваць тыя ці іншыя доследныя ўстановы.

У выніку з гэтымі мэтамі губернскі сход пастанавіў скласці геалагічны нарыс Мінскай губерні, які палічылі выключна неабходным у якасці падрыхтоўчай меры для пазнейшага глебавага абследавання губерні. Нарыс гэты, па прапанове губернскай управы, выявіў жаданне скласці вядомы расійскі вучоны, доктар мінералогіі і геаграфіі П.А. Туткоўскі, з якім губернская ўправа заключыла адпаведную дамоўленасць.

Затым для больш дакладнага кліматычнага вывучэння Мінскай губерні, пастаноўлена папоўніць дастаткова няпоўную сетку наяўных тады ў губерні метэаралагічных станцый адкрыццём у 1914 г. трох новых станцый II-га разрада I-га класа за земскі кошт (са звычайнай дапамогай ад Дэпартамента земляробства) [5, с. 87–88].

Значная ўвага надавалася далейшаму пашырэнню вогнетрывалага будаўніцтва. Так, у 1914 г. земства пастанавіла адкрыць у Мінскай губерні дзевяць кафляных майстэрняў для вырабу кафлі на пакрыццё будынкаў і

пастанавіла закупіць на 50 000 руб. бляхі для пакрыцця будынкаў. Пры гэтым земскія ўстановы пачалі пазычаць сялянам грошы на гэтыя патрэбы са страхавых капіталаў. Усяго мінскае земства пастанавіла страціць у наступным годзе на вогнетрывалае будаўніцтва 165 373 руб. [87, с. 3; 97, с. 3].

Адначасова губернскай управай было ўзнята пытанне аб глебавым даследаванні губерні. Першапачаткова ўправа праектавала складанне карты ў дзесяціверставым маштабе. Аднак па прычыне выказанага многімі галоснымі жадання мець глебавую карту ў большым маштабе, а менавіта ў трохверставым, з тым, каб карта гэтая магла паслужыць і ацэначным справам. У выніку на справу былі вылучаны 20 000 руб. і столькі ж меркавалася атрымаць ад Дэпартамента земляробства.

Працягнулі ў гэты час грашовую падтрымку Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі ў іх дзейнасці па ўтрыманні доследнага поля ў Туганавічах Навагрудскага павета. Новым момантам стала фінансаванне правядзення калектыўных доследаў з мінеральнымі ўгнаеннямі. На два гэтых мерапрыемствы па каштарысе на 1914 г. былі асігнаваны 4 500 руб. [5, с. 87–88].

Ва ўсю разгарнуліся мерапрыемствы па паляпшэнні жывёлагадоўлі ў губерні. Так пры правядзення адпаведнага параённага абследавання сабраны велізарны матэрыял, частка якога, прысвечаная мясцовай чырвонай жывёле, у гэты час ужо была апрацавана і выдадзена двума асобнымі выпускамі. Астатні ж матэрыял планавалася яшчэ і надалей дапаўняць экспедыцыйным шляхам.

Паралельна з гэтым абследаваннем губернскае земства паступова пачала рэалізацыю серыі іншых мерапрыемстваў. Перш за ўсё, арганізацыю племянных кантрольных саюзаў уладальнікаў чырвонай жывёлы, як памешчыкаў, так і сялян. На 1914 г. такіх саюзаў налічвалася некалькі памешчыцкіх і адзін сялянскі. Затым пачалося ўладкаванне злучных пунктаў сумесна з вытворцамі чырвонай пароды, а таксама правядзенне аднадзённых выставак маладняка і дарослай чырвонай жывёлы. Адна такая выстаўка з вялікім поспехам пачала праходзіць з 1913 г. у Самахвалавічах Мінскага павета, а ў 1914 г. яшчэ і ў Глівене Барысаўскага павета.

У дадатак была запраектавана рэалізацыя завядзення племянных кніг чырвонай жывёлы, племяннога рассадніка, ўладкаванне паказальных двароў жывёлы і арганізацыя малочнай арцелі ў раёне сялянскага кантрольнага саюза. На ўсе вышэй пералічаныя мерапрыемствы губернскім земствам на 1914 г. было вылучана 4 000 руб., на палавінчатых пачатках з Дэпартаментам земляробства.

Разам з тым да крокаў ў гэтым напрамку можна аднесці экспанаванне ў маі 1914 г. мінскім губернскім земствам на юбілейнай выстаўцы жывёлагадоўлі ў Маскве сямі галоў мінскай чырвонай жывёлы, што належалі розным

мясцовым уладальнікам. Выстаўленая жывёла вельмі зацікавіла шырокія колы як заатэхнікаў, так і вялікай публікі, і нават атрымала высокія ўзнагароды (шэсць медалёў) [5, с. 88–89].

Рашэннем чарговага пасяджэння 1914 г. губернскі сельска-гаспадарчы музей, што дзейнічаў з 1912 г., быў рэарганізаваны з музея-склада наглядных дапаможнікаў, выключна якім ён і праектаваўся першапачаткова, у музей-сховішча звычайнага тыпу. Гэтай установе прадказвалі велізарную ролю ў будучыні, як для вывучэння сельска-гаспадарчых умоў Мінскай губерні, так і для азнаямлення з ім зацікаўленай публікі.

У тым ліку да мер па распаўсюджанні сельска-гаспадарчых ведаў у губерні можна аднесці пачатак выдання з 1 красавіка 1914 г. мясцовага земскага перыядычнага органа – «Весніка Мінскага губернскага земства». На старонках яго нумароў заўсёды значная ўвага надзялялася агранамічным мерапрыемствам.

Сюды ж прылічым арганізацыю губернскім земствам пры падтрымцы Дэпартамента земляробства экскурсіі сялян і дробных уладальнікаў за мяжу – у Данію і Швецыю – з мэтай азнаямлення са станам сельскай гаспадаркі ўвогуле, і жывёлагадоўлі ў прыватнасці, у гэтых класічных краінах дробнага землеўладання і высокай сельска-гаспадарчай культуры.

Адным з важнейшых крокаў стала заснаванне пры губернскай управе культур-гідратэхнічнага бюро, якое пачало сваю дзейнасць як чыста камерцыйная ўстанова, з вельмі невялікімі затратамі з боку земства. Валодаючы пасрэдніцкім крэдытам на зямельныя паляпшэнні да 300 000 руб., само губернскае земства ўносіла ў каштарыс па гэтаму артыкулу толькі 1 000 руб. – на выдачу дапамогі для рэалізацыі меліярацыйных работ паказальнага характара на землях незаможнага сельскага насельніцтва. Усе ж іншыя расходы па ўтрыманню бюро: аплата працы спецыялістаў-гідратэхнікаў, іх раз’езды, пакупка неабходных інструментаў і інш. аплачваліся часткова з узнагарод кліентамі бюро па таксе за рэалізацыю пошукаў і складанне праектаў, часткаю – з дапамогі ад аддзела зямельных паляпшэнняў [105, с. 104; 5, с. 90–91]. Такім чынам, пры невялікіх затратах з боку земства, заснавана надзвычай карысная ўстанова, дзейнасць якой па асушэнню і культуры балот, задавальняючы адну з надзённых патрэб Мінскай губерні, пашыралася з кожным месяцам.

У цеснай сувязі з меліярацыйнымі работамі земства знаходзяцца і арганізаваныя ў той час у розных мясцовасцях імперыі меліярацыйныя з’езды, якія пасля некаторага перыяду правядзення на агульнадзяржаўным прынцыпе, пачалі праводзіцца параённа. Так, на першым паўночным меліярацыйным з’ездзе ў Маскве ў кастрычніку 1913 г, па дакладзе Б.Н. Самойленкі, старшыні мінскай губернскай земскай управы, было ўзнята пытанне аб стварэнні асобага раёна – Палескага, для аб’яднання ў адносінах распрацоўкі меліярацыйных

пытанняў пяці палескіх губерняў – Валынскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай.

Прызнаючы надзвычай важным вызначыць межы асобных раёнаў, арганізатары меліярацыйных з'ездаў у Расіі звярнуліся ў мінскую губернскую земскую ўправу з прапановай узбудзіць хадайніцтва аб скліканні першага Палескага меліярацыйнага з'езда ў Мінску ў 1915 г. губернскі сход у 1914 г. на трэцім чарговым пасяджэнні даў сваю санкцыю на дадзенае мерапрыемства і асігнаваў патрэбныя сродкі [5, с. 91–92].

Што датычыцца агранамічных мерапрыемстваў павятовых земстваў, то тут існавалі свае асаблівасці. У цэлым можна адзначыць як агульную разрозненасць дзейнасці ў гэтым напрамку, так і нярэдкую непланамернасць пачынанняў у паветах. Тым не менш, нельга адмаўляць значнага пад'ёма гаспадарчага напрамку за трохгоддзе.

Так, агранамічны персанал к 1914 г., а менавіта аграномы і агранамічныя старасты, ужо меўся ва ўсіх паветах. Пры чым у кожным павеце значылася не менш за два аграномы і два агранамічныя старасты, а ў некаторых нават існавалі асігнаванні на трох аграномаў (Бабруйскім, Барысаўскім і Ігуменскім). У Ігуменскім павеце існавала спецыяльная арганізацыя па вядзенні калектыўных доследаў. Аднак нават такая колькасць персаналу не магла цалкам задаволіць патрэбы губерні. Падобная праблема існавала і ў іншых рэгіёнах краіны.

Першай і асноўнай ячэйкай агранамічнай дапамогі насельніцтву сталі сельска-гаспадарчыя склады, якія былі ўладкавана ва ўсіх дзевяці паветах. На гэтых складах насельніцтву адпускаліся сельска-гаспадарчыя тавары па найбольш танных коштах і лепшай якасці, што мела надзвычай важнае значэнне для губерні.

У мэтах удасканальвання мясцовага земляробства была наладжана шырокая сетка земскіх зернеачышчальных пунктаў і пракатных станцый. Там сяляне за нізкую плату, а ў некаторых выпадках і нават бясплатна, маглі падвяргаць ачыстцы свае звычайна моцна засмечанае насенне, а таксама карыстацца многімі неабходнымі ў гаспадарцы прыладамі. У некаторых паветах к 1914 г. ужо мелася ад чатырох (Мінскі павет) да васьмі (Ігуменскі павет) зернеачышчальных пунктаў і столькі ж пракатных станцый.

Улічваючы мясцовыя асаблівасці губерні, патрэбна адзначыць таксама правядзенне пескаўмацавальных работ, якія вяліся па ўсіх паветах пад кіраўніцтвам асобай урадавай арганізацыі з некаторым працэнтам асігнаванняў і з земскіх сродкаў. Сумы на гэтыя патрэбы па каштарысах 1914 г. вагаліся ад 510 руб. у Мінскім павеце да 2 720 руб. па Бабруйскім [5, с. 94–96].

Такім чынам, гаспадарчая дзейнасць выбарных земскіх органаў Мінскай губерні ў першае трохгоддзе іх існавання аказала станоўчы ўплыў на развіццё

рэгіёна. На губернскім узроўні земствам паспяхова ажыццяўляліся пачынанні па правядзенні сельска-гаспадарчых выставак, паступова пашыраўся штат агранамічнага персанала, праводзіліся абследаванні найбольш каштоўных парод жывёлы, а таксама шырока ўжываліся супрацьпажарныя меры. Паспяховай стала дзейнасць у напрамку распаўсюджвання сельска-гаспадарчых ведаў сярод насельніцтва: арганізоўваліся адукацыйныя курсы для сялян, выдавалася адпаведная літаратура, створаны свой уласны перыядычны орган і ўладкаваны сельска-гаспадарчы музей. Для больш эфектыўнага правядзення агранамічных пераўтварэнняў пад эгідай земства былі праведзены глебава-геалагічнае і кліматычнае абследаванне губерні. Паралельна наладжвалася доследная справа, перш за ўсё, для правядзення ў жыццё меліярацыйных мерапрыемстваў, што набывалі ў той час асаблівы размах. На павятовым жа ўзроўні ва ўсю разгортвалася арганізацыя сельска-гаспадарчых складоў, зернеачышчальных пунктаў і пракатных станцый, якія сталі надзейнай падтрымкай для мясцовага насельніцтва.

## 4.3 Адукацыйныя мерапрыемствы земства

На пачатковым этапе ў выпадку з адукацыяй, як і з іншымі сферамі земскай дзейнасці, узнікла пытанне аб размежаванні абавязкаў паміж губернскім узроўнем і павятовым. Першае надзвычайнае пасяджэння губернскага земскага схода 1911 г., размяркоўваючы земскія капіталы паміж губернскім і павятовымі земствамі, пастанавіла справу народнай адукацыі ў паветах перадаць у вядзенне павятовых земстваў, а справы па расходах, што маюць агульнагубернскае значэнне, пакінуць у губернскім земстве [48, арк. 15 адв.].

Дадзеную акалічнасць асабліва падкрэсліваў губернатар Я.Я. Эрдэлі ў сваім вітальным слове ўжо да паўнацэннага першага чарговага пасяджэння губернскага земскага схода. Адзначыўшы, што справа народнай адукацыі адгэтуль пераходзіць у рукі павятовых земстваў, выказаў думку аб неабходнасці губернскаму земскаму сходу заняцца менавіта пазашкольнай адукацыяй [17, с. 2].

Першым перад сходам паўстала пытанне аб магчымым пераўтварэнні Магілёўскіх цэнтральных фельчарскай і спавівальнай школ у адну фельчарска-акушэрскую школу. Улічваючы выключнае значэнне гэтых устаноў у падрыхтоўцы кадраў для Мінскай губерні, галосныя пастанавілі асігнаваць сродкі Магілёўскаму земству на іх ўтрыманне, але з агаворкай, што спыняць субсідыі ў выпадку пабудовы сваёй уласнай Мінскай гарадской фельчарскай школы.

Паколькі падобныя пытанні ў часы дзеяння Упраўлення па справах земскай гаспадаркі вырашаліся выключна на губернскім ўзроўні, сходам атрымана просьба аб зацвярджэнні пастановы пінскага павятовага схода адносна хадайніцтва ў Міністэрства народнай асветы аб выдачы пазыкі 45 120 руб. на пабудову школьных будынкаў. Безумоўна, пастанову зацвердзілі, аднак было адзначана, што цяпер такія справы павінны вырашацца напрамую, без удзела губернскага земскага схода [17, с. 10; 85, с. 3].

Актуальнай праблемай таго часу ўсё яшчэ заставаўся недахоп педагагічных кадраў. У сувязі з гэтым губернскай земскай управе было даручана прадставіць к наступнаму чарговаму губернскаму земскаму сходу праект стварэння настаўніцкай семінарыі ў губерні, а таксама вызначыць месца яе знаходжання. Тут жа сход вырашыў праблему з ніжэйшай рамеснай школай ў Нягневічах, на якую яшчэ ў 1904 г. былі выдадзены 5 000 руб. Вылучаныя сродкі, што знаходзіліся ў дэпазіце Дырэкцыі народных вучылішчаў Мінскай губерні, пастанавілі перадаць Навагрудскаму павятоваму земству.

Важнай часткай асігнаванняў губернскага земства стала ўтрыманне Ракаўскай рамеснай школы, якая знаходзілася ў поўным яго вядзенні. Па каштарысе на 1912 г. на дзейнасць школы былі вылучаны 10 241 руб. У той жа час сходам асігнаваны сродкі на дапамогу Мінскаму вучылішчу сляпых, Мінскім жаночым педагагічным курсам, а таксама Мінскаму археалагічнаму таварыству. Затым былі дадзены сродкі ў распараджэнне Слуцкай павятовай управы для выдачы па яе выбару дапамогі бяднейшым вучням Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі і вылучаны грошы на ўтрыманне выхаванцаў імя Ваньковічаў [17, с. 24-104].

У цэлым, у наступныя гады асігнаванні, прынятыя першым чарговым губернскім земскім сходам на адукацыйныя мерапрыемствы, працягнуліся. Тым не менш, у дадатак у 1913 г. земствам была аказана фінансавая дапамога Таварыству ўзаемадапамогі вучням і настаўнікам у Мінскай губерні і праведзены рамонтныя работы ў будынках Ракаўскай рамеснай школы [105, с. 98–111].

Такім чынам, пасля перадачы ўсіх спраў народнай адукацыі ў вядзенне павятовых земстваў, за губернскім земствам у гэтай вобласці засталася толькі пасіўная роля, і толькі на трэцім чарговым пасяджэнні губернскі земскі сход, па пастанове ад 22 студзеня 1914 г. прызнаў неабходным прыняць удзел у развіцці ў губерні пачатковай народнай адукацыі. Прычым для выпрацоўкі мерапрыемстваў, якія павінны быць рэалізаваны губернскім земствам, і напрамкі работ у гэтых адносінах, створана пры губернскай управе спецыяльная школьная камісія з прадстаўнікоў губернскага і павятовых земстваў.

У цэлым мерапрыемствы губернскага земства к 1914 г. абмяжоўваліся кіраваннем і ўтрыманнем Ракаўскай ніжэйшай рамеснай школы і субсідаваннем некаторых асветных устаноў, галоўным чынам дзейнасць якіх была накіравана на падрыхтоўку педагагічнага персанала для пачатковых школ губерні.

З той жа мэтай у 1914 г. губернскі земскі сход пацвердзіў пастанову былога губернскага камітэта па справах земскай гаспадаркі аб адкрыцці жаночай настаўніцкай семінарыі ў Бабруйску, асігнаваў дапамогу на адкрыццё такой жа семінарыі ў Барысаве і пастанавіў узбудзіць хадайніцтва аб адкрыцці настаўніцкай семінарыі ў Лунінцы Пінскага павета, у гонар 300-годдзя царавання дома Раманавых. Меркавалася, што рэалізацыя гэтых мерапрыемстваў адбудзецца ў бліжэйшы час.

Адначасова трэці чарговы губернскі земскі сход, зыходзячы з таго, што шматлікія ніжэйшыя вучэбныя ўстановы губерні маюць патрэбу ў вопытным выкладчыцкім персанале, прызнала пажаданым адкрыццё ў Мінску настаўніцкага інстытута і асігнавала ў дапамогу ўраду на яго адкрыццё з земскіх сродкаў 5 000 руб. У цэлым жа расходы на народную адукацыю са сродкаў губернскага земства склалі: у 1912 г. – 14 621 руб., у 1913 – 20 885 руб. і ў 1914 – 21 437 руб., а ўсяго за трохгоддзе – 56 943 руб.

Паколькі пытанні сельскай гаспадаркі і меліярацыя, як ужо адзначалася вышэй, вылучаліся ў той час на першы план. У такіх умовах земства не магло не звярнуць увагі на неабходнасць практычнага ўжывання ў губерні навейшых навуковых метадаў і апошніх даных навукі ў вобласці сельскай гаспадаркі і меліярацыі. Неабходнасць стварэння шматлікіх кадраў добра падрыхтаваных дзеячаў, што маглі б пры дапамозе ўрада і земства дасягнуць карэннага змянення умоў сельска-гаспадарчага жыцця края, высвятлілася ўжо даўно. Менавіта таму ў земскіх колах узнікла думка аб адкрыцці ў Мінску вышэйшай сельска-гаспадарчай адукацыйнай установы.

Другі чарговы губернскі земскі сход у лютым 1913 г. пры разглядзе пытання аб святкаванні 300-годдзя царавання Раманавы прызнаў найлепшым ушанаваннем гэтай падзеі менавіта адкрыццё такой установы. У выніку была абрана асобая камісія на чале з галосным В.А. Кадыгробавым, якой даручылі распрацаваць к трэцяму чарговаму сходу пытанне аб адкрыцці ў Мінску сельска-гаспадарчага інстытута.

У сваю чаргу на трэцім чарговым пасяджэнні галосныя пастанавілі ўзбудзіць перад урадам хадайніцтва аб адкрыцці ў Мінску сельска-гаспадарчага інстытута і асігнаваць у выпадку яго задавальнення 100 000 руб. з земскіх сродкаў у дапамогу ўраду на ўладкаванне азначанай вучэбнай установы. Пры гэтым Мінскай гарадской управай пад будучы інстытут ужо быў адведзены зямельны ўчастак, а таксама выказана гатоўнасць забрукаваць туды пад’езды і правесці электрычнасць і трамвай. У выніку хадайніцтва земства было

падтрымана Дзяржаўнай думай, якая перадала праект ў сельска-гаспадарчае ведамства [5, с. 29–31; 94, с. 3].

Паралельна, улічваючы крайнюю патрэбу рэгіёна ў хутчэйшай падрыхтоўцы дастатковай колькасці ніжэйшага персаналу па культуры балот і лугоў, у губерні было пастаўлена пытанне аб стварэнні адпаведнай навучальнай установы. З гэтай нагоды мінская губернская земская ўправа прадставіла ў Дэпартамент земляробства асобы даклад. У выніку спецыяльную школу культур-тэхнікаў вырашылі адкрыць у Мінску на адведзеным Мінскай гарадской думай участку зямлі, а летнія заняткі вучняў праводзіць па ўсёй тэрыторыі губерні.

Для прыцягнення суседніх земстваў да ўдзела ў арганізацыі школы, губернская земская управа звярнулася да Валынскага, Віцебскага, Магілёўскага, Смаленскага і Чарнігаўскага земстваў з просьбай на бліжэйшых пасяджэннях абмеркаваць пытанне аб магчымым вылучэнні сродкаў на пабудову і ўтрыманне ўстановы. Чарнігаўскі і Віцебскі губернскі земскія сходы асігнавалі грашовую дапамогу, а таксама стварылі пры школе шэраг стыпендый для сваіх жыхароў.

Удзел жа Мінскага земства ва ўладкаванні школы замацаваны пастановай губернскага земскага схода ад 10 лютага 1913 г. Былі вылучаны 10 000 руб. на яе тэхнічнае абсталяванне, а на ўтрыманне ўстанавілі штогод даваць па 3 000 руб., ці 1/8 частку ад усіх расходаў. Адкрыццё ўстановы арыенціровачна запланавалі на восень 1914 г. [5, с. 30–31].

Шырокі маштаб прынялі адукацыйныя мерапрыемствы, што праводзілся на павятовым узроўні. У аснову дзейнасці павятовых земстваў у вобласці народнай асветы легла выкананне, з 1 студзеня 1910 г., прынятага былым губернскім камітэтам па справах земскай гаспадаркі, па пастанове 30 верасня 1909 г., папавятовага плана школьнай сеткі. Згодна з планам, у губерні меркавалася адкрыць на працягу пятнаццаці гадоў, з 1910 па 1924 гг., 2 040 новых земскіх школ і 1 080 другіх камплектаў пры існуючых школах, а штогод па 136 і 72 школ адпаведна.

Выкананне плана школьнай сеткі ў 1910-1914 гг. рэалізоўвалася ў поўным аб'ёме, за выключэннем Пінскага павета, дзе адхіленне ад гэтага плана зведзена да таго, што з 1913 г. з дазвола Міністэрства народнай асветы, пінскае земства адкрывае замест 31 – 11 школьных камплектаў, прыводзячы такім чынам здзяйсненне акрэсленага плана ў адпаведнасць з плацежнымі сіламі насельніцтва павета. Аб неабходнасці змянення фінансавага плана па здзяйсненню ўсеагульнага навучання ўпершыню заявіў пінскі павятовы прадвадзіцель дваранства І.А. Папа-Афонасопула, які прадставіў на першым чарговым пасяджэнні губернскага земскага схода з гэтай нагоды даклад. Акрамя вышэй згаданых змен у плане школьнай сеткі, таксама бабруйскае

земства прыняло ў сваё вядзенне 12, Мазырскае – 6, Навагрудскае – 36 і Рэчыцкае – 38 існуючых у павеце школ Міністэрства народнай асветы [5, с. 21–22; 17, с. 111].

У цэлым жа расходы на ўтрыманне школ склалі: у 1912 г. – 620 693 руб., у 1913 г. – 827 770 руб. і ў 1914 г. – 1 024 546 руб. Пры гэтым, што датычна мільённага асігнавання 1914 г., сродкі земства тут склалі 389 688 руб. ці 38%, а са сродкаў казны – 619 032 руб. ці 59% ад агульнага расхода. Традыцыйны ж удзел сялянскіх таварыстваў у расходах на адукацыю паступова спыняецца і толькі па Бабруйскаму і Слуцкаму паветах яшчэ ад іх паступала грашовая дапамога [5, с. 24].

У той жа час забеспячэнне вучылішчаў уласнымі будынкамі ажыццяўлялася непланамерна амаль усімі паветамі, і асігнаванні на гэты прадмет рабіліся ў такіх памерах, якіх дазвалялі мясцовыя сродкі. Пры гэтым пабудовы рабіліся ў тых пунктах, дзе мясцовыя сялянскія таварыствы прыходзілі на дапамогу земству вылучэннем са сваіх сродкаў дапамогі альбо ж дзе зусім нельга была знайсці наёмнага памяшкання. Выключэнне ў гэтых адносінах склалася толькі ў Пінскім і Рэчыцкім паветах.

Пінскае павятовае земства ў 1912 г. пастанавіла пабудаваць будынкі для існуючых ў той час у наёмных памяшканнях 45 школ, прычым пабудову меркавалася ажыццявіць на працягу 5 гадоў, узводзячы такім чынам 9 школьных будынкаў штогод. На рэалізацыю гэтага плана школьнага будаўніцтва земства асігнавала штогод са сваіх сродкаў 6 016 руб. і брала са сродкаў казны беззваротнай дапамогі 15 040 руб. і пазыкі – 9 030 руб.

Рэчыцкі павятовы земскі сход на пасяджэнні ад 8 лістапада 1913 г. прыняў выпрацаваны павятовай управай сумесна з павятовым вучылішчным саветам план школьнага будаўніцтва. Згодна з планам меркавалася пабудаваць для існуючых і мяркуемых к адкрыццю, адпаведна плану школьнай сеткі, па 1924 г. 123 будынкі, ажыццявіць іх пабудову на працягу 10 гадоў, пачынаючы з 1914 г. На пабудову гэтых будынкаў вылучана 480 000 руб., з іх 96 000 руб. са сродкаў земства, 144 000 руб пазыкі і 240 000 руб. беззваротнай дапамогі са школьна-будаўнічага фонда Міністэрства народнай асветы. Усяго ж за трохгадовы перыяд па дзевяці паветах Мінскай губерні расход на школьнае будаўніцтва склаў 701 620 руб. З земскіх сродкаў дадзена 50,5% ад гэтай сумы, казны – 45,9% і іншых крыніц – 3,4%.

Працягвала існаваць праблема царкоўна-прыхадскіх школ і іх месца ў народнай асвеце. Яшчэ папярэдняе выбарнаму земству ўпраўленне па справах земскай гаспадаркі пачало паступовае скарачэнне расходаў на царкоўна-прыхадскую адукацыю ў губерні. На дадзеным жа этапе ўдзел земстваў ва ўтрыманні такіх школ заключаўся толькі ў выдачы са сваіх сродкаў у распараджэнне Епархіяльнага ведамства дапамогі, прычым памер апошняй у

перыяд першага трохгоддзя існавання земства складаў: у 1912 г. – 70 674 руб., 1913 – 62 868 руб., 1914 г. – 69 732 руб. [37, арк. 47 адв.; 5, с. 24–26].

Асабліва трэба адзначыць дзейнасць у развіцці пачатковай адукацыі Навагрудскага павятовага земства як самага актыўнага ў губерні. Тое ж можна сказаць і пра Мінскі павет. Так, у 1912 г. з мэтай павышэння якасці адукацыі мінская павятовая земская ўправа разаслала настаўнікам анкетныя лісты з пытаннямі, просячы адказаць на іх «з поўным даверам і шчырасцю». Адна частка была прысвечана матэрыяльнаму стану школы і асаблівасцям вучняў. Далей ішлі пытанні аб самім настаўніку і яго стаўленні да абранай прафесіі [86, с. 4; 92, с. 4].

Акрамя забеспячэння насельніцтва пачатковай адукацыяй, павятовыя земствы таксама імкнуліся развіць прафесійную адукацыю, для чаго адкрыла 2 школы і 18 рамесных аддзяленняў. Хоць гэта далёка не вычэрпвала патрэбы насельніцтва ў названай адукацыі, аднак пачынанні ў гэтым напрамку ўжо спыняць у далейшы час пры наяўнасці сродкаў не планавалася. Разам з тым земствы неслі расходы на субсідаванне казённых і прыватных асветных устаноў, на арганізацыю пазашкольнай адукацыі і ўдзельнічалі ў многіх іншых мерапрыемствах па народнай адукацыі.

У 1911 г. ў гэтай частцы народнай адукацыі расход склаў усяго 7 340 руб., з іх: 7 040 руб. на ўтрыманне рамесных аддзяленняў ў Бабруйскім, Пінскім, Рэчыцкім і Слуцкім паветах, а астатнія 300 руб. – на настаўніцкія і школьныя бібліятэкі ў Мінскім, Навагрудскім і Пінскім паветах. Увогуле ж расходы земстваў на мерапрыемствы па народнай адукацыі, акрамя пачатковай адукацыі, у трохгоддзе 1912-1914 гг. склалі 160 580 руб.

Што датычыцца расходаў павятовых земстваў на народную асвету ў цэлым, то гэтая сфера стала адной з галоўных галін земскай гаспадаркі, на якую вылучаліся велізарныя сродкі. Усяго расход у 1914 г. склаў 1 554 816 руб. ці 36% усяго бюджэта земства. З гэтай сумы на долю земскіх сродкаў прыходзілася 753 037 руб. (48,4%), казны – 775 332 руб. (49,8%) і сялянскіх таварыстваў – 26 447 руб. (1,6%). У момант жа ўвядзення выбарных земскіх устаноў у 1911 г. расход на народную асвету складаў усяго толькі 15% [5, с. 26–27].

У якасці галоўнага мінуса земскай дзейнасці па распаўсюджванні народнай асветы на старонках тагачаснай перыёдыкі адзначалася непрыхільнасць новых земстваў да беларускай мовы і культуры, у адрозненні, напрыклад, ад украінскіх земстваў. Так у Валынскай губерні яшчэ ў часы існавання ўпраўлення па справах земскай гаспадаркі земцы пачалі выдаваць сваю газету і стасавацца з сялянамі выключна на ўкраінскай мове [84, с. 2–3; 83, с. 578].

З новымі рэаліямі прыйшлося сутыкнуцца пасля пачатку Першай сусветнай вайны. Так, земскія ўстановы Мінскай губерні ў лістападзе 1914 г. хадайнічалі перад Міністэрствам асветы аб дапамозе на пашырэнне пачатковага навучання, з мэтай як мага хутчэй перайсці на ўсеагульнае. Аднак земства атрымала катэгарычны адказ, з тлумачэннем, што па прычыне ваеннага часу ніякай фінансавай дапамогі, акрамя той, якая дагэтуль выдадзена, міністэрства даць не мае магчымасці [98, с. 4].

Такім чынам, мерапрыемствы земскіх устаноў губерні па пашырэнні народнай асветы сталі адным з вядучых напрамкаў іх дзейнасці, складаючы значны працэнт земскага бюджэту. Асноўныя сілы кінуты на паступовую арганізацыю ўсеагульнага пачатковага навучання, абавязкі па рэалізацыі якога леглі на павятовыя земствы. Да галоўнай заслугі губернскага земства можна аднесці пашырэнне сеткі тэхнічных устаноў, актуальнасць якіх ва ўмовах кардынальных агранамічных пераўтварэнняў узрасла, як ніколі. Сапраўдным прарывам у тых умовах была падрыхтоўка глебы да адкрыцця ў губернскім цэнтры вышэйшай адукацыйнай установы – настаўніцкага інстытута. Традыцыйнай мерай была актыўная падтрымка навуковых і дабрачынных асветных арганізацый. Пры гэтым вялікую ролю земскія ўстановы адыгралі і ў змяншэнні ўплыву царкоўна-прыхадскога навучання і зацвярджэнні іміджу свецкай адукацыі, як найбольш якаснай.

## 4.4 Асноўныя аспекты дзейнасці ў сферы аховы здароўя

Земскія ўстановы, уведзеныя на беларускіх землях у 1911 г., атрымалі медыцынскае ўладкаванне ад былых губернскіх камітэтаў далёка не ў такім выглядзе, як цэнтральныя земствы ў 34 губернях у 1864 г. Апошнія атрымалі ад прыказаў грамадскага догляду толькі губернскія і павятовыя бальніцы. Асноўная маса сельскага насельніцтва, асабліва прыгонныя сяляне, не мелі ніякай урачэбнай дапамогі. Для сялян Ведамства дзяржаўных маёмасцей і ўдзелаў мелася даволі прымітыўная медыцынская арганізацыя ў выглядзе валасных фельчараў.

Зусім у іншым стане была медыцына ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях к 1911 г. У гэтых губернях сельская медыцына была ўведзена ў 1887 г. Недахопы сельскай медыцыны заключаліся ў яе нязначнасці і крайняй абмежаванасці ў сродках, якія вылучаліся на яе ўладкаванне. Прынцып яе пабудовы быў узяты з цэнтральных земскіх губерняў.

З увядзеннем у 1903 г. упраўленняў па справах земскай гаспадаркі пытанне аб сродках адпала. Новымі ўстановамі была распачата актыўная дзейнасць па пашырэнні сферы аховы здароўя ў губернях. На працягу васьмі гадоў іх існавання праароблена значная работа ў гэтым напрамку. У выніку

выбарныя земскія ўстановы ў 1911 г. засталі ўжо гатовую медыцынскую арганізацыю, цесна звязаную з мясцовым насельніцтвам [5, с. 32–33].

Ужо на першым пасяджэнні мінскага губернскага земскага схода 1911 г. былі акрэслены асноўныя напрамкі дзейнасці ў сферы аховы здароўя. У першую чаргу, рэагуючы на шматлікія звароты ад насельніцтва, земства пацвердзіла свае абавязацельствы па выдачы грашовай дапамогі сямействам земскіх урачоў, загінулых ад заразных хвароб, у тым ліку падчас эпідэмій. Спасылаліся ў гэтым пытанні на ўжо існуючую пастанову такога тыпа, якая прынята былым губернскім камітэтам 11 кастрычніка 1910 г. Разам з тым асобна зацверджана пастанова аб забеспячэнні сямей медыцынскага і службовага персанала земскай Пастэраўскай станцыі на выпадак смерці яе супрацоўнікаў ад шаленства. Прызначаліся ад земства былому медыцынскаму персаналу таксама і пенсіі [17, с. 16-17, 101, 103].

Асобным артыкулам расходаў па каштарысе на 1912 г. прыняты выплаты немаёмным жыхарам з паветаў, якія прыбывалі ў Мінск для атрымання медыцынскай дапамогі, а менавіта: 1) у пошуку месц у багадзельні; 2) для паступлення на лячэнне ў бальніцы, аднак не маглі быць прыняты ў іх па прычыне перапоўненасці. На ўзнятае на пасяджэнні пытанне аб тым, каго лічыць гарадскім жыхаром, а каго павятовым, вырашылі пакласці ў аснову прынцып месца жыхарства. Пры гэтым гарадскім жыхаром лічыць кожнага, чый пашпарт прапісаны ў горадзе. У адказ жа на ўзрастанне нагрузкі на губернскую земскую бальніцу, з 1 мая 1912 пастанавілі пачаць браць грошы з горада Мінска і паветаў за лячэнне іх хворых.

Важным крокам у справе больш эфектыўнай арганізацыі медыцыны ў губерні стала стварэнне санітарна-эпідэміялагічнай часці пры губернскай земскай управе. Адначасова губернскі земскі сход прыняў прынцыповае рашэнне накіроўваць на навуковыя камандзіроўкі ўрачоў з ліку ўсіх, што лічыліся на земскай службе ў Мінскай губерні. Напрыклад, адразу ж былі вылучаны сродкі на камандзіраванне губернскага земскага ўрача і прадстаўнікоў земства на Усерасійскую выстаўку па ахове здароўя, а таксама на скліканне губернскага з’езда ўрачоў (1-га схода Урачэбнага савета) [17, с. 43-68].

Наступным крокам сходам была створана камісія па рэарганізацыі губернскай земскай бальніцы на чале з Н.І. Дзямідавым. Прычынай гэтаму выступіў даклад управы, з якога высветлілася, што саматычнае аддзяленне бальніцы мела толькі мясцовае значэнне для Мінска і суседняга павета. Разам з тым, расход на яго ўтрыманне (звыш 85 000 руб.) паглынаў каля трэці медыцынскага губернскага бюджэту. Аднак з-за слабай пастаноўкі ва ўчастковых бальніцах некаторых спецыяльных аддзелаў медыцыны, напрыклад, хірургічнага, вокавага, гінекалагічнага, на пасяджэнні ўстрымаліся

ад закрыцця саматычнага аддзялення. Замест гэтага прапаноўвалася яго рэарганізацыя. Адначасова сходам пацверджана рашэнне губернскага камітэта аб закрыцці амбулаторыі, а таксама пастаноўлена закрыць заразнае аддзялення губернскай земскай бальніцы на працягу 1912 г. [17, с. 71; 5, с. 61–62; 85, с. 3].

Губернскае земства працягнула фінансаванне вядучых медыцынскіх устаноў рэгіёна. Так на ўтрыманне губернскай земскай бальніцы асігнаваны 129 461 руб. 40 кап., Нова-Барысаўскай земскай багадзельні – 17 167 руб. 50 кап. і Азарычскай міжпавятовай бальніцы – 8 365 руб. Затым 21 000 руб. на ўтрыманне псіхічнахворых ураджэнцаў Мінскай губерні ў Віленскай акружной лячэбніцы. Затым губернскім земскім сходам быў зацверджаны каштарыс па ўтрыманні земскай Пастэраўскай станцыі, а таксама выплачаны доўг за лячэнне ў папярэднія гады ў віленскай і кіеўскай Пастэраўскіх станцыях пакусаных шалёнымі жывёламі жыхароў Мінскай губерні [17, с. 43, 59-66; 85, с. 3].

Узнікла пытанне аб тым, у чыім вядзенні застанецца надалей Мінская яўрэйская бальніца. У выніку была пакінута ў вядзенні земства толькі псіхіятрычнае аддзяленне бальніцы, так як па факту яно з’яўлялася самастойнай ўстановай, якая ўтрымлівалася з каробачных сум і мела асобныя каштарыс і справаздачнасць. Апошнія зацвярджаліся губернскай земскай управай [17, с. 21–22].

У якасці меры па падрыхтоўцы спецыялістаў для работы ў губерні, акрамя ўжо згаданага вышэй асігнавання на ўтрыманне Магілёўскіх цэнтральных фельчарскай і спавівальнай школ, былі вылучаны таксама грошы на першапачатковае ўладкаванне выпускнікоў гэтых ўстаноў, што з’яўляліся стыпендыятамі мінскага губернскага земства [17, с. 61; 85, с. 3].

Наступным крокам асігнаваны сродкі на рамонтныя работы пры міжпавятовай Азарычскай бальніцы і губернскай земскай бальніцы, у тым ліку на электрычную вентыляцыю ў псіхіятрычным аддзяленні апошняй. Акрамя таго, дадзены грошы на пабудову новага будынка псіхіятрычнага аддзялення Мінскай яўрэйскай бальніцы, а таксама заразных баракаў у Пінску і пры Карэлічскай земскай бальніцы. Удзел на пачатковым этапе быў узяты і ў пашырэнні бальнічнай сеткі ў паветах. У 1911 г. губернскае земства выдала на пабудову бальніц 7 000 руб. Пінскаму і 10 000 руб. Ігуменскаму земствам.

У той жа час аказана грашовая падтрымка такім установам, як Мінская абшчына сёстраў міласэрнасці Чырвонага крыжа (на ўтрыманне карэты хуткай дапамогі) і Мінскі гарадскі радзільны прытулак. Пры гэтым наконт апошняга асігнавання ўзніклі бурныя спрэчкі: галоўным аргументам за зніжэнне сумы сталі меркаванні аб тым, што што карыстаюцца прытулкам ў асноўным Мінск і Мінскі павет. Дапамога таксама дадзена Гомельскай вокавай лячэбніцы, так як яе паслугамі традыцыйна актыўна карысталася насельніцтва паўднёвых паветаў. Тут жа падчас абмеркаванняў цікавае меркаванне наконт асаблівасцей

зносін з паветамі выказаў галосны айцец А. Кіркевіч, які заявіў, што «ўсе даброты, што ідуць ад губернскага земства, падаюць на паўночныя паветы, а паўднёвыя, якія плацяць столькі ж, нічым не карыстаюцца». Такім чынам, па параграфу земскага каштарыса на 1912 г., прысвечанаму медыцынскай частцы, прынята сума 215 323 руб. 51 кап. [17, с. 65–106].

Далей, на працягу трохгоддзя, асноўная маса акрэсленых вышэй асігнаванняў была замацавана. Тым не менш, можна адзначыць такія меры 1913 г. як вылучэнне грошай Праўленню Таварыства рускіх ўрачоў на ўтрыманне дома імя Пірагова, рамонт памяшкання земскай Пастэраўскай станцыі, а таксама скліканне схода губернскага Урачэбна-санітарнага савета, што стабільна пачалі адбывацца раз у год. У гэты ж час значна ўзраслі расходы па папярэджанні і спыненні эпідэмічных хвароб. Нават адбыўся перарасход сродкаў на гэтыя мерапрыемствы па прычыне эпідэміі тыфа [105, с. 100–111].

Аднак асабліва востра стаяла пытанне аб рэарганізацыі губернскай земскай бальніцы, вядучай установы. Другі губернскі земскі сход у 1913 г. пры абмеркаванні медыцынскага каштарыса спыніў сваю ўвагу галоўным чынам на саматычных аддзяленнях губернскай бальніцы. Камісія, абраная першым сходам па пытанні аб рэарганізацыі бальніцы, сабрала вялікі матэрыял, які ўсебакова асвятляў пытанне, і прадставіла свае даклады, з якіх стала бачна, што сама камісія не прыйшла да аднаго дакладнага заключэння. Земскі сход пасля працяглага абмеркавання пытання схіліўся да таго, што прызнаў неабходным паступова скарачаць памеры саматычнага аддзялення і за кошт гэтага скарачэння пашырыць псіхіятрычную дапамогу. Згодна з такім рашэннем, управу ўпаўнаважылі памяшканне закрываемага заразнага аддзялення прыстасаваць пад аддзяленне для псіхічнахворых. Затым, адпаведна папярэдняму прынцыпу, сход пастанавіў зачыніць сіфілітычнае аддзяленне з 1 ліпеня 1913 г. Аднак гэта пастанова была апратэставана губернскай прысутнасцю і не была выканана губернскай управай.

Па пытанні аб сродках на ўтрыманне губернскай бальніцы другі земскі сход пагадзіўся з дакладам камісіі і прыняў наступнае рашэнне: 1) утрыманне і лячэнне хворых ў саматычным аддзяленні губернскай бальніцы ўскладвалася ў абавязак тых павятовых земстваў і горада Мінска, адкуль хворыя паступаюць па свайму месцу жыхарства; 2) месцам жыхарства хворага лічыць той павет ці горад Мінск, у якіх хворы пражыў не менш за тры месяцы да паступлення ў бальніцу; 3) утрыманне і лячэнне псіхічнахворых складае абавязак губернскага земства; 4) штат ложкаў у саматычным аддзяленні замацаваны ў колькасці 140, псіхіятрычнага аддзялення – 220, а аддзялення для хронікаў – 40.

На медыцынскую частку другім губернскім земскім сходам усяго было асігнавана 214 000 руб. Прычым асігнаванне на санітарна-эпідэмічныя

мерапрыемствы было павялічана на 1 500 руб і была ўведзена пасада трэцяга эпідэмічнага фельчара.

Перад трэцім губернскім земскім сходам 1914 г. паўстала пытанне аб пашырэнні псіхіятрычнай дапамогі і ўвогуле рэарганізацыі гэтай справы, нездавальняючы стан якога прызнаваўся яшчэ былым упраўленнем па справах земскай гаспадаркі. Пытанне ўключала ў сябе два ключавыя моманты: 1) лячэнне вострых псіхічнахворых; 2) догляд за хранічна невылечнымі. Для вырашэння першай часткі пастанавілі ўладкаваць у кожным павеце па адной невялікай бальніцы на 15-20 ложкаў. Праблема ж догляду за невылечна хворымі, як палічылі, не патрабавала такой цэнтралізацыі, а таму дастаткова ўладкаваць дзве лячэбніцы, прыкладна на 1 000 хворых на ўсю губерню.

У выніку ўвесь медыцынскі каштарыс губернскага земства на 1914 г. склала 250 000 руб. Такім чынам, на працягу трох гадоў дзейнасці земства, асігнаванні стаялі прыкладна на адным узроўні. Медыцынскі персанал губернскага земства не павялічыўся, хоць і былі створаны новыя пасады (намеснік загадчыка Пастэраўскай станцыяй і тры эпідэмічныя фельчары), але з закрыццём заразнага аддзялення выйшаў за штат увесь яго склад. Натуральна, што пры тэндэнцыі губернскага земства скарачаць саматычнае аддзяленне губернскай бальніцы, аб'ём работы яго таксама не мог значна павялічыцца. Што ж датычыцца Пастэраўскай станцыі, то маштабы яе дзейнасці з года ў год толькі павялічваліся. К 1914 г. на ёй ўжо лячыліся, акрамя жыхароў губерні, яшчэ воінскія чыны Віленскай ваеннай акругі і служачыя Аляксандраўскай і Лібава-Роменскай чыгунак.

Асобным чынам адзначым дзейнасць урачэбна-эпідэмічнага аддзела губернскай управы, які прымаў актыўны удзел у барацьбе з эпідэміямі. Удзел гэты праяўляўся ў пасылцы свайго пастаяннага эпідэмічнага персаналу ў месцы з найбольшым размахам эпідэмій, у запрашэнні вольнапрактыкуючых урачоў, студэнтаў, фельдшараў, сёстраў міласэрнасці, у найме памяшканняў пад баракі, у здзяйсненні дэзінфекцыі, у забеспячэнні участковага персаналу сываратками, вакцынамі і г.д. Так, у 1912 г. сываратак і вакцын было разаслана на 1 500 руб., а ў 1913 г. больш, чым на 3 000 руб. На запрашэнне часовага медыцынскага персаналу ў 1912 г. было зрасходавана звыш 4 100 руб., а ў 1913 г. – каля 6 500 руб.

Акрамя гэтага, урачэбна-эпідэмічны аддзел займаўся апрацоўкай матэрыяла, які атрымліваў ад участковых урачоў. Аддзелам складзены самыя падрабязныя справаздачы па Мінскай губерні за 1911 і 1912 гг., якія дазваляюць скласці дакладную карціну дзейнасці земстваў у сферы аховы здароўя [5, с. 63–66].

У той жа час яшчэ адным земскім пачынаннем стала барацьба з п'янствам. Так у 1914 г. у Мінску была праведзена нарада, прысвечаная

прабламе пашырэння ўжывання алкаголя сярод сельскага насельніцтва. На пасяджэнні прызналі, што існуе патрэба прыцягнуць на дапамогу мясцовае самакіраванне – земскае, гарадское і валасное. Існавала нават прапанова аб тым, каб працэнт ад выручкі за продаж гарэлкі ішоў земствам на рэалізацыю мерапрыемстваў па змаганні з п’янствам [96, с. 3].

Што датычыцца расходаў павятовых земстваў на ахову здароўя, то тут к 1914 г. сумы затрат склалі 912 000 руб. Для параўнання ў 1911 г. на гэтыя патрэбы ў паветах асігнавана толькі 533 000 руб., што было на 40% менш. Пры гэтым колькасць лячэбных устаноў за першае трохгоддзе дзейнасці земстваў узрос з 49 да 66, ці на 33%, а лік земскіх урачоў – з 57 да 81 [5, с. 59].

Тым не менш, пры ўсім аб’ёме пачынанняў у медыцынскай сферы, да дасканалай сістэмы было яшчэ далёка. Вельмі часта значную тэрыторыю мог абслугоўваць толькі адзін земскі шпіталь, з невялікім персаналам, якому прыходзілася прымаць штодзень сотні хворых. Безумоўна, ні аб якой якасці абслугоўвання тут казаць не прыходзілася. Падвяргалася крытыцы таксама земская дзейнасць па барацьбе з эпідэміямі. На фоне ўрэзаных асігнаванняў на гэтыя патрэбы ў 1913 г., у губерні ва ўсю разгарнуліся эпідэміі тыфа і дызентэрыі, справіцца з якімі было надзвычай складана [88, с. 4; 89, с. 3; 95, с. 3].

Такім чынам, за 1911-1914 гг. у сферы аховы здароўя земскімі ўстановамі дасягнуты значныя поспехі. Паўсюднае ўладкаванне новых бальніц, лячэбніц, фельчарскіх пунктаў, паслугамі якіх бескаштоўна маглі карыстацца ўсе жыхары губерні, давала свой плён у падвышэнні агульнага стану здароўя насельніцтва і развіцці медыцыны ў цэлым. Губернскае земства, сутыкнуўшыся з неабходнасцю рэфармавання саматычнага і псіхіятрычнага напрамку, цалкам справіліся з пастаўленай задачай. Стабільна ішлі фінансавыя кампенсацыі ўстановам суседніх губерняў за лячэнне жыхароў Мінскай губерні і падрыхтоўку для яе патрэбных урачэбных кадраў. Разам з тым на плечы земстваў ускладвалася арганізацыя барацьбы з эпідэміямі тыфу, дызентэрыі і інш., правядзенне якой, нягледзячы на шэраг недахопаў, можна лічыць здавальняючай.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Правядзенне земскай рэформы на тэрыторыі Беларусі адбылося значна пазней, чым у цэнтральных губернях Расійскай імперыі. Асноўнай перашкодай, якая стаяла на шляху ўвядзення земстваў у заходніх губернях у 1860-х – 1900-х гг., была асцярога расійскага ўрада даваць тутэйшаму насельніцтву мясцовае самакіраванне з пэўнымі паўнамоцтвамі, так як гаворка ішла пра іншародныя землі, ахопленыя ў свой час паўстаннямі 1830-1831 гг. і 1863-1864 гг. Разам з тым паступова стаў відавочным правал палітыкі паўсюднага насаджвання «рускага» землеўладання на беларускіх землях. У выніку працэнт памешчыкаў-каталікоў быў значна большы, што забяспечыла б апошнім поўную перавагу ў распарадчых і выканаўчых органах земстваў у выпадку ўвядзення дадзеных устаноў. Пры гэтым немалаважным фактарам стала нядобразычлівае стаўленне кіруючых колаў да земскіх устаноў у цэлым, якое бярэ свой пачатак як з'ява яшчэ з 60-х гг. XIX ст. У той час стаяла пытанне пра максімальную бюракратызацыю ўстаноў і поўнае падпарадкаванне іх адміністрацыі, што і вылілася ў земскую контррэформу 1890 г. У такіх умовах тэрытарыяльнае пашырэнне земскага самакіравання рабілася немагчымым.

Тым не менш, нягледзячы на дадзеныя абставіны, далейшае актыўнае сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны патрабавала ўпарадкавання сістэмы мясцовага кіравання ва ўскраінных губернях. Эксперыментальна ў межах Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў у 1903 г. былі ўведзены мадыфікаваныя земскія ўстановы, пазбаўленыя выбарнасці. Паўнацэнная ж рэалізацыя земскай рэформы ў трох беларускіх губернях у 1911 г. стала магчымай дзякуючы ўсеагульнай актывізацыі грамадска-палітычнага жыцця ў Расійскай імперыі на працягу першага дзесяцігоддзя XX ст. З аднаго боку, назіраўся яшчэ больш актыўны рух за заходняе земства сярод найбольш прагрэсіўных мясцовых прадстаўнікоў, ды і сярод буйных земскіх дзеячаў па краіне ў цэлым. Болей таго, цяпер на ўвядзенні земстваў у заходніх губернях настойвалі радыкальныя правыя палітычныя сілы краіны. Яны зыходзілі з мэтаў барацьбы з рэвалюцыйным рухам і наступу на іншародчыя элементы на беларускіх і ўкраінскіх землях. Менавіта манархісты вылучылі ідэю аб падзеле выбаршчыкаў земскіх галосных на нацыянальныя курыі. У той жа час асаблівыя задачы ставіў і буйнейшы палітычны дзеяч таго часу П.А. Сталыпін, які хацеў увесці земствы ў заходніх губернях на фоне ажыццяўлення сваёй аграрнай рэформы. Менавіта дзякуючы намаганням тагачаснага старшыні Савета міністраў і быў прыняты ўрэшце закон ад 14 сакавіка 1911 г., які коштам свайго ўласнага аўтарытэта палітыку ўсё ж такі ўдалося зацвердзіць.

Такім чынам, традыцыйнае меркаванне даследчыкаў аб тым, што земская рэформа на тэрыторыі Беларусі была праведзена ў 1911 г., мае патрэбу ў

карэктыроўцы. Найбольш дарэчна казаць аб паэтапнасці ў яе рэалізацыі. Пачатак рэформы быў закладзены ўвядзеннем упраўленняў па справах земскай гаспадаркі ў трох беларускіх губернях у 1903 г., а завяршэнне адбылося ў 1911 г. іх рэарганізацыяй у выбарныя земскія ўстановы.

Для паўнацэннага разумення сутнасці земскіх устаноў 1903 г. неабходна адказаць на пытанне, ці можна іх лічыць органамі мясцовага самакіравання. Даследчыкі схільныя адназначна адносіць упраўленні па сваёй прыродзе да звычайных дзяржаўных устаноў і адмяжоўваюць іх ад земстваў. Адна з прычын такога меркавання – празмерны адміністрацыйны кантроль над упраўленнямі зверху. Аднак тое ж самае было характэрна і для іншых земскіх устаноў, па выніках контррэформы 1890 г. З іншага боку, па факце мы бачым сапраўдныя прадстаўнічыя органы, у якія прызначаліся прадстаўнікі розных саслоўяў (дваран, ганаровых грамадзян, чыноўнікаў, мяшчан і сялян), што стала пражывалі на адпаведнай тэрыторыі. Адсюль вынікае, што толькі адсутнасць выбарнасці галосных можна лічыць адназначным аргументам супраць. У адпаведнасці з так званай дзяржаўнай тэорыяй мясцовага самакіравання, галоўным атрыбутам адрознення ад цэнтральнага дзяржаўнага кіравання з’яўляецца тое, што мясцовае самакіраванне здзяйсняецца не ўрадавымі чыноўнікамі, а жыхарамі, зацікаўленымі ў выніках мясцовага кіравання. Пры гэтым неабходнай умовай самакіравання з’яўляецца эканамічная незалежнасць ад урада, якая дазваляе самастойна дзейнічаць пры вырашэнні пытанняў мясцовага значэння.

У выпадку з упраўленнямі бачна, што ў самім земскім Палажэнні 1903 г. замацаваны пункт аб прызначэнні галоснымі ў камітэты па справах земскай гаспадаркі і членамі ва ўправы выключна людзей, добра знаёмых з мясцовымі патрэбамі. Апошняе нават прывяло да таго, што, на фоне нязначнай колькасці дваран праваслаўнага веравызнання, склалася сітуацыя, калі большасць земскіх галосных у беларускіх земскіх установах узора 1903 г. складалі дваране-каталікі (разам з некаторай колькасцю лютэран і стараувераў). Адпаведна гэтаму, галоўнай мэты стварэння ўстаноў менавіта ў такім мадыфікаваным выглядзе, у адпаведнасці з якой расійскі ўрад імкнуўся не дапусціць да ўдзела ў мясцовым самакіраванні іншародчых элементаў, на беларускіх землях дасягнуць не атрымалася.

Такім чынам, пытанне аб сутнасці ўстаноў застаецца дыскусійным. Пераносячы паняцці сучаснасці на мінулае, даследчыкі непазбежна сутыкаюцца з праблемай суаднясення тэрмінаў «мясцовае кіраванне» і «мясцовае самакіраванне», цалкам размежаваць якія ў дачыненні да рэалій той гістарычнай эпохі не прадстаўляецца магчымым.

Адначасова на прыкладзе Мінскай губерні, бачна, што дзейнасць Упраўлення па справах земскай гаспадаркі ў межах Мінскай губерні мела

цалкам станоўчыя вынікі. Галоснымі і ў цэлым ўсімі супрацоўнікамі з 1903 па 1911 гг. была праведзена велізарная работа, якая адыграла адметную ролю ў паляпшэнні сацыяльна-эканамічнага і культурнага становішча рэгіёна. У той жа час у працэсе свайго функцыянавання ўпраўленню прыйшлося сутыкнуцца з шэрагам праблем, з-за якіх мноства ініцыятыў так і не атрымалася рэалізаваць. Асабліва адчуваліся недастатковая колькасць фінансавых сродкаў, а таксама празмерны кантроль і абмежаванні з боку вышэйстаячых органаў. Дадавалі складанасці і прынцыпова розныя падыходы галосных праваслаўнага і каталіцкага веравызнання да вырашэння тых ці іншых пытанняў. Тым не менш, існаванне земскіх устаноў такога тыпу стала важнай прыступкай для развіцця мясцовага самакіравання на беларускіх землях і паслужыла асновай для паўнацэннай рэалізацыі земскай рэформы ў Беларусі ў 1911 г.

Земскія ўстановы, што затым прыйшлі на замену ўпраўленню, працягнулі дзеянні сваіх папярэднікаў. Цяпер у руках мясцовага самакіравання аказаліся значна большыя фінансавыя сродкі, а значыць і пашырыліся магчымасці для развіцці губерні. Самымі затратнымі для земства ў першае трохгоддзе іх існавання сталі гаспадарчая сфера, а таксама ахова здароўя і адукацыя.

У гаспадарчай дзейнасці земства на губернскім узроўні ажыццяўлялася правядзенне сельска-гаспадарчых выставак, паступова пашыраўся штат агранамічнага персаналу, праводзіліся абследаванні найбольш каштоўных парод жывёлы, а таксама шырока ўжываліся супрацьпажарныя меры. Паспяховай стала дзейнасць у напрамку распаўсюджвання сельска-гаспадарчых ведаў сярод насельніцтва: арганізоўваліся адукацыйныя курсы для сялян, выдавалася адпаведная літаратура і створаны свой уласны перыядычны орган. Для больш эфектыўнага правядзення агранамічных пераўтварэнняў пад эгідай земства былі праведзены глебава-геалагічнае і кліматычнае абследаванне губерні. Паралельна наладжвалася доследная справа, перш за ўсё, для правядзення ў жыццё меліярацыйных мерапрыемстваў, што набывалі ў той час асаблівы размах. На павятовым жа ўзроўні ва ўсю разгортвалася ўладкаванне сельска-гаспадарчых складоў, зернеачышчальных пунктаў і пракатных станцый, якія сталі надзейнай падтрымкай для мясцовага насельніцтва, што магло карыстацца іх паслугамі бясплатна альбо за нязначныя грашовыя сумы. Асабліва актуальнымі гэтыя мерапрыемствы сталі на фоне рэалізацыі на беларускіх землях палажэнняў Сталыпінскай аграрнай рэформы, садзейнічаючы найбольшай эфектыўнасці ў яе правядзенні.

Дзеянні земскіх устаноў губерні па пашырэнні народнай асветы сталі вядучым напрамкам іх дзейнасці, складаючы значны працэнт земскага бюджэту. Асноўныя сілы былі кінуты на паступовую арганізацыю ўсеагульнага пачатковага навучання, абавязкі па рэалізацыі якога леглі на павятовыя органы. Да галоўнай заслугі губернскага земства можна аднесці пашырэнне сеткі

тэхнічных устаноў, актуальнасць якіх ва ўмовах кардынальных агранамічных пераўтварэнняў значна павялічылася. Сапраўдным прарывам у тых умовах была падрыхтоўка глебы да адкрыцця ў губернскім цэнтры ў 1914 г. вышэйшай адукацыйнай установы – настаўніцкага інстытута. Традыцыйнай мерай заставалася актыўная падтрымка навуковых і дабрачынных асветных арганізацый. Пры гэтым вялікую ролю земскія ўстановы адыгралі і ў змяншэнні ўплыву царкоўна-прыхадскога навучання і зацвярджэнні іміджу свецкай адукацыі, як найбольш якаснай.

За 1911-1914 гг. земскімі ўстановамі дасягнуты значныя поспехі у сферы аховы здароўя. Паўсюднае ўладкаванне новых бальніц, лячэбніц, фельчарскіх пунктаў, паслугамі якіх бескаштоўна маглі карыстацца ўсе жыхары губерні, давала свой плён у падвышэнні агульнага стану здароўя насельніцтва і развіцці медыцыны ў цэлым. Стабільна ішлі фінансавыя кампенсацыі ўстановам суседніх губерняў за лячэнне жыхароў Мінскай губерні і падрыхтоўку для яе патрэбных урачэбных кадраў. Пры чым, акрамя ўвядзення пенсійнага забеспячэння работнікаў, пастановамі земскіх органаў гарантавалася грашовая падтрымка сем’ям медыцынскага персаналу ў выпадку іх смерці падчас выканання сваіх прафесійных абавязкаў. Разам з тым на плечы земстваў ускладвалася арганізацыя барацьбы з эпідэміямі тыфу, дызентэрыі і інш., правядзенне якой, нягледзячы на шэраг недахопаў, можна лічыць здавальняючай. У гэты ж час земствы рэгулярна пачалі накіроўваць свой персанал на падвышэнне кваліфікацыі і медыцынскія з’езды.

Дыскусійным застаецца таксама пытанне аб уплыве нацыянальнага прынцыпу фарміравання на функцыянаванне выбарных земскіх органаў. Зыходзячы з шэрагу крыніц, можна зрабіць вывад, што ўздзеянне дадзенага фактару на дзейнасць земстваў Мінскай губерні цяжка назваць адмоўным. У сваіх успамінах гэта адзначалі як прадстаўнікі правячых колаў, так і апазіцыйна настроеныя дваране-каталікі. Тым не менш, відавочным было імкненне правячых колаў да абмежавання доступу да самакіравання асоб каталіцкага веравызнання, колькасць якіх у земствах пры справядлівай сістэме выбараў была б значна большай. У той жа час патрэбна прызнаць, што наяўная канкурэнцыя паміж прадстаўнікамі двух супрацьлеглых лагераў галосных спрыяла пошуку больш эфектыўных шляхоў для вырашэння мясцовых пытанняў і дазваляла пачуць шырокае кола меркаванняў і прапаноў.

Адметнай рысай новаўтвораных беларускіх земстваў было і тое, што іх галосныя і служачыя ўспрымалі сябе выключна як мясцовы гаспадарча-эканамічны орган, прысвячаючы сваю дзейнасць толькі вырашэнню лакальных праблем. Іншыя ж расійскія земствы, якія, у большасці, бачылі сябе грамадска-палітычнымі ўстановамі, значную колькасць часу на пасяджэннях праводзілі ў дыскусіях, ігнаруючы часам найбольш актуальныя праблемы.

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ І ЛІТАРАТУРЫ


1. Аврех, А.Я. Вопрос о западном земстве и банкротство Столыпина / А.Я. Аврех // Исторические записки. Т. 70. – М., 1961. – С. 61–112.
2. Аврех, А.Я. П.А.Столыпин и судьбы реформ в России / А.Я. Аврех. – М.: Политиздат, 1991. – 286 с.
3. Аврех, А.Я. Царизм и третьеиюньская система / А.Я. Аврех. – М.: Наука, 1966. – 179 с.
4. Веселовский, Б.Б. История земства за сорок лет: в 4 т. / Б.Б. Веселовский – СПб.: Изд-во О.Н. Поповой, 1909–1911. – Т. 3. – 1911. – 708 с.
5. Вестник Минского губернского земства. – 1914. – № 3–4.
6. Витебская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802-1917) / Сост. Т.Е. Леонтьева. – Мн.: БелНИИДАД, 2009. – 524 с.
7. Витте, С.Ю. Самодержавие и земство / С.Ю. Витте. – Штутгарт: Редакция «Освобождения», 1901. – 212 с.
8. Войнилович, Э. Воспоминания: Пер. с польск. / Общ. ред. В. Завальнюка. – Минск: Издание Минской римо-католической парафии св. Симона и Елены, 2007. – 380 с.
9. Высочайше утвержденное положение о губернских и уездных земских учреждениях, 12 июня 1890 г., № 6927 // Полное собрание законов Российской империи: Собрание 3-е: в 33 т. – Санкт-Петербург, 1893. – Т. 10. – Отд. 1. – С. 493–511.
10. Высочайше утвержденное положение об управлении земским хозяйством в губерниях Виленской, Витебской, Волынской, Гродненской, Киевской, Ковенской, Минской, Могилевской и Подольской, 2 апреля 1903 г., № 22757 // Полное собрание законов Российской империи: Собрание 3-е: в 33 т. – Санкт-Петербург, 1905. – Т. 23. – Отд. 1. – С. 334–353.
11. Горбатюк, Е.С. Основные теории местного самоуправления: аналитический обзор .) / Е.С. Горбатюк // Вестник Санкт-Петербургского университета. Серия 6. Политология. Международные отношения. – Санкт-Петербург: Издательство СПбГУ, 2015. – Вып. 1. – С. 21–27.
12. Гурко, В.И. Черты и силуэты прошлого. Правительство и общественность в царствование Николая II в изображении современника / В.И. Гурко. – М.: НЛО, 2000. – 781.
13. Доклады Минской губернской земской управы второму очередному губернскому земскому собранию. По разным вопросам, Ч. 1 и Ч. 2. – Минск: Губернская типография, 1913. – 91 с.
14. Доклады и отчеты Минской губернской земской управы четвертому очередному губернскому земскому собранию по агрономическому отделу: с

приложениями. – Минск: Электро-типография Я. А. Гринблата, 1914. – 200 с.
15. Документы и материалы по истории Белоруссии: в 4 т. / Акад. наук БССР, Ин-т истории; под ред. В.Н. Перцева [и др.]. – Мінск: Изд-во Акад. наук БССР, 1953. – Т. 3 : (1900–1917 гг.). – 1018 с.
16. Долбилов, М.Д. Западные окраины Российской империи / М.Д. Долбилов, А.И. Миллер. – М.: Новое литературное обозрение, 2006. – 608 с.
17. Журналы первого очередного Минского губернского земского собрания сессии 25 января – 7 февраля 1912 г. – Минск: Губернская типография, 1912. – 143 с.
18. Журналы третьего очередного Минского губернского земского собрания сессии 20 – 28 января 1914 г. – Минск: Губернская типография, 1914. – 143 с.
19. Журналы пятого чрезвычайного Минского губернского земского собрания сессии 28–30 мая 1914 г. (с докладами губернской управы). – Минск: Губернская типография, 1914. – 47 с.
20. Забаўскі, М.М. Буржуазныя рэформы ў Беларусі ў другой палове XIX - пачатку XX ст. / М.М. Забаўскі, А.Ф. Рацько. – Мінск: БДПУ, 2004. – 64 с.
21. Забаўскі, М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў грамадска-палітычным жыцці Беларусі (1906-1917 гг.) / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка. – Мінск: БДПУ, 1999 – 212 с.
22. Забаўскі, М.М. Расійская Дзяржаўная дума ў лёсах Беларусі (1906-1917 гг.): манаграфія / М.М. Забаўскі. – Мінск: БДПУ, 2008. – 266 с.
23. Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793-1917) / Сост. Т.Е. Леонтьева. – Мн.: БелНИИДАД, 2006. – 392 с.
24. Могилевская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1772-1917) / Сост. Е.К. Анищенко. – Мн.: БелНИИДАД, 2014. – 814 с.
25. Моторова, Н.С. Взаимодействие органов местного самоуправления и благотворительных обществ белорусско-литовских губерний (1875–1914 гг.) / Н.С. Моторова // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – Брэст: УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна», 2016. – № 1. – С. 40–45.
26. Моторова, Н.С. Интеграция губерний Северо-Западного края в общероссийскую систему земского самоуправления / Н.С. Моторова // Научные труды Северо-Западного института управления – филиала РАНХиГС. – Спб: РАНХиГС, 2014. – Т. 5. – Выпуск 5. – С. 90–95.
27. Моторова, Н.С. Проекты открытия высшего учебного заведения на территории белорусско-литовских губерний в ходатайствах органов

местного самоуправления начала XX в. / Н.С. Моторова // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – Брэст: УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна», 2016. – № 2. – С. 76–82.
28. Моторова, Н.С. Роль управлений по делам земского хозяйства в развитии системы здравоохранения на территории белорусских губерний (1903–1911 гг.) / Н.С. Моторова // Ученые записки УО «ВГУ имени П.М. Машерова»: сборник научных трудов. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2015. – Т. 19. – С. 21–26.
29. Моторова, Н.С. Управления по делам земского хозяйства на территории белорусских губерний: функции, структура, состав (1903–1911 гг.) / Н.С. Моторова // Известия Гомельского государственного университета им. Ф. Скорины. – Гомель: ГГУ имени Франциска Скорины, 2016. – № 4. – С. 55–60.
30. Моторова, Н.С. Участие органов местного самоуправления в реализации планов всеобщего начального обучения на территории белорусско-литовских губерний в начале XX в. / Н.С. Моторова. // Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова. Серыя А. Гуманітарныя навукі: гісторыя, філасофія, філалогія. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2015. – № 2.– С. 35–42.
31. На службе Отечеству: Записки русского губернатора (1914–1918 гг.) / Князь В. А. Друцкой-Соколинский. – Орел: РКФ «3 июля»: РИГ «Невероятный мир», 1994. – 405 с.
32. Нагдалян, А.М. Абмеркаванне пытання аб увядзенні земскіх устаноў на тэрыторыі Беларусі ў 1861-1903 гадах / А.М. Нагдалян // Гісторык = Rerum scriptor: зборнік навуковых артыкулаў студэнтаў і магістрантаў / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»; [рэдкалегія: В.А. Міхедзька (адказны рэдактар) і інш.]. – Гомель: ГДУ імя Францыска Скарыны, 2016. – Вып. 2. – С. 72–76.
33. Нагдалян, А.М. Дзейнасць органаў земскага самакіравання Мінскай губерні ў 1911-1914 гг. / А.М. Нагдалян // Сборник работ 73-й научной конференции студентов и аспирантов Белорусского государственного университета, 16–25 мая 2016, Минск. В 3 ч. Ч.1 / БГУ, Гл. управление науки; отв. за выпуск С. Г. Берлинская. – Минск: БГУ, 2016. – С. 483–487.
34. Нагдалян, А.М. Дзейнасць Упраўлення па справах земскай гаспадаркі Мінскай губерні ў 1903-1911 гг. / А.М. Нагдалян // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навуковы зборнік / рэдкал.: У.К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2016. – Вып. 11. – С. 74–83.
35. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 5908. Переписка по вопросу о введении в Минской губернии земства.

36. НГАБ. – Фонд 323. – Воп. 1. – Спр. 1. Журнал I годичного заседания Минского губернского комитета по делам земского хозяйства.
37. НГАБ. – Фонд 323. – Воп. 1. – Спр. 4. Журнал II годичного заседания Минского губернского комитета по делам земского хозяйства.
38. НГАБ. – Фонд 323. – Воп. 1. – Спр. 5. Журналы обыкновенных заседаний Минского губернского комитета по делам земского хозяйства.
39. НГАБ. – Фонд 323. – Воп. 1. – Спр. 15. Журналы VII обыкновенного собрания Минского губернского комитета по делам земского хозяйства 5 и 6 июня 1908 г.
40. НГАБ. – Фонд 323. – Воп. 1. – Спр. 18. Журналы VIII обыкновенного собрания Минского губ комитета по делам земского хозяйства.
41. НГАБ. – Фонд 323. – Воп. 1. – Спр. 19. Журналы заседания IX обыкновенного собрания Минского губернского ком по делам земского хозяйства.
42. НГАБ. – Фонд 323. – Воп. 1. – Спр. 20. Журналы заседания X обыкновенного собрания Минского губернского комитета по делам земского хозяйства.
43. НГАБ. – Фонд 323. – Воп. 1. – Спр. 22. Журналы XII обыкновенного собрания Минского губернского комитета по делам земского хозяйства.
44. НГАБ. – Фонд 323. – Воп. 1. – Спр. 23. Журналы заседания XI обыкновенного заседания Минского губернского комитета по делам земского хозяйства.
45. НГАБ. – Фонд 323. – Воп. 1. – Спр. 24. Журналы заседаний IX годичного собрания Минского губернского комитета по делам земского хозяйства.
46. НГАБ. – Фонд 324. – Воп. 1. – Спр. 1. Дело о назначении состава Минской губернской управы по делам земского хозяйства и земских гласных в связи с введением положения об управлении земским хозяйством в Минской губернии.
47. НГАБ – Фонд 324. – Воп. 1. – Спр. 362. Списки лиц, представляемых к утверждению в должностях земских гласных и кандидатов к ним и переписка с уездными управами по делам земского хозяйства.
48. НГАБ – Фонд 324. – Воп. 1. – Спр. 928. Журнал первого чрезвычайного минского губернского земского собрания заседаний 20-23 августа 1911 г. и доклад Минской губернской управы по делам земского хозяйства по предмету распределения земских капиталов и хозяйства между губернскими и уездными земствами.
49. НГАБ – Фонд 324. – Воп. 1. – Спр. 934. Переписка с уездными управами по делам земского хозяйства о подготовке к введению земского самоуправления в губернии и составлении избирательных списков.

50. НГАБ. – Фонд 325. – Воп. 1. – Спр. 1. Приказ Минской губернской земской управы о назначении штата управы.
51. НГАБ. – Фонд 325. – Воп. 1. – Спр. 5. Дело о выборах губернских земских гласных на трехлетие 1910-1913 гг.
52. НГАБ. – Фонд 325. – Воп. 1. – Спр. 23. Списки лиц избранных или зачисленных в уездные земские гласные по уездам Минской губернии.
53. НГАБ. – Фонд 325. – Воп. 1. – Спр. 595. Материалы III чрезвычайного Минского губернского земского собрания.
54. НГАБ. – Фонд 325. – Воп. 1. – Спр. 708. Материалы IV очередного Минского губернского земского собрания.
55. НГАБ. – Фонд 325. – Воп. 1. – Спр. 709. Материалы V чрезвычайного Минского губернского земского собрания.
56. НГАБ. – Фонд 325. – Воп. 1. – Спр. 730. Состав Минского губернского земского собрания, списки служащих уездных земств, избранных гласными на трехлетие и переписка с редакцией «Вестника Минского губернского земтства» о высылке печатных изданий.
57. НГАБ. – Фонд 1265. – Воп. 1. – Спр. 1. Журнал четвертого чрезвычайного Минского губернского земского собрания 1913 г.
58. Навагродскі, В.Я. Функцыі земскага друку Паўночна-Заходняга краю пачатку XX ст. і іх рэалізацыя / В. Я. Навагродскі // Веснік БДУ. Серыя 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2005. – №1 – С. 18–22.
59. Навагродскі, В.Я. Асветніцкая дзейнасць земстваў у кантэксце сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускай вёскі ў пачатку XX ст. / В. Я. Навагродскі // Гісторыя Беларусі перыяду капіталізму. – Мінск: БДПУ імя М. Танка, 2005-2011. – Ч. 2: Актуальныя праблемы аграрнай гісторыі / [складальнікі: А.П. Жытко і інш.]. – 2007. – 229 с.
60. Наша ніва. – 1907. – № 1.
61. Наша ніва. – 1907. – № 35.
62. Наша ніва. – 1908. – № 2.
63. Наша ніва. – 1908. – № 3.
64. Наша ніва. – 1908. – № 6.
65. Наша ніва. – 1908. – № 9.
66. Наша ніва. – 1908. – № 11.
67. Наша ніва. – 1908. – № 22.
68. Наша ніва. – 1909. – № 27.
69. Наша ніва. – 1909. – № 30.
70. Наша ніва. – 1909. – № 43.
71. Наша ніва. – 1909. – № 51–52.
72. Наша ніва. – 1910. – № 16–17.

73. Наша ніва. – 1910. – № 44–45.
74. Наша ніва. – 1910. – № 46.
75. Наша ніва. – 1911. – № 4.
76. Наша ніва. – 1911. – № 6.
77. Наша ніва. – 1911. – № 14.
78. Наша ніва. – 1911. – № 22.
79. Наша ніва. – 1911. – № 25–26.
80. Наша ніва. – 1911. – № 27.
81. Наша ніва. – 1911. – № 35.
82. Наша ніва. – 1911. – № 41.
83. Наша ніва. – 1911. – № 45.
84. Наша ніва. – 1912. – № 3.
85. Наша ніва. – 1912. – № 8.
86. Наша ніва. – 1912. – № 24.
87. Наша ніва. – 1912. – № 45.
88. Наша ніва. – 1912. – № 48.
89. Наша ніва. – 1913. – № 1.
90. Наша ніва. – 1913. – № 7.
91. Наша ніва. – 1913. – № 8.
92. Наша ніва. – 1913. – № 9.
93. Наша ніва. – 1913. – № 13.
94. Наша ніва. – 1913. – № 31.
95. Наша ніва. – 1913. – № 33.
96. Наша ніва. – 1914. – № 23.
97. Наша ніва. – 1914. – № 24.
98. Наша ніва. – 1914. – № 45.
99. Новогродский, В.Я. Деятельность земства по развитию начального образования в Беларуси в начале XX в. / В. Я. Новогродский // Воспитание младших школьников: история и современность — С. 130–143.
100. Новогродский, В.Я. Становление и развитие земской школы в Беларуси в начале XX в. / В. Я. Новогродский // Становление и развитие профессионального творчества педагога – С. 45–47.
101. О некоторых мерах по введению в действие Положения о губернских и уездных земских учреждениях, 1 января 1864 г., № 40459 // Полное собрание законов Российской империи: Собрание 2-е: в 55 т. – Санкт-Петербург, 1867. – Т. 29. – Отд. 1. – С. 21–22.
102. О распространении действия Положения о земских учреждениях на Витебскую, Волынскую, Киевскую, Минскую, Могилевскую и Подольскую губурнии, 14 марта 1911 г., № 34903 // Полное собрание законов Российской

империи: Собрание 3-е: в 33 т. – Санкт-Петербург, 1914. – Т. 31. – Отд. 1. – С. 170–175.
103. Отчет Минской губернской земской управы за 1911 год (II очередному Минскому губернскому земскому собранию). – Минск: Губернская типография, 1912 г. – 154 с.
104. Отчет Минской губернской земской управы за 1912 год. – Минск: Губернская типография, 1913 г. – 197 с.
105. Отчет Минской губернской земской управы за 1913 год. – Минск: Губернская типография, 1914 г. – 236 с.
106. Падарожняя, А.А. Стварэнне органаў кіравання мясцовай земскай гаспадаркай у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях на падставе «Палажэння» 1903 г. / А. А. Падарожняя // Весці БДПУ – 2012. – № 2. – С. 23–27.
107. Положение о губернских и уездных земских учреждениях, 1 января 1864 г., № 40457 // Полное собрание законов Российской империи: Собрание 2-е: в 55 т. – Санкт-Петербург, 1867. – Т. 29. – Отд. 1. – С. 1–14.
108. Сборник постановлений Минского губернского комитета по делам земского хозяйства за 1906 год. – Мн.: Паровая типолитография И. и В. Тасьман, 1907. – 19 с.
109. Сборник постановлений Минского губернского комитета по делам земского хозяйства за 1907 год. – Мн.: Паровая типолитография И. и В. Тасьман, 1908. – 170 с.
110. Слабажанін, В. П. Да гісторыі ўвядзення земства ў Беларусі (1864–1911) / В.П. Слабажанін // Весці Акадэміі навук БССР. Серыя грамадскіх навук. – 1983. – № 4. – С. 73–80.
111. Слобожанин, В.П. Земское самоуправление в Беларуси (1905–1917 гг.): научное издание / В. П. Слобожанин. – Минск: Право и экономика, 2003. – 167 с.
112. Смета расходов и доходов губернских земских повинностей на 1912 год. – Минск: Губернская типография, 1912 г. – 118 с.
113. Смета расходов и доходов губернских земских повинностей на 1915 год. – Минск: Губернская типография, 1915 г. – 152 с.
114. Снапкоўская, С.В. Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.): Вучэб. дапаможнік для студэнтаў вышэйш. навуч. устаноў. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2001. – 160 с.
115. Снапкоўская, С.В. Стварэнне земскай школы на Беларусі ў пачатку XX ст. // Гісторыя: Праблемы выкладання. – 1999. – № 4. – С. 35–47.
116. Сорокина, В.В. Политика русского самодержавия в отношении западных земств / В. В. Сорокина // Правоведение. – 1979. – № 1. – С. 65–70.

117. Столыпин, П.А. Нам нужна Великая Россия...: Полное собрание речей в Государственной думе и Государственном совете. 1906–1911 / Предисл. К. Ф. Шацилло; Сост., коммент. Ю. Г. Фельштинского. – М.: Молодая гвардия, 1991. – 416 с.
118. Талмачова, С.А. Матэрыялы камісіі пры віленскім генерал-губернатары 1905 г. як крыніца па праблеме ўвядзення земстваў у заходніх губернях / С.А. Талмачова // Сучасныя падыходы да вывучэння крыніц па гісторыі Беларусі: да 1000-годдзя летапіснай Літвы. – Мінск: БДПУ, 2009. – С. 142–149.
119. Талмачова, С.А. Перадумовы ўвядення ў 1903 г. «Палажэння аб земскай гаспадарцы» ў Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губерніях / С.А. Талмачова // Европа: актуальные проблемы этнокультуры: материалы междунар. науч.-теорет. конф. (г. Минск, 28 апреля 2010 г.) – Минск: БГПУ. – С. 310–312.
120. Талмачова, С.А. Праблема правядзення земскай рэформы ў беларуска-літоўскіх губернях (1859–1903 гг.) / С.А. Талмачова // Весці БДПУ. – Серыя 2. – 2013 – № 1. – С. 3–7.
121. Талмачова, С.А. Распаўсюджанне земскай рэформы ў заходніх губернях Расійскай імперыі (1903–1911 гг.) / С.А. Талмачова // Весці БДПУ. Серыя 2. – 2010. – № 4. – С. 20–24.
122. Шоломицкая, Т.Л. Возникновение земской печати в процессе развития местного самоуправления на территории Беларуси / Т.Л. Шоломицкая // Веснік БДУ. Серыя 4. – 2007. – № 2 – С. 112–116.
123. Шоломицкая, Т.Л. Политическая коммуникация в земской печати Беларуси / Т.Л. Шоломицкая // Слова ў кантэксце часу: да 85-годдзя прафесара А.І. Наркевіча: зб. навук. прац / пад агул. рэд. В.І. Іўчанкава. – У 2-х т. Т. 1. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2014. – С. 306–314.
124. Шоломицкая, Т.Л. Просветительская деятельность белорусской земской печати / Т.Л. Шоломицкая // Весці БДУ. Серыя 4. – 2009. – №2 – С. 102–104.
125. Юбилейный земский сборник / под ред. Б.Б. Веселовского и З.Г. Френкеля. – Санкт-Петербург: Изд. т-ва О.Н. Поповой, 1914. – 467 с.
126. Dąbrowski, P. Samorząd ziemski w programie politycznym endecji byłego Wielkiego Księstwa Litewskiego przed Pierwszą Wojną Światową / P. Dąbrowski // Darbai ir Dienos. – 2011. – № 56. – S. 117–124.
127. Kurier Litewski. – 1905. – № 2.
128. Kurier Litewski. – 1905. – № 3.
129. Kurier Litewski. – 1905. – № 6.
130. Kurier Litewski. – 1905. – № 7.
131. Kurier Litewski. – 1905. – № 9.
132. Kurier Litewski. – 1905. – № 12.
133. Kurier Litewski. – 1906. – № 199.

134. Tarasiuk, D. Między nadzieją a niepokojem. Działalność społeczno-kulturalna i polityczna Polaków na wschodniej Białorusi w latach 1905-1918 / D. Tarasiuk. – Lublin: Wydawnictwo Uniwersytetu Marii Curie-Skłodowskiej, 2007. – 211 s.

# СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ НАВУКОВЫХ РАБОТ


1. Нагдалян, А.М. Абмеркаванне пытання аб увядзенні земскіх устаноў на тэрыторыі Беларусі ў 1861-1903 гадах / А.М. Нагдалян // Гісторык = Rerum scriptor: зборнік навуковых артыкулаў студэнтаў і магістрантаў / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, УА «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»; [рэдкал.: В.А. Міхедзька (адк. рэд.) і інш.]. – Гомель: ГДУ імя Францыска Скарыны, 2016. – Вып. 2. – С. 72–76.
2. Нагдалян, А.М. Дзейнасць органаў земскага самакіравання Мінскай губерні ў 1911-1914 гг. / А.М. Нагдалян // Сборник работ 73-й научной конференции студентов и аспирантов Белорусского государственного университета, 16–25 мая 2016, Минск. В 3 ч. Ч.1 / БГУ, Гл. управление науки; отв. за выпуск С.Г. Берлинская. – Минск: БГУ, 2016. – С. 483–487.
3. Нагдалян, А.М. Дзейнасць Упраўлення па справах земскай гаспадаркі Мінскай губерні ў 1903-1911 гг. / А.М. Нагдалян // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навуковы зборнік / рэдкал.: У.К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДУ, 2016. – Вып. 11. – С. 74–83.